ЗАСТАВАЙЦЕСЯ СА «ЗВЯЗДОЙ»!

Ідзе падпіска на IV квартал 2008 года

Падпісныя цэны на газету «Звязда» (у рублях)

Індэкс	на 1 месяц	на 3 месяцы
63850 (індывідуальны)	9200	27600
63145 (індывідуальны льготны для пенсіянераў, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны)	8700	26100
63858 (ведамасны)	14700	44100
63239 (ведамасны льготны для ўстаноў міністэрстваў культуры, адукацыі і аховы здароўя)	13400	40200

Рэкамендаваны закупачныя цэны. З улікам, каб рознічныя былі прымальнымі для насельніцтва

У аблвыканкамы і Мінгарвыканкам накіравана сумеснае пісьмо міністэрстваў сельскай гаспадаркі і харчавання і эканомікі з рэкамендацыямі адносна ўзроўню гранічных закупачных цэнаў на бульбу і гародніну, што прызначаны для закладкі ў стабілізацыйныя фонды плодаагароднінай прадукцыі.

Як паведамілі «Звяздзе» ў Мінсельгасхарчы, рэкамендаваны наступны аптымальны ўзровень закупачных цэнаў для закладкі ўраджаю-2008: на бульбу харчовую — 520 рублёў за кілаграм (тут і далей усе цэны без уліку ПДВ і транспартных выдаткаў), белакачанную капусту — 550 рублёў, сталовыя буракі — 500, сталовую моркву — 630, цыбулю — 920, яблыкі восеньскія першага гатунку — 1500, зімовыя першага гатунку — 2000 рублёў за кілаграм.

Рэкамендацыі будуць дзейнічаць толькі ў перыяд закладкі сельскагаспадарчай прадукцыі ў стабілізацыйныя фонды — з 15 верасня па 17 лістапада (адпаведна, да 15 верасня аблвыканкамы і Мінскі гарвыканкам павінны прыняць канкрэтныя рашэнні) і толькі ў дачыненні да вызначаных аб'ёмаў закладкі. На бульбу і плодаагароднінную прадукцыю, не ўключаную ў вышэйназваныя аб'ёмы, сельскагаспадарчыя прадпрыемствы могуць фарміраваць свабодныя цэны — з улікам кан'юнктуры рынку, патлумачылі ў міністэрстве.

Аблвыканкамам і Мінгарвыканкаму рэкамендавана ўстанаўліваць гранічныя закупачныя цэны на бульбу і плодаагароднінную прадукцыю, зыходзячы з мясцовых умоў вытворчасці і рэалізацыі, ураджайнасці, якая чакаецца. Напрыклад, летась на Віцебшчыне на некаторыя віды сельскагаспадарчай прадукцыі закупачныя цэны былі некалькі большымі, чым у іншых абласцях. Таксама на месцах трэба ўлічваць падаражэнне кошту матэрыяльна-тэхнічных рэсурсаў, што выкарыстоўваюцца ў сельгасвытворчасці. У лісце пры гэтым нагадваецца, што рознічныя цэны на прадукцыю павінны быць прымальнымі для насельніцтва.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Прэзідэнт Беларусі выказаў спачуванні родным і блізкім М. Лаўрыновіча ў сувязі з яго смерцю

Гэта вялікая страта і для ўсёй Беларусі. Адзін з выдатных арганізатараў айчыннага машынабудавання, кіраўнік высокага прафесійнага ўзроўню, Міхаіл Фёдаравіч унёс вялікі ўклад у стварэнне перспектыўных мадэляў беларускіх аўтамабіляў, якія заваявалі прызнанне далёка за межамі нашай краіны», — гаворыцца, у прыватнасці, у спачуванні.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Беларусь — у першай дзясятцы краін-рэфарматараў

Беларусь увайшла ў лік сусветных лідараў рэформаў, якія накіраваны на спрашчэнне вядзення бізнэсу. Да такой высновы прыйшлі аўтары даклада «Doing Business 2009». Ён ужо ў шосты раз выдаецца Сусветным банкам і МФК.

У дакладзе адзначаецца, што ў перыяд з чэрвеня 2007 года па чэрвень 2008 года Беларусь правяла рэформы ў шасці галінах, якія даследуюцца экспертамі, заняла чацвёртае месца ў першай дзесятцы краін-рэфарматараў у нарматыўна-прававой сферы. У галіне спрашчэння правілаў вядзення бізнэсу краіна ўзнялася са 115-га на 85-е месца.

Беларусь стала адным з вядучых рэфарматараў у катэгорыі рэгістрацыі ўласнасці. У краіне дзейнічае Адзіны дзяржаўны рэгістр нерухомасці, правоў на яе і здзелак з ёй. Час на рэгістрацыю ўласнасці знізіўся з 231 дня да 21. Таксама міжнародныя эксперты станоўча адзначылі спрошчаны рэжым атрымання дазволу на будаўніцтва ў сярэднім на 140 дзён, беспраблемнасць атрымання крэдытаў. Прадстаўнік Сусветнага банка ў Беларусі Крэйг Бел адзначыў, што гэтыя выдатныя дасягненні нашай краіны — вынік імкнення Урада да правядзення рэформаў, яго велізарнай работы па паляпшэнні дзелавога і інвестыцыйнага клімату.

Леанід ЛАХМАНЕНКА.

Адэкватнае рэагаванне на глабальныя пагрозы будзе залежаць ад эфектыўнага ўзаемадзеяння спецслужбаў краін СНД

Такую думку выказаў журналістам дзяржаўны сакратар Савета Бяспекі Беларусі Юрый Жадобін. Паводле яго слоў, збор кіруючага складу антытэрарыстычных падраздзяленняў органаў бяспекі і спецслужбаў дзяржаў СНД, што праходзіць у Мінску, прызначаны абагульніць напрацаваны вопыт узаемадзеяння, дапрацаваць дакументы па ўзаемадзеянні ў выпадку ўзнікнення глабальных пагроз XXI стагоддзя, ад якіх залежыць жыццё і бяспека насельніцтва. Кіраўнік Антытэрарыстычнага цэнтра (АТЦ) дзяржаў — удзельніц СНД Андрэй Новікаў, які старшынстве на форуме, адзначыў, што гэта не першыя такія вучэнні спецпадраздзяленняў. 11 верасня пройдзе сумеснае аператыўна-стратэгічнае камандна-штабное вучэнне «Бастыён-Антытэрор-2008». У мерапрыемствах, якія праводзіць Камітэт дзяржаўнай бяспекі Беларусі пад эгідай Антытэрарыстычнага цэнтра СНД, прымаюць удзел дэлегацыі органаў бяспекі і спецыяльных службаў краін Садружнасці, прадстаўнікі статутных і рабочых органаў СНД і АДКБ, антытэрарыстычнай структуры Выканкама ШАС, ваенныя аташэ, акрэдытаваныя ў Беларусі, і іншыя замежныя наглядальнікі.

БЕЛТА.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Б Е Л А Р У С К А Я Г А З Е Т А

11 ВЕРАСНЯ 2008 г.
ЧАЦВЕР
№ 171
(26284)

Кошт 500 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

МІНСКУ — 941

Заканчваюцца рамонтна-рэстаўрацыйныя работы на даху Рэспубліканскага палаца прафсаюзаў.

Гісторыя аднаго горада

Дакументальны фільм з такой назвай тэлеканал «ЛАД» пакажа ў дзень нараджэння сталіцы, 13 верасня. Гэты праект падрыхтаваны студыяй дакументальнага кіно галоўнай дырэкцыі тэлевытворчасці Белтэлерадыёкампаніі.

Фільм раскажа пра гарадское жыццё канца XIX — пачатку XX стагоддзя. Запуск паветранага шара, першы ліфт, візіт Імператара, паказы тэатраў-вар'етэ — гэтыя падзеі звычайна не адлюстраваныя ў падручніках па гісторыі, затое маюць важнае значэнне для гараджан.

Удзел у здымках бралі вядомыя навукоўцы-гісторыкі Іван Сацукевіч, Захар Шыбека і Уладзімір Дзянісаў, а таксама прафесійныя акцёры, з дапамогай якіх былі рэканструяваны некаторыя сцэны гарадскога жыцця. Для найбольш поўнага адлюстравання духу эпохі фільм стылізаваны пад чорна-белае нямое кіно. Галоўны герой кінастужкі — самы вядомы мінскі журналіст канца XIX стагоддзя Дарафей Бохан, якога называлі «каралём рэпартажу». Праўда, сам Дарафей Бохан у выкананні акцёра Віталя Краўчанкі з'яўляецца ў кадры ўсяго аднойчы, але менавіта паводле яго рэпартажу адноўлены тыя ці іншыя падзеі, што адбываліся ў Мінску.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ГРУЗІНСКІЯ ВАЕННЫЯ БАЯЛІСЯ ПАЧЫНАЦЬ ВАЙНУ

Грузінскі генштаб адчытаўся за вайну ў брусэльскай штаб-кватэры НАТА. Аб гэтым паведамляе нямецкая Frankfurter Allgemeine Zeitung.

Па дадзеных газеты, прадстаўнікі грузінскага ваеннага камандавання «далажылі саюзнікам, што яны былі супраць узброенага ўварвання ў Паўднёвую Асецію». Яны запэўнівалі, што, будзь іх воля, яны адгаварылі б прэзідэнта Саакашвілі ад уварвання. Яны лічылі, што з паўднёваасецінскім войскам і міліцыяй грузінскія ўзброеныя сілы справіцца маглі б, але супраць Расіі былі загадзя бяссільныя. Дыпламаты НАТА падазраюць, што «выказванні генштаба, магчыма, з'яўляюцца спробай генералаў адмыцца і прыпісаць усю віну за прайграную вайну Саакашвілі».

Нагадаем, у панядзелак у Тбілісі прыбылі эксперты НАТА, каб ацаніць маштабы ўрону ад баявых дзеянняў падчас расійска-грузінскага канфлікту. 15—16 верасня Тбілісі наведае дэлегацыя НАТА, якую ўзначаліць генсек альянса Яап дэ Хоап Схефер. Афіцыйная мэта двухдзённага візіту — яшчэ раз выказаць «аднадушную салідарнасць» з рэжымам Саакашвілі, а неафіцыйная — удакладніць патрэбы для пераўзбраення яго войска.

ЗА ЛЕТА КОЛЬКАСЦЬ РАСІЯН, ЯКІЯ НЕГАТЫЎНА АДНОСЯЦЦА ДА ЗША, ВЫРАСЛА ЎДВАЯ

Сярод расіян сёння пераважае негатыўнае стаўленне да Злучаных Штатаў Амерыкі, пры гэтым грамадзяне Расіі з цікавасцю сочаць за ходам выбарчай кампаніі ў гэтай краіне. Аб гэтым сведчаць даследаванні сацыёлагаў.

Зараз дзве трэці расіян заяўляюць аб сваім дрэнным стаўленні да ЗША (65 апытаных), хоць яшчэ ў чэрвені такіх было 29 працэнтаў, адзначае агенцтва «Інтэрфакс». Такія вынікі паказала ўсерасійскае апытанне, праведзенае ў пачатку верасня.

За той жа перыяд значна скарацілася сярод расіян колькасць тых, хто добра ставіўся да Амерыкі — з 49 працэнтаў у чэрвені да 22 — у верасні. Пры гэтым маладое пакаленне, паводле даных сацыёлагаў, выказвае крыху больш станоўчага меркавання аб Амерыцы, чым старэйшае: добра да ЗША ставяцца 29 працэнтаў у групе 18—24 гадоў супраць 20 працэнтаў апытаных ва ўзросце 45—59 гадоў. Паводле даследаванняў УЦДГМ, тры чвэрці расіян цяпер даюць адмоўныя ацэнкі адносінам Масквы і Вашынгтона.

МІСТЭРА ДЖЭКСАНА ПРЫМУСІЛІ ТАНЦАВАЦЬ...

Супрацоўнікі службы бяспекі ізраільскага аэрапорта Бэн-Гурыён затрымалі «падазронага» пасажыра з мусульманскім імем. 31-гадовы Абдур-Рахім Джэксан — танцор трупы знакамітага амерыканскага Тэатра балета Элвіна Эйлі, але ад яго запатрабавалі даказаць гэта на справе, прадстаўнікоў службаў бяспекі збянтэжыла мусульманскае імя танцора. Ён спрабаваў растлумачыць, што імя было дадзена яму бацькамі, якія прынялі ісламе. Аднак ён не выхоўваўся на мусульманскіх законах і сам Джэксан не лічыць сябе рэлігійным чалавекам.

Аднак гэтых довадаў супрацоўнікам аэрапорта здалося недастатковa. Яны ўсё яшчэ не гатовыя былі пускаць яго ў краіну, запатрабаваўшы ў якасці «пасведчанні асобы» выканаць што-небудзь з танцавальнага рэпертуару. Танцор не збянтэжыўся і прадэманстраваў некалькі «па». Пасля чаго яго ўсё-такі адпусцілі. Пазней амерыканец паведаміў, што не плануе даваць інцыдэнту нейкі працяг. Ён расказаў, што ўжо не ў першы раз церпіць нязручнасці з-за свайго імя: яму нават раілі яго змяніць. Паводле яго слоў, пасля непаразумення ў аэрапорце ён атрымаў шматлікія прабачэнні і лічыць, што гэтага досыць.

КАЛАЙДЭР ЗАПУСЦІЛІ: КАНЦА СВЕТУ НЕ АДБЫЛОСЯ

Другі пучок пратонаў прайшоў па тунэлю Вялікага адроннага калайдэра (ВАК) у напрамку супраць гадзіннікавай стрэлкі, паведамляе Associated Press.



А раней, раніцай 10 верасня, элементарныя часціцы прайшлі поўны шлях па кольцы паскаральніка па гадзіннікавай стрэлцы. Энергія інжэкцыі (запуску часціц у кольца паскаральніка) у абодвух выпадках склала каля 450 гігаэлектронвольт. Хуткасць пратонаў у калайдэры набліжалася да хуткасці святла, аднак, з-за таго, што вучоныя тэставалі ўстойлівасць траекторыі пучка элементарных часціц у кожным з васьмі сегментаў кольца, увесь «шлях» па кольцы даўжынёй 27 кіламетраў заняў каля гадзіны.

Вялікі адронны калайдэр — самы буйны на планеце паскаральнік элементарных часціц — знаходзіцца на мяжы Швейцарыі і Францыі. Канструкцыя ВАК заняла 14 гадоў. У калайдэры вучоныя будуць «прымушаць» элементарныя часціцы сутыкацца адну з другой. Падобныя сутыкненні спараджаюць новыя часціцы, некаторыя з якіх дагэтуль былі прадказаныя толькі тэарэтычна. Адной з такіх часціц з'яўляецца базон Хігса, які «адказны» за з'яўленне масы. Калі навукоўцам не атрымаецца выявіць базон Хігса, то ім давядзецца перагледзець разуменне фізічных асноў устройства свету.

НЕАДКЛАДНАЯ РЭГІСТРАЦЫЯ

Выбары-2008

Паводле рашэння суда, яшчэ некаторыя прэтэндэнты на дэпутацкае крэсла атрымалі магчымасць уключыцца ў перадвыбарную гонку

Сушукальнікі, нязгодныя з рашэннем ЦВК аб адмове ў рэгістрацыі кандыдатаў ў дэпутаты, аспрэчваюць яго ў Вярхоўным Судзе. Туды паступіла 19 скаргаў, праўда, адну з іх забраў сам заяўнік. Як паведамілі ў Вярхоўным Судзе, колькасць скаргаў на адмову ў рэгістрацыі кандыдатамі ў дэпутаты зменшылася ў разы, параўноўваючы з мінулымі выбарамі. Днямі былі разгледжаны 15 такіх скаргаў, 2 з іх — задаволены, па трох рашэнні будуць прымацца сёння. Дарэчы, у адпаведнасці з заканадаўствам гэта апошні тэрмін разгляду скаргаў.

Вярхоўны Суд задаволіў скаргі Аляксея Туровіча і Уладзіміра Маркава. Выбаркамы адмовілі ім у рэгістрацыі па прычыне недакладнасці звестак, прадстаўленых у дэкларацыі аб даходах і маёмасці. Абодва прэтэндэнты не знялі з уліку аўтамабілі, якія ў свой час прадалі па даверанасці. Напрыклад, Уладзімір Маркаў ледзь не пазбавіўся шанцу стаць кандыдатам у дэпутаты з-за таго, што не ўказаў у сваёй дэкларацыі «запарожац» 1982 года выпуску. Незадэкларваная прэтэндэнтамі маёмасць нават мінімальна лічылася за імі, хоць фактычна ім і не належала. У адпаведнасці з рашэннем суда абодва прэтэндэнты яшчэ ўчора былі зарэгістраваны кандыдатамі ў дэпутаты. Так што Цэнтрвыбаркам тут спрацаваў вельмі аператыўна.

— З перадвыбарнай гонкі такія кандыдаты не выпадуць, — запэўніў сакратар ЦВК Мікалай Лазавік. — Рашэнне Вярхоўнага Суда з'яўляецца канчатковым і абскарджанню не падлягае. Таму як толькі атрымліваем адпаведныя дакументы, мы неадкладна рэгіструем грамадзян, чые скаргі былі задаволеныя, кандыдатамі ў дэпутаты. Спадар Маркаў па 91-й выбарчай акрузе і спадар Туровіч па 102-й акрузе ўжо зарэгістраваныя. Яны могуць звярнацца ў акруговыя выбарчыя камісіі, ім будуць выдзелены эфірны час, сродкі на выраб друкаванай прадукцыі, яны могуць апублікаваць свае перадвыбарныя праграмы ў газетах...

Чакаецца, што ў самы блізкі час вызначыцца канчатковая колькасць прэтэндэнтаў на дэпутацкае крэсла. Аднак пакуль адны аспрэчваюць сваё права на дэпутацкі мандат, некаторыя палітыкі, як сказаў Мікалай Лазавік, «заяўляюць пра тое, што здымуць свае кандыдатуры, і гэта іх права». Таму інтрыга пакуль захоўваецца...

Ала МАЧАЛАВА.

КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»

ПРОВОДИТ ПОВТОРНЫЙ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже земельного участка общей площадью 0,2103 га в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома в д. Новый Двор Минского района. Начальная цена — 15 877 650 белорусских рублей. В непосредственной близости имеются сети электроснабжения, газопровод. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 23.07.2008 г. **Аукцион состоится 23.09.2008 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, д. 5, ком. 321.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 22.09.2008 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, д. 5, ком. 326.

Контактный телефон (8 017) 224 61 34. Сайт в интернете: www.rlt.by.

УНП 690324015

КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»

ПРОВОДИТ ПОВТОРНЫЙ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

на право заключения договора аренды земельного участка общей площадью 10,0000 га сроком на 50 лет для строительства производственного объекта различного назначения, расположенного в районе д. Раков Воложинского района. Начальная цена предмета аукциона — 747 034 840 бел. рублей. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 21.03.2008 г. **Аукцион состоится 23.09.2008 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, д. 5, ком. 321.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 22.09.2008 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, д. 5, ком. 326.

Контактный телефон (8 017) 224 61 34. Сайт в интернете: www.rlt.by.

УНП 690324015

КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»

ПРОВОДИТ ПОВТОРНЫЙ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

на право заключения договора аренды земельного участка площадью 0,2500 га сроком на 50 лет для размещения придорожного кафе, расположенного по адресу: г. Мядель, ул. Юбилейная, 150 метров южнее улицы Луговой. Начальная цена предмета аукциона — 8 728 005 белорусских рублей. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 24.05.2008 г. **Аукцион состоится 23.09.2008 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, д. 5, ком. 321.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 22.09.2008 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, д. 5, ком. 326.

Контактный телефон (8 017) 224 61 34. Сайт в интернете: www.rlt.by.

УНП 690324015

КУП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»

ПОВТОРНО ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже здания многофункционального, принадлежащего УП «Завод точного машиностроения «Планар-ТМ» (металлический склад общей площадью 193,9 кв.м, инв. № 500/С-47118), расположенного по адресу: г. Минск, Партизанский проспект, 2.

Начальная цена — 386 783 000 белорусских рублей.

Отвод земельного участка будет осуществляться в установленном порядке Минской городской землеустроительной и геодезической службой.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, условиями проведения аукциона; нотариально заверенные копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации; соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного документа, подтверждающего внесение задатка; а также иные документы в соответствии с условиями проведения аукциона.

Задаток в размере 38 000 000 белорусских рублей перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, бульвар им. В. Мулявина, 6, код 153001331; УНП 190398583.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый объект. Порядок проведения торгов указан в условиях проведения аукциона.

Оплата объекта осуществляется в течение 2-х месяцев и 25 календарных дней с даты проведения аукциона. **Аукцион состоится 26 сентября 2008 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.** Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются по 24 сентября 2008 года до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. № 6.

Телефоны для справок: (017) 227 48 36, 227 40 22.

Аўтарская рубрыка Леаніда Заікі: незалежная экспертыза

УЗЯЦЬ ДЫ АДМЯНІЦЬ ПАДАТАК НА ДАБАЎЛЕНУЮ ВАРТАСЦЬ

Працягваем серыю інтэрв'ю з вядомым незалежным беларускім эканамістам, палітолагам, кіраўніком аналітычнага цэнтра «Стратэгія» Леанідам ЗАІКАМ. Тэма сённяшняй гутаркі: рост спажывецкіх цэнаў і шляхі мінімізацыі страт насельніцтва.

— Леанід Фёдаравіч, звычайна першымі сігналізуюць грамадству аб росце цэнаў на тавары шырокага спажывання, у першую чаргу на прадукты харчавання, хатнія гаспадыні. Ад іх цяпер часта можна пачуць: наведала магазін, пакінула 50 тысяч рублёў і амаль нічога істотнага не прынесла. А 50 тысяч для чалавека з сярэдняй заработнай платай — гэта грошы, якія яшчэ трэба зарабіць. І рост цэнаў адбываецца на фоне стабільнага курса долара ЗША да беларускай валюты. Чаму, калі долар стаіць, цэны паўзуць угору?

— Толькі з пачатку гэтага года спажывецкія цэны ў сярэднім выраслі на 8 працэнтаў, а долар сапраўды стаіць на месцы. І тыя, хто суадносіў рознічныя цэны з курсам амерыканскага долара з жахам адкрылі для сабе, што яшчэ нядаўна яны маглі на 25 умоўных адзінак набыць тавараў на трэць, а пяць гадоў таму аж удвая больш. Адкуль такі эфект? Справа ў тым, што долар не першы год паступова слабеў і набытая насельніцтвам у пачатку 90-х гадоў звычка вымяраць цэны ў амерыканскай валюце ўжо не зусім адпавядае тагачасным стэрэатыпам.

Звычка, між іншым, нармальная. Ва ўсім свеце прынята вымяраць, у тым ліку і ў ААН, аўтарытэтных міжнародных статыстычных службах, парытэт пакупніцкай здольнасці насельніцтва ў розных краінах якраз у даларах ЗША. Так што мысленне нашых людзей працуе ў рэчышчы сучасных фінансавых патрабаванняў. Але рэалій сённяшняга дня Беларусі такія: зарплата расце вельмі хутка, адначасова хутка растуць пакупкі насельніцтва. З пачатку года яны выраслі амаль на 20 працэнтаў. Людзі няспынна набываюць, набываюць і набываюць... На першым месцы кватэры, іншая нерухомасць, на другім — аўтамабілі. Дарэчы, ужо сёлета набыта новых легкавушак на 45 працэнтаў больш, чым летась. А вось патрыманых іншамарак набыта на 15 працэнтаў менш.



Нас цяпер накрыла чацвёртая спажывецкая хваля

— Жыць сталі лепш, жыць сталі весялей?

— Я сказаў бы так: нас цяпер накрыла так званая чацвёртая спажывецкая хваля. Згодна з гэтай класіфікацыяй, Беларусь, як і многія еўрапейскія краіны, прайшла першую хвалю (насычэнне попыту прадуктамі харчавання), другую (адзенне, абутак), трэцюю (тавары доўгага карыстання: тэлевізары, пральныя машыны і г. д.). Цяпер вось чацвёртая спажывецкая хваля.

— Часам складваецца ўражанне, што сёння людзі нібы імкнуцца хутчэй пазбавіцца ад грошай, пакуль іх не абскубла інфляцыя. Бо цэны растуць выключна на ўсё. Таму многія лічаць за лепшае ўлезці ў даўгі, узяць крэдыт, але ўжо цяпер абавязкова мець жаданую рэч. У выніку беларусы зусім мала ў параўнанні з жыхарамі іншых краін адкладваюць грошы. Так?

— Так. У беларусаў толькі 4 працэнты ад усіх даходаў ідзе на зберажэнне. Гэта вельмі нізкі паказчык.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

ПАШКАДАВАЎ МАЦІ

З дома па вул. Тэлефоннай, што ў Пінску, быў дастаўлены ў бальніцу з нажавым раненнем грудзей 23-гадовы хлопец. Паранены заявіў, што выпадкова наткнуўся на нож, які трымала маці.

Але следства ўстанавіла, што падчас скандалу маці ўдарыла сына нажом.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 11.09.2008 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	2 113,00
1 еўра	2 992,75
1 латвійскі лат	4 247,24
1 літоўскі літ	866,64
1 чэшская крона	120,56
1 польскі злоты	862,63
1 расійскі рубель	82,62
1 украінская грыўня	446,53

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ

USD	25,5761
10 UAH	53,9808
1000 BYR	12,1099
EUR	36,1851

Курс у гандлёвых кампаніях (на 10.09.2008 г.)

USD ..... 2135 / 2210

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

ЗАВЕРЕНО
Главное управление Министерства финансов Республики Беларусь по г. Минску
Управление по ценным бумагам
Начальник управления
Омельянович В.Н.
11.09.2008

ПРЕДЛОЖЕНИЕ
о покупке акций ОАО Банк «Золотой талер»

1. Полное наименование и местонахождение покупателя акций: Компания «Франса Холдинг (Ливан) С.А.Л.» («Fransa Holding (Liban) S.A.L.»), расположенная по адресу: Кантари Стрит — здание Общества по торговле и финансам — почтовый ящик 1531 — Бьерт, Ливан.

2. Полное наименование, местонахождение эмитента, акции которого приобретаются: Открытое акционерное общество банк «Золотой талер», 220035, г. Минск, ул. Татарская, 3.

3. Цена, по которой покупатель намерен приобретать акции: 1.9111 (Один доллар 9111/10000) долларов США за одну акцию.

4. Форма и порядок оплаты акций: оплата в безналичной форме денежными средствами в долларах США либо белорусских рублях в сумме, составляющей эквивалент стоимости акций в долларах США по официальному курсу Национального банка Республики Беларусь на дату платежа.

5. Сроки оплаты акций — в течение 14 дней со дня заключения договоров купли-продажи акций.

6. Адрес, по которому будут заключаться договоры купли-продажи акций: г. Минск, ул. Сурганова, 48а.

7. Дата начала покупки акций: 11 сентября 2008 г. Дата окончания покупки акций: 30 сентября 2008 г.

8. Телефон для справок: 306 45 42, 209 42 35 (факс).

Представитель компании
«Франса Холдинг (Ливан)С.А.Л.»
по доверенности № 2378/2008
от 23 мая 2008 г. Ибрагим Колейлат

Выбары-2008

СПРАЎ, А НЕ СЛОЎ

Мы пачынаем серыю апытанняў выбаршчыкаў, якія дазволяць атрымаць уяўленне аб спадзяваннях беларусаў адносна дэпутатаў

Як вы ўяўляеце сабе ідэальнага дэпутата? Чаго вы чакаеце ад дэпутата ў сваёй выбарчай акрузе? У рашэнні якой праблемы вы разлічваеце на дапамогу парламентарыя?

Вольга ШУМІЛАВА, перакладчык:

— Ідэальны дэпутат — упэўнены ў сабе, адукаваны энтузіяст, які гатовы працаваць на карысць грамадства і жадае ўнесці рэальныя пазітыўныя змены ў яго жыццё. Чакаю ад яго ў першую чаргу ўліку патрэбаў выбаршчыкаў і пабольш спраў, а не слоў! Мяне, у прыватнасці, цікавіць добраўпарадкаванне раёна, наладжванне больш эфектыўнай работы муніцыпальных службаў і ўстаноў аховы здароўя. Яшчэ хацелася б, каб у парламенце было болей жанчын, каб больш увагі надавалася гендарным праблемам.

Яўген СЯНЬКО, менеджар:

— Я жыву ў спальным раёне Мінска, у нас жудасная сітуацыя з паркоўкай. Машыну проста няма куды паставіць, усе двары імі запружаны! Можа хоць новы дэпутат нарэшце вырашыць гэту праблему! Я не веру ў існаванне ідэальнага дэпутата, аднак, каб ім стаць, варта не заплюшчваць вочы на праблемы сваёй акругі.

Павел БУДЗЬКО, прадпрымальнік:

— Для мяне ідэальны дэпутат — той, хто прадстаўляе мае інтарэсы, улічвае іх пры рабоце над законамі. Яны не павінны быць адарванымі ад жыцця. Я разлічваю, што будуць створаныя больш спрыяльныя ўмовы для бізнэсу, што падаткоая сістэма змякчыцца, палепшацца нашы адносіны з заходнімі краінамі. Мне здаецца, дэпутат павінен быць рэтрансляторам ідэй сваіх выбаршчыкаў.

Інэса ГАЛУШКА, інжынер-праграміст:

— Вельмі важна, каб дэпутат канкрэтна і паслядоўна выкладаў сваю праграму. Ведаеце, у іх звычайна такія агульныя фразы, усё неяк няпэўна. А хочацца нечага важкага і практычнага. Ад дэпутата я чакаю, што ён зможа, скажам так, прасоўваць наверх мае інтарэсы — я маю на ўвазе, не мае асабістыя, а маёй сацыяльнай групы. Ва ўсякім разе тое, што нашы праблемы не застануцца без увагі і будуць нейкім чынам вырашаныя. У першую чаргу, жыллёвыя праблемы — яны ўсіх турбуюць. Як маладога спецыяліста, мяне таксама цікавяць перспектывы павышэння заробку, нейкія бонусы для нас з боку дзяржавы.

Кацярына ЧАСНОВА, студэнтка:

— На маю думку, дэпутат павінен займацца вырашэннем хоць бы бытавых праблем у акрузе. Узяць хоць бы дзіцячыя пляцоўкі — у нашым двары яны не аднаўляліся з тых часоў, калі там яшчэ забаўлялася я! А выгул сабак? Трэба ж арганізаваць спецыяльныя абмежаваныя ўчасткі, а то ў нас яны гуляюць у садзе перад бальніцай!

Ганна МЯРЭНІЧ, эканаміст:

— Я вельмі далёкая ад палітыкі, таму, на маю думку, ідэальны дэпутат той, хто будзе ёю займацца без майго ўдзелу і на маю карысць. Дэпутат павінен быць вельмі блізкім да народа, не саромецца размаўляць з ім на адной мове, не толькі слухаць, але і чуць, успрымаць людзей. Браць у разлік іх праблемы. Заўсёды актуальныя для людзей пытанні адукацыі і камунальнай гаспадаркі.

Ала МАЧАЛАВА.

Наўздагон

Віктар МАРГЕЛАЎ:

«МЯРКУЕМ, ШТО КАМПРАМІС БУДЗЕ ЗНОЙДЗЕНЫ...»

«Звязда» ўжо пісала аб той рэакцыі, якую выклікала ў прадпрымальніцкіх колах пастанова Міністэрства эканомікі №179, якая ўнесла змяненні ў парадак фарміравання цэнаў на тавары замежнага паходжання. Нагадаем, гэты дакумент унёс абмежаванні памеру гандлёвай надбаўкі на імпарт на ўзроўні 30 працэнтаў.

Што і казаць, пастанова была, мякка кажучы, без энтузіязму ўспрынятая прадстаўнікамі айчыннага бізнэсу. Сярод аргументаў, якія выказваліся прадпрымальнікамі на карысць таго, што дакумент патрабуе дапрацоўкі, прагучалі, у прыватнасці, і наступныя: магчымасць узнікнення дэфіцыту тавараў на айчынным рынку з пачаткам працы пастановы, змяншэнне падатковых паступленняў, сыход асобных прадпрыемстваў у «шэры» рынак... Каб не дапусціць падобнага, на пасяджэнні кансультатыўнага каардынацыйнага савета дзелавога таварыства было прынята рашэнне звярнуцца да кіраўніка беларускага Урада з мэтай абмежаваць сферу дзеяння пастановы.

— Праблема рашаецца, — паведаміў карэспандэнту «Звязды» віцэ-старшыня Мінскага сталічнага саюза прадпрымальнікаў і найманых работнікаў Віктар Маргелаў, каментуючы ход кансультацый паміж спецыялістамі Мінэканомікі і бізнэсу. — Прычым сітуацыя тут мяняецца штодня. Выходзячы з таго, што шырока абмяркоўвалася, пытанне вырашаецца так, што ўмовы для імпарцёраў будуць значна лепшыя, чым у папярэднім дакументе. Сказаць больш канкрэтна я не бярэся: заўтра (размова ішла пра сённяшні дзень. — **Аўт.**) у Мінэканомікі зноў будзе праходзіць нарада, і гэта значыць — магчымыя пэўныя змяненні. Мяркуем, што кампраміс будзе знойдзены і будзе прынята дастаткова ўзважанае рашэнне.

Ігар ШЧУЧЭНКА.

УЗЯЦЬ ДЫ АДМЯНІЦЬ ПАДАТАК НА ДАБАЎЛЕНУЮ ВАРТАСЦЬ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— У кожнага свае клопаты. Хто ўжо набыў дарагую іншамарку ў аўтасалоне, а ў каго па ранейшаму не хапае грошай на элементарныя прадукты харчавання, палохаюць цэны на хлеб.

— Рост цэнаў на прадукты харчавання — гэта глабальная з'ява. Яна ў многім выклікана тым, што ў сувязі з высокімі цэнамі на нафтапрадукты сталі ў якасці альтэрнатывы выкарыстоўваць паліва з рапсу, рысу, збожжа. У выніку цэны на харчаванне ўзняліся паўсюдна. Хоць у Беларусі не так рэзка — у сярэднім толькі на 7 працэнтаў. У прыватнасці мяса — на 5,8 працэнта, крупы — на 20 працэнтаў, макаронныя вырабы — 18 працэнтаў. Моцна летась і сёлета падаражэлі масла і алей. Цана на бульбу гэтага ўраджаю чамусьці павялічылася ў паўтара разa, на цыбулю — на 10 працэнтаў. Калі такі тэмп захаваецца, то хутка бульба і іншая гародніна стануць даражэйшыя за заморскія бананы з далёкіх паўднёвых краін. Ёсць усе перадумовы. Сёлета бананы патанелі на 6 працэнтаў.

— Ведаеце, ужо на Камароўцы кілаграм якасных беларускіх яблыкаў каштуе больш, чым кілаграм бананаў. Як гэта растлумачыць?

— Такі парадокс вядомы эканамістам. Часткова гэта з'ява звязана з тым, што ў Беларусі ўсё больш вяскоўцаў адмаўляюцца ад вырошчвання прадуктаў харчавання на сваіх прысядзібных участках. Ужо трэці год запар там падаюць аб'ёмы вытворчасці сельгаспрадукцыі — у сярэднім на 3—4 працэнты, што з'яўляецца даволі трывожным сігналам. Гэта — новая тэндэнцыя. Раней такога ў Беларусі не назіралася. Відаць, вяскоўцы лічаць, што выгадней набываць прадукты харчавання ў крамах. А наконт яблыкаў думаецца, што мы некалі бяздарна страцілі традыцыі садаводства, а таму вымушаныя зімой набываць за немалыя грошы яблыкі, прывезеныя да нас з іншых краін, нават, калі не памыляюся, з Лацінскай Амерыкі. Сумна ўсё гэта бачыць.

— А якія, акрамя нафты, яшчэ ёсць фактары ўплыву на рост цэнаў?

— Той жа рост зарплаты, які без выключэння вітаецца літаральна ўсімі. Але не варта забываць, што павышэнне зарплаты ўключаецца ў сабекошт выпускаемай прадукцыі, што павышае выдаткі на яе вытворчасць і, зразумела, рознічную цану. У сувязі з тым, што цэны на прадукты харчавання на замежных рынках сур'ёзна павысіліся, нашым вытворцам выгадна экспартаваць сельгаспрадукцыю. Гэта таксама стымулюе рост унутраных цэнаў.

У канцы ліпеня ў краіне сярэдняя цана на ялавічыну была 9333 рублі, на свініну — 9450 рублёў. На сусветных рынках гэта мяса мы набываем па 2—2,5 долара ЗША за кілаграм, ці прыкладна па 4—5 тысяч рублёў. Атрымліваецца, што наша мяса даражэйшае ў два разы. Чаму? Мы яшчэ не дасягнулі такой прадукцыйнасці працы, як замежныя вытворцы ялавічыны і свініны. І не толькі. Бройлерныя кураняты на сусветных рынках мы набывалі за 70 цэнтаў, цяпер па 90 цэнтаў. Айчынныя бройлерныя

> Хутка бульба стане даражэйшая за бананы?

кураняты каштуюць па 3 долары за кілаграм, ці практычна ў некалькі разоў больш за імпартныя.

— Узнікае пытанне: чаму?

— На Захадзе куранят гадуюць строга па тэхналогіі, абавязкова вытрымліваюць у рацыёне збалансаванасць корму, згодна з рэкамендацыямі навукоўцаў ужываюць у неабходных прапорцыях розныя мінеральныя дабаўкі, выкарыстоўваюць энергазберагальнае абсталяванне. У нас жа часта на гадоўлю куранят ідзе больш кармоў, вялікія і іншыя выдаткі. Адсюль і высокія цэны на мяса птушкі.

— Чамусьці прыйшлі ў галаву радкі адной з песень Уладзіміра Высоцкага: «было время и цены снижали...» Але знакамітыя бард меў на ўвазе сталінскую эпоху. А ці ёсць сёння рычагі ўтаймавання цэнаў?

— Зразумела, ёсць. У першую чаргу шляхам зніжэння падаткаў. На мой погляд, ужо наспеў час адмовіцца ад падатку на дабаўленую вартасць (ПДВ). Гэты падатак быў некалі выдуманы ў пасляваенай Еўропе з мэтай тармажэння звышвысокай і тым самым не заўсёды карыснай дынамікі тэмпаў росту эканомікі. ПДВ не існавала ні ў XIX стагоддзі, ні раней. І людзі, між іншым, не пакутавалі ад гэтага. Цярпяшэ выкарыстанне ПДВ у нашай краіне (скапіраванае з Еўропы) істотна ўплывае на рознічную цану тавараў, што не апраўдана з пункту погляду развіцця эканомікі.

У Расіі, напрыклад, навукоўцы і эканамісты ўсё часцей гавораць на карысць ліквідацыі ПДВ. Гэту ідэю падтрымліваe і былы дацэнт, а цяпер прэзідэнт Расійскай Федэрацыі Дзмітрый Мядзведзеў. Ён выказаўся за паступовую мінімізацыю ПДВ з наступнай яго адменай. Я лічу і даўно публічна выказваюся аб тым, што нам трэба перайсці на плоскую шкалу падаткаабкладання, што істотна павялічыць рэальныя даходы насельніцтва.

— Леанід Фёдаравіч, відаць, вас пачулі ва Урадзе — з новага года мяркуецца ўвесці адзіны падаходны падатак — 12 працэнтаў.

— Не зусім пачулі. Я прапаноўваю адзіны падаходны падатак у 10 працэнтаў. Гэта было б дастаткова і для напаўнення бюджэту, і людзі мелі б больш высокую рэальную зарплату, а тавары сталі б таннейшымі.

— Міністэрства эканомікі дзеля зніжэння рознічных цэнаў мае намер абмежаваць гандлёвую надбаўку на імпартныя тавары 30 працэнтамі. Прадпрымальнікам гэта моцна не падабаецца. Ужо ўзнікла вострая дыскусія. Ваша меркаванне з гэтай нагоды?

— «Дыскусія» — мякка сказана. Такая бура ўзнялася ў асяроддзі малых і сярэдніх прадпрымальнікаў, якія спецыялізуюцца на пастаўках імпарту, проста жах. На мой погляд, Мінэканомікі не да канца прадумала гэты крок. Узнікае шмат пытанняў. Чаму 30-працэнтнае абмежаванне павінна датычыцца толькі імпарцёраў спажывецкіх тавараў? Якім чынам гэта норма будзе закранаць інтарэсы імпарцёраў, скажам, нафты? Калі яны сёння купляюць яе па 540 долараў за тону, то і бензін адпавednа павінен каштаваць прыкладна 1200 рублёў за літр, а не 2400. Як зажывуць тады нашы нафтаперапрацоўшчыкі і тыя многія, хто корміцца на нафце?

Ці возьмем імпарцёраў мяса птушкі. Скажам, набылі яны ў Польшчы 2,5 мільёна тон бройлерных курэнят па адным долары за кілаграм і прададуць у Беларусі ўсяго з 30-працэнтнай надбаўкай? Вельмі сумняваюся ў тым, што ў магазінах калі-небудзь польскія кураняты будуць каштаваць па 2,5 —3 тысячы рублёў за кілаграм.

Самую танную рыбу марскую імпарцёры набываюць у Латвіі і Польшчы прыкладна ад 50 цэнтаў да долара за кілаграм. Колькі яна потым каштуе на прылаўках той жа Камароўкі? У некалькі разоў больш. Гэтыя цэны на сумленні нашых рыбных бізнэсменаў.

Таму, шчыра кажучы, да высакародных і правільных намераў Мінэканомікі знізіць цэны на імпартныя тавары метадам усталявання 30-працэнтай надбаўкі я стаўлюся з немалой доляй іроніі. Хоць задумка ў цэлым цікавая і карысная як для эканомікі, так і для народа. Тады б, згодна з гэтай логікай, кілаграм імпартнай ялавічыны ці свініны каштаваў бы 3 тысячы рублёў, цукру з Лацінскай Амерыкі — 600 рублёў і г. д. Але з іншага боку, нашы ардынаносныя цукровыя камбінаты, мясакамбінаты і птушкафабрыкі хутка сталі б банкруцтвамі. Хто пойдзе на гэта?

— Аднак і пераплачваць за танную замежную прадукцыю жыхары краіны з сярэдняй зарплатай таксама не з рукі. У выпадку ажыццяўлення ў поўным аб'ёме планаў міністэрства — ці рэальны завал у эканоміцы?

— Завалу ці развалу не будзе. Але моцна пацерпяць дробныя імпарцёры адзення, абутку і спажывецкіх тавараў. Вялікія фірмы, дзякуючы велізарным аб'ёмам імпарту, прыстасуюцца і выжывуць. Што датычыцца айчынных вытворцаў, то ім давядзецца ўшчыльную канкрэтна, а не на словах, занізіць пытаннямі павышэння канкурэнтаздольнасці сваёй прадукцыі, рэзкага зніжэння выдаткаў на энергію, сыравіну, транспарт.

— А дзе дзяржаве і Ураду браць дадатковыя грошы за разлік з Расіяй за газ? Кажуць, у наступным годзе яна прапаноўвае Беларусі набываць яго за 200 долараў за тысячу кубаметраў.

— Дзіўная гэта краіна — Расія... Яна страціла ў выніку іпатэчнага крызісу ў ЗША 50 мільярдаў долараў і там мала хто гэта заўважыў. Але яна будзе са скуры вылузвацца, каб злупіць з нас дадаткова 1,5—2 мільярды долараў за газ у 2009 годзе.

— А што-небудзь увогуле таннела апошнім часам?

— Асобныя тавары. Напрыклад, мілыя сэрцу беларусаў аўтамабілі. За іх нашы суайчыннікі цяпер выкладваюць у сярэднім 7200 долараў за адзінку. Летась — 5500 долараў. У цэлым гэты тавар падаражэў. Разам з тым знізіліся цэны на аўтамабілі з Узбекістана (7 працэнтаў), Італіі (12 працэнтаў), Іспаніі (амаль 32 працэнты), Аўстрыі (аж 40 працэнтаў), відаць, гэта патрыманыя машыны. Тым не менш падзенне істотнае. Сусветны падзел працы і глабальны гандаль дае магчымасці набываць масу тавараў за вельмі прымальныя цэны. Толькі трэба ўмець карыстацца гэтым шанцам.

Гутарыў Леанід ЛАХМАНЕНКА.

За таксістаў-нелегалаў возьмуцца

Сёння штраф за рамізніцтва без ліцэнзіі складае ад 10 да 50 базавых велічынь (адна базавая велічыня — 35 тысяч рублёў). Сума 350 тысяч не палохае «шэрых» таксістаў, паколькі іх даход значна перавышае памер штрафу. Адна з дзейсных мераў у дачыненні да нелегальных таксістаў — канфіскацыя аўтамабіля ў даход дзяржавы, калі чалавек неаднаразова трапляўся за такія парушэнні. У гэтым выпадку падатковая служба складае адміністрацыйны пратакол, справа разглядаецца ў судзе. Так, у 2007 годзе было канфіскавана 12 машын агульным коштам больш як 82 мільёны рублёў. Сёлета могуць пазбавіцца аўтамабіляў яшчэ каля 20 нелегалаў.

Святлана ФРАЛЯНКОВА, «Мінск—Навіны».

Камунальнікі чакалі зарплату

Спецыялісты Полацкага міжраённага Камітэта дзяржаўнага кантролю падчас праверкі мясцовага прадпрыемства ЖКГ высветлілі, што наймальнікам не забяспечана своечасовая выплата заработнай платы.

Высветлілася, што зарплата за красавік гэтага года фактычна была выплачана работнікам прадпрыемства (а гэта 1417 чалавек) толькі 29 мая (пры ўстаноўленым калектыўным дагаворам тэрміне выплаты 25 мая). Па выніках праверкі кіраўнік прадпрыемства аштрафаваны на 350 тысяч беларускіх рублёў. Пры праверцы віцебскага прыватнага вытворчага ўнітарнага прадпрыемства «Улік» высветлілася, што дырэктар парушыў тэрміны выплаты зарплаты за май і чэрвень. На пачатак жніўня не выплацілі зарплату на суму 9,1 мільёна беларускіх рублёў. Запазычанасць была пагашана толькі падчас праверкі. Кіраўнік аштрафаваны на 525 тысяч рублёў. Толькі ў першым паўгоддзі былі праведзены больш за 930 праверак суб'ектаў гаспадарання. Па выніках высветлены каля 100 фактаў парушэння заканадаўства аб працы ў частцы выплаты зарплаты. За парушэнне тэрмінаў 54 наймальнікі прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці ў выглядзе штрафу на суму 50 мільёнаў рублёў. 60 адказных асобаў аштрафаваны на агульную суму 14 мільёнаў рублёў.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Аўтааматараў папярэджваюць:

падчас свята горада рух асабістага аўтатранспарту будзе абмежаваны...

Рух асабістага аўтатранспарту будзе абмежаваны з 10.00 да 12.00 13 верасня ў сувязі з фарміраваннем у раёне КЗ «Мінск» калоны аўтатранспарту і сельскагаспадарчай тэхнікі і яе рухам па маршруце: вуліца Леніна — вул. Ульянаўская — вул. Свярдлова — пр. Незалежнасці — МКАД. З 10.00 да 16.30 таго ж дня будзе перакрыты рух аўтатранспарту па пр. Пераможцаў (ад плошчы Свабоды да МКАД) і па пр. Машэрава (ад пр. Пераможцаў да вул. Даумана). Пры гэтым паркоўка на згаданай тэрыторыі будзе забаронена ўжо напярэдадні, 12 верасня, з 21.00. А таму сталічная Дзяржаўтаінспекцыя заклікае аўтаўладальнікаў прыняць да ўвагі гэту інфармацыю і ў мэтах эканоміі ўласнага часу выключыць згаданыя ўчасткі руху са свайго маршруту. Акрамя таго, супрацоўнікі праваахоўных органаў папярэджваюць і аб тым, што на свята не будуць дапускацца грамадзяне ў стане алкагольнага ап'янення і асобы, якія праносяць з сабой спіртныя напоі і піва (у якой бы ўпаковачнай тары яны ні былі).

Ігар ГРЫШЫН.

Ушанавалі алімпійцаў

Дзеці і дарослыя выстраіліся ў чэргі, каб атрымаць аўтографы і сфатаграфавацца з алімпійскімі чэмпіёнамі і прызёрамі. Віншаванні магіляўчан прымалі Аксана Манькова, Аляксандр і Андрэй Багдановічы, Андрэй Арамнаў, Андрэй Рыбакоў, Андрэй Міхневіч. На трыбунах Магілёўскага легкаатлетычага манежа «Алімпіец» не было свабодных месцаў на ўшанаванні спартсменаў — выхаванцаў вобласці, якія заваявалі медалі і паказалі высокі вынік на Пекінскай алімпіядзе, а таксама іх трэнераў і бацькоў.

— Мы ўсе былі разам з вамі, перажывалі і хваляваліся, — сказаў спартсменам старшыня Магілёўскага аблвыканкама Барыс Батура. — Калі вы перамагалі, на радзіме нават у мужчын з моцнымі нервамі паказваліся слёзы. Слёзы гордасці за вас і Беларусь.

Алімпійцаў узнагародзілі ганаровымі граматамі, грашовымі прэміямі, каштоўнымі падарункамі ад прадпрыемстваў. Імёны чэмпіёнаў і прызёраў Пекіна занясуць у Кнігу Славы Магілёўшчыны.

Ілона ІВАНОВА.

Абзац

■ Рыбгасы Мінсельгасхарча пачалі масавы восеньскі адлоў рыбы ў рыбаводчых азёрах і арганізавалі яе пастаўку ў гандлёвую сетку. У сувязі з ростам затрат на вытворчасць рыбы павялічваюцца і цэны на яе. У сярэднім цана на сажалкавую рыбу з пачатку года вырасла на 40 працэнтаў, што не магло не адбіцца і на ўзроўні продажаў. Таму рыбгасы зацікаўленыя ў арганізацыі фірменнага гандлю, праводзяць кірмашы па продажы карыснай прадукцыі. У фірменным гандлі цана на дробнага карпа хістаецца ад Br4850 да Br5500, сярэдняга — ад Br4910 да Br6000, буйнога — ад Br5850 да Br6700, адборнага — ад Br6970 да Br9090.

■ Першыя гектары сланечніку ўбраныя ў СВК «Фядорскі» Столінскага раёна. Сярэдняя ўраджайнасць складае 25 ц/га. Сёлета ў Брэсцкай вобласці ўпершыню вырошчваюць сланечнік у прамысловых аб'ёмах, культура пасеяная на плошчы 3 тыс. га. Са сланечнікам пачалі працаваць практычна ўсе раёны вобласці.

■ 20-гадовая гамяльчанка затрымана па падазрэнні ў забойстве свайго нованароджанага сына. Яна нарадзіла ва ўласнай лазні, пасля чаго вынесла дзіця да возера Шапор, дзе і пакінула ў канаве. Практычна праз месяц труп дзіцяці выявілі мясцовыя жыхары і паведамілі ў міліцыю. Узбуджана крымінальная справа.

■ Адзін з кітайскіх супермаркетаў спецыяльна да пачатку школьнага сезона вырашыў правесці рэкламную акцыю, наладзіўшы распродаж прэзерватываў. Мерапрыемства выклікала сур'ёзнае абурэнне грамадскасці. Магазін у Шанхаі ўстанавіў рэкламны шчыт з прэзерватывамі з надпісам «Цана, якая шакіруе, да пачатку школьнага сезона: 24,5 юаняў!» Супермаркет тут жа раскрытыкавалі за выбар школьнікаў у якасці мэтавай аўдыторыі, а таксама за тое, што падобнымі акцыямі магазін адцягвае ўвагу школьнікаў ад вучобы і наогул. Прадстаўнікі вытворцаў, якія прадаюць свае прадукцыю ў гэтым магазіне, таксама не пахвалілі рашэння. Вытворца гэтага тавару паведаміў, што яму нічога не вядома пра гэтую акцыю, і яна з'яўляецца ініцыятывай крамы.

■ Кухарка аднаго з рэстаранаў у ліванскім горадзе Цір знайшла ў вустрыцы 26 жамчужын. Вустрыцу сабралі на міжземнаморскім узбярэжжы Лівана. Працаўнікі рэстарана і раней знаходзілі перліны ў вустрыцах, але іх колькасць не перавышала дзвюх штук. Пра сваю знаходку жанчына і яе сын, які з'яўляецца гаспадаром рэстарана, маюць намер заявіць у Кнігу рэкордаў Гінэса.

■ Група японскіх навукоўцаў упершыню ў гісторыі вырасціла ў роце новы паўнацэнны зуб на месцы выраванага. Для доследу вучоныя выкарысталі мышаня з зубамі, якія яшчэ не сфарміраваліся. З зародка аднаго з зубоў былі ўзятыя клеткі. Затым іх па асаблівай методыцы вырошчвалі ў калагене. У выніку ўдалося атрымаць новы паўнацэнны зародак зуба, які перасадзілі дарослай мышы на месца вырванага разца. Зуб добра прыжыўся і пачаў развівацца. Было зафіксавана з'яўленне ў ім нерва, злучэнне з крывяноснымі сасудамі, фарміраванне паўнацэннай эмалі і іншых кампанентаў. На думку спецыялістаў, гэта адкрывае прынцыпова новыя магчымасці для данцістаў. Даследчыкі мяркуюць, што такую метадалогію можна прымяняць не толькі для вырошчвання згубленых зубоў, але і, да прыкладу, валасоў.

■ Шатландзец, які працуе паштальёнам у Франкфурце (Германія), арыштаваны за захоўванне прыкладна 20 тыс. пісьмаў. 23-гадовы малады чалавек прызнаўся, што на працягу мінулага года ён хаваў ці выкідваў пісьмы замест таго, каб дастаўляць іх адрасатам. Прычынай гэтага стала моцная загружанасць працай і наведванне вячэрніх курсаў для атрымання сертыфіката аб сярэдняй адукацыі. Калі паштальён выкідваў пісьмы ў вядро для смецця, яго заўважыў сусед і выклікаў паліцыю. Падчас вобыску дома паліцэйскія знайшлі вялікую колькасць схаваных пісьмаў, якія яны павезлі на двух маленькіх грузавіках.

Поўны абзац

■ На возеры Чыка (штат Арканзас, ЗША) таўсталобік, які выскачыў з вады, зламаў 15-гадоваму падлетку сківіцу. Юнак плаваў на камеры, прывязанай да лодкі, калі нечакана рыба, што выскачыла з вады, трапіла яму ў твар. Па словах маці, усё адбылося так хутка, што ён нічога не зразумеў. Спачатку падлетак смяяўся, а потым страціў прытомнасць і ачнуўся толькі ў бальніцы. Яму зрабілі аперацыю, але да гэтай пары ён адчувае боль, выкліканы кроваізліццём ад моцнага ўдару.

■ Паліцыя амерыканскага гарадка Фрэсна (штат Каліфорнія) арыштавала злодзея з кулінарнымі схільнасцямі. Невядомы мужчына ўварваўся ў дом да двух фермераў, выкраў грошы, намазаў адраго спецыямі, а другі атрымаў па галаве 20-сантыметровай сасіскай. Пасля гэтага ён збег у поле, дзе яго, у майцы, трусах і шкарпэтках, выявілі вартавыя парадку. Спачатку іх увагу прыцягнуў знешні выгляд маладога чалавека, а потым выявілася, што ён і ёсць злодзей: у абрабаваным доме ён пакінуў свой кашалёк і пасведчанне. Скрадзеныя грошы вернутыя.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

Якое выхаванне — такія і ўчынкі

Вядома, як трапляюць дзеці ў сацыяльны прытулак: іх забіраюць з тых сем'яў, у якіх бацькі зусім не займаюцца выхаваннем або прыклад бацькоў — толькі перашкода ў выхаванні. Вось і ў пінскім прытулку жылі падлеткі... А потым выхадным днём пайшлі на могілкі, каб «пазабаўляцца». Дзеці павыварочвалі і разбілі каля трох дзесяткаў надмагільных помнікаў. Юных вандалаў знайшлі хутка. Толькі што з іх возьмеш? Яны сацыяльныя сіроты, а да крымінальнай адказнасці можна прыцягваць з 16 гадоў. Пакуль праваахоўнікамі вядзецца праверка, выхавальніку прытулку часткова ўзнавілі пашкоджаныя помнікі.

Яна СВЕТАВА.

ІНСУЛЬТЫ 36,6°

ЛЕЧАЦЬ ПА-НОВАМУ

У Беларусі скарачаецца колькасць інсультных хворых: за пяць месяцаў гэтага года іх колькасць зменшылася на 1,8 працэнта у параўнанні з аналагічным перыядам 2007 года. Аб гэтым паведаміў дырэктар РНПЦ неўралогіі і нейрахірургіі доктар медыцынскіх навук прафесар Сяргей ЛІХАЧОЎ.

Паводле яго слоў, у рэспубліцы таксама адзначаецца тэндэнцыя да зніжэння смяротнасці ад цэрэбраваскулярных хваробаў у цэлым. Колькасць лятальных выпадкаў ад гэтых захворванняў за 5 месяцаў гэтага года зменшылася на 3,85 працэнта ў параўнанні з аналагічным леташнім перыядам.

Як адзначыў Сяргей Ліхачоў, колькасць лятальных выпадкаў ад інсультаў вялікая ва ўсім свеце, але ў Беларусі за апошнія гады ўдалося знізіць гэты паказчык дзякуючы мерам, прынятым на ўзроўні Саўміна і Мінздрава Беларусі. Станоўчай дынаміцы паказчыку смяротнасці ад інсультаў садзейнічала адкрыццё інсультных аддзяленняў у многіх клініках, не толькі сталічных, але і рэгіянальных. Акрамя таго, сучасным абсталяваннем аснашчаны рэанімацыйныя аддзяленні, што робіць больш эфектыўнай медыцынскую дапамогу, што аказваецца хворым. «Змяненне загадаў па вядзенні інсультных хворых таксама зрабіла свой унёсак у паказчыкі смяротнасці. Калі раней лічылася, што хвораму з інсультам лепш не рухацца, то цяпер медыкі прытрымліваюцца іншага пункту гледжання: хворага неабходна транспартаваць у бальніцу, прычым чым раней тым лепш», — падкрэсліў прафесар.

Сяргей Ліхачоў расказаў аб новым метадзе лячэння хворых з інсультамі — тромбалізісе, які ўпершыню ў рэспубліцы быў прыменены ў канцы мінулага года ў адной з гродзенскіх бальніц. Сёлета падобныя аперацыі былі праведзены ў Мінску ў бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі і 9-й гарадской клінічнай бальніцы. Пры ўмове ўвядзення ў арганізм хворага прэпаратаў, якія растваряюць тромбы ў артэрыях і аднаўляюць кровазабеспячэнне галаўнога мозга на працягу 3 гадзін, можна пазбегнуць цяжкіх наступстваў інсульту. Сутнасць метаду заключаецца ў хуткім уводзе ў арганізм інсультнага хворага тромбалітыкаў. Аднак тромбалізіс паказаны толькі 4 працэнтам насельніцтва, дадаў дырэктар РНПЦ, у астатніх выпадках прымяняюць іншыя методыкі лячэння.

Каб пазбегнуць цяжкіх наступстваў інсульту, Сяргей Ліхачоў параіў не зацягваць з паходам да ўрача чалавеку ў тым выпадку, калі ён адчувае час ад часу анямненне канечнасцяў, слабасць у руках або нагах і калі ён заўважыў у сябе парушэнне каардынацыі рухаў.

Вольга ШЭЛЯГОВІЧ, БЕЛТА.

Фота Анатоля КЛЕЧУЧКА.

Давыд-Гарадок Столінскага раёна.

БЕЛОРУССКИЙ ИНДУСТРИАЛЬНЫЙ БАНК

ОАО «БЕЛОРУССКИЙ ИНДУСТРИАЛЬНЫЙ БАНК» ИНФОРМИРУЕТ ОБ ИЗМЕНЕНИИ ПАРАМЕТРОВ 2-го ВЫПУСКА ОБЛИГАЦИЙ

Департамент по ценным бумагам Министерства финансов РБ зарегистрировал изменения в Проспекте эмиссии облигаций 2-го выпуска ОАО «Белорусский Индустриальный Банк»:

Пункты 2.9. и 2.13. главы 2 изложить в следующей редакции:

«2.9. Размер или порядок определения размера дохода по облигациям, условия его выплаты

Доходность по размещаемому выпуску облигаций — **13 %** годовых при размещении «до погашения» на первичном рынке. Выплата дохода по дисконтным облигациям осуществляется единовременно при погашении облигаций. Расчет текущей стоимости облигаций, размещенных до даты изменения доходности по выпуску, осуществляется исходя из **13 %** годовых с момента (даты) публикации данных изменений в средствах массовой информации.

Дисконтные облигации продаются по стоимости ниже номинальной и погашаются по номинальной стоимости.

Размер дохода по облигациям определяется как разница между номинальной стоимостью и ценой приобретения облигаций.

2.13. Порядок перехода прав собственности на облигации на вторичном рынке ценных бумаг, условия конвертации, условия и порядок досрочного погашения облигаций

Эмитент имеет право выкупить свои облигации для перепродажи или досрочного погашения. Облигации могут быть досрочно погашены по решению эмитента. При принятии эмитентом положительного решения оплата производится в течение 10 рабочих дней с момента подачи заявки на досрочное погашение.

В случае принятия решения об увеличении процентной ставки по выпуску, по заявлению владельцев облигаций эмитент в течение 15 дней с момента (даты) публикации изменений в средствах массовой информации обязуется выкупить принадлежащие заявителям облигации на вторичном рынке с ранее установленной доходностью по выпуску.

Совершение сделок купли-продажи для юридических лиц, не являющихся профессиональными участниками рынка ценных бумаг Республики Беларусь, осуществляется на внебиржевом рынке в соответствии с законодательством Республики Беларусь. Для юридических лиц — профессиональных участников рынка ценных бумаг — сделки купли-продажи осуществляются на биржевом рынке в порядке, установленном открытым акционерным обществом «Белорусская валютно-фондовая биржа».

Конвертация облигаций не производится.».

Лицензия на осуществление банковской деятельности НБ РБ № 20 от 13.02.2007 г. УНП 100195493

КАЛІ ДОМ НЕ ПОМНІК

Кватэрнае пытанне

Мы рашылі купіць сабе кватэру — далі аб'яву, разгледзелі ўжо з дзесятак прапаноў і пераканаліся, што рамонтных работ з нейкім пераабсталяваннем пазбегнуць не ўдасца. Напішыце, што цяпер можна рабіць самастойна, без дазволу выканкама, а што — трэба ўзгадняць?

Б. Г., *Брэст.*

Гэта пытанне рэгламентавана Палажэннем аб парадку пераўладкавання і перапланіроўкі жылых памяшканняў у шматкватэрных жылых дамах (зацверджана пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 31 снежня 2006 г. № 1805). У прыватнасці, не патрабуецца дазволу мясцовага выканаўчага і распарадчага органа і распрацоўкі праекта для правядзення наступных рамонтна-будаўнічых работ:

устаноўка (замена) міжпакаёвых дзвярэй у межах існуючага дзвярнога праёму;

прыладжванне падвясных (нацяжных) столяў;

прыладжванне і дэмантаж стацыянарных шафаў і антрэсоляў;

устаноўка вентыляцыйных прыбораў;

замена электратэхнічных вырабаў (разеткі, выключальнікі, святцільні) і падлогавых пакрыццяў на тыя, якія маюць аналагічныя тэхнічныя характарыстыкі;

замена электрычных пліт і санітарна-тэхнічнага абсталявання.

Па ўзгадненні з арганізацыяй, якая ажыццяўляе эксплуатацыю жыллёвага фонду, арганізацыяй грамадзян-забудоўшчыкаў, спецыялізаванымі арганізацыямі (органамі), якія абслугоўваюць жылы дом, могуць ажыццяўляцца наступныя рамонтна-будаўнічыя работы:

устаноўка індывідуальных прыбораў уліку вады (узгадненне з арганізацыяй, якая ажыццяўляе эксплуатацыю жыллёвага фонду, арганізацыяй грамадзян-забудоўшчыкаў);

замена аконных і балконных запаўненняў фасадаў жылых дамоў, а таксама ўпарадкаванне памяшканняў, якія не ацяпляюцца, за кошт шклення балконаў і лоджыяў (узгадненне з мясцовым тэрытарыяльным органам архітэктуры і горадабудаўніцтва);

устаноўка ўзмоцненых і дадатковых уваходных дзвярэй у памяшканне (узгадненне з арганізацыяй, якая ажыццяўляе эксплуатацыю жыллёвага фонду, арганізацыяй грамадзян-забудоўшчы

УСЁ, «ЯК У ЛЮДЗЕЙ...»

Жэня вярнуўся з Гомеля ад бабулі, дзе правёў некалькі дзён і адразу ж трапіў у абдымкі маці Ларысы Валянцінаўны, бацькі Алега Пятровіча, брата Вадзіма і сястрычак Леры і Насці. А калі да яго пацягнуліся ручкі трохгадовай Людачкі, не вытрымаў: прызнаўся, як сумаваў па ўсіх. І мы па табе вельмі, сказалі дзеці, а маці спытала: няўжо ў бабулі яму было дрэнна? Было добра, але дома — лепш, адказаў хлапчук і прыхінуўся да яе.

Ларыса Валянцінаўна ўспомніла сваё дзяцінства, калі яна ездзіла з Гомеля ў госці да бабулі ў вёску Ухватаўкі, што ў Рагачоўскім раёне. Што ні рабіла толькі там, у чым ні дапамагала роднаму чалавеку: і агарод праполвала, і з каларадамі змагалася, і жыўнасць розную выпасвала, да ўсякай работы былі здатныя яе рукі, хоць у горадзе такое выконваць ёй не даводзілася, там быў іншы профіль, бо Ларыса — старэйшая сярод траіх дзяцей у сям'і, і маці Таццяна Сяргееўна ўсе надзеі ўскладала на яе па хатніх справах, асабліва калі ў яе з мужам не заладзілася жыццё і яны скасавалі шлюб.

У той вось час, калі ў сям'і не хапала грошай, Ларыса ў чатырнаццаць з паловай гадоў вырашыла пайсці на працу, каб мець хоць невялікі заробак. Але куды толькі ні звярталася, дзяўчо шкадавалі (бо ведалі, што сітуацыя прымушае яе шукаць работу), але ж разводзілі рукамі: падлетак ты, падрасці, а потым прыходзь. І ўсё ж урэшце ёй пашанцавала: у адной цырульні дзяўчыну прывецілі і ўзялі ў вучаніцы па манікюрнай справе, якую яна асвойвала тры з паловай месяцы. Зразумела, што Ларыса вымушана была пакінуць вучобу ў сваёй школе № 45 і вечарамі наведваць школу рабочай моладзі, каб атрымаць сярэднюю адукацыю.

Фота Івана ЧЭКАНА.

— Да кожнага работніка цырульні, — успамінае яна зараз, — даводзіўся план. Ахвотніц-жанчын рабіць манікюр было мала, ад чаго, між іншым, залежаў і заробак. Дык я, каб падцягнуць справы, вырашыла навучыцца мужчынскай стрыжцы, што і ўдалося. Але ўсё роўна зарплата не задавальняла мяне, бо хацелася і ў кіно, тэатр схадзіць, і прыгожа апрануцца. У той час мама выйшла замуж другі раз, і айчым дапамог мне ўладкавацца на завод ліцця і нармаляў. На самым пачатку работы — зноў вучаніцай, а затым па цэхах размяркоўвала са склада дэталі. І гэтак — тры гады.

Магчыма, Ларыса і сёння працягвала б на гэтым прадпрыемстве сваю рабочую біяграфію, калі б не наведвалася туды, супакойваў: усё будзе добра.

Пажаніліся яны летам 1991 года, і адразу вырашылі: будзем жыць у Гомелі. Алег уладкаваўся працаваць у вытворчае аб'яднанне «Гомельбудматэрыялы» рабочым. У той час адбыўся распад адзінай вялікай краіны. Усюды пачалося скарачэнне штатаў, зніклі надзеі на атрыманне бясплатнага жылля, а ў кватэры маці Ларысы ў двух пакоях было цесна. Таму знайшлі прыватную кватэру, але ж думкі былі аб адным: у іхняй сям'і будзе многа дзяцей, патрэбна думаць аб сваім жыллі. Атрымаць яго ў горадзе з іхняй зарплатай — праблема невырашальная. А тут нарадзіўся ўжо Вадзім, і блукаць з дзіцем па чужых кватэрах не так проста. Таму паехалі жыць да маці Алега ў Жлобінскі раён, і праз каторы час ён атрымаў запрашэнне на работу сантэхніка ў вёску Стэпы з выдзяленнем жылля.

Здавалася, жыццё наладжваецца: праца ёсць, дом бясплатны — таксама, Ларыса асвойвае навыкі вясковай работы і быту. У тым сэнсе, што маці Алега выдзеліла ім цялушку, дзве казы, двух парсюкоў, дзесяць курэй з пеўнем, сена, агарод пры доме, дзе можна садзіць ці сеяць, што твая душа пажадае. Цяжка было ўпраўляцца з гаспадаркай, бо нарадзіўся другі сынок Жэня, ды нічога, прывыкла гарадзканка Ларыса да вясковых спраў, але з імі давялося развітацца. Справа ў тым, што ў тым доме сям'ю не прапісвалі, і Амбруцісы вырашылі перасяліцца ў Жлобін.

Зноў прыватная кватэра, зноў неспакой: што будзе далей, хто дапаможа? Прамільгнула надзея ўладкавацца Алегу на працу ў КУП «Цепласэрвіс», дзе яму паабяцалі даць пакой у інтэрнаце. І на тым дзякуй. Жыццё наладжвалася, хлапчукі падраслі, а ў сям'і Амбруцісаў думалі пра свой кут і пра тое, што трэба, каб у ёй з'явілася дзяўчынка.

— Я наогул марыла, — гаворыць мне Ларыса Валянцінаўна, — каб у нас было шмат дзяцей. Напэўна, таму, што сказаліся гены, спадчына. У маёй мамы іх было трое, у бабулі — чацвёра, у прабабулі — дванаццаць. У іншых родзічаў — таксама. А чым я горшая? Таму, калі мы жылі ў інтэрнаце, нарадзілася спачатку Лера ў 2000 годзе, а потым і Насця ў 2003-м. Хто-нікто пытаў: навошта, жыццё цяжкае, глядзі, каб жабрацкую сумку не займелі. А мы з мужам верылі ў будучыню: правёмся, маўляў. Без старання і намаганняў і рыбку не зловіш. Трэба варушыцца.

Ларыса не сядзела склаўшы рукі. Яна, як і многія жыхары Жлобіна, закупляла штучнае футра і шыла з яго мяккія цацкі — мядзведзікаў, зайцаў, сабачак і г.д., якія прадавала каля чыгуначнага вакзала. Дапамагаў ёй у гэтай справе і Вадзім. Да заробкаў Алега далучыліся і заробкі Ларысы. Так з'явілася магчымасць уступіць у кааператыў індывідуальных забудоўшчыкаў і нават унесці тры ўзносы ў будаўніцтва ўласнай кватэры. Праўда, хутка высветлілася, што мэта аказалася на мяжы прывіду, бо за цэнамі на жыллё Амбруцісы ўгнацца з іхнім кашальком не маглі. Добра, што з'явіліся ўказы Прэзідэнта краіны па дапамозе і клопатах у дачыненні да шматдзетных сем'яў. Тут і льготныя крэдыты, і субсідыі на будаўніцтва жылля і г.д., што карэнным чынам змяніла сітуацыю. Бо ці ж не палёгка, калі атрымалі субсідыю на сорак гадоў з выплатай нязначных гадавых працэнтаў? Так вось і справілі яны наваселле ў 2005 годзе ў трохпакаёвай кватэры дзевяціпавярховіка. Да гэтай сямейнай радасці прыбавілася яшчэ адна: нарадзілася Людачка. Бацькі і пяцёра дзяцей — сем я. Ларысе Валянцінаўне зручыліся ордэн Маці.

— Клопатаў хапае, — працягвае яна. — Я шчаслівая, што ў мяне добры муж. На рабоце да яго павага, донар... Дома таксама не сядзіць склаўшы рукі, заўсёды сярод дзяцей, дапамагае ім ва ўсім. У нас ёсць відэакамера, і яны робяць здымкі, калі мы на прыродзе або адзначаем сямейныя святы. Дзеці навучыліся валодаць камп'ютарам, афармляюць фотаальбомы, выпускаюць насценгазеты...

Я спытаў у Вадзіма, дзесяцікласніка, куды ён пойдзе вучыцца пасля школы. У Чырвонабярэжскі сельскагаспадарчы, быў адказ. Падлетак любіць матэматыку, а Жэня, наадварот, аддае перавагу гуманітарным прадметам, вельмі многа чытае, ён — васьмікласнік. Лера — першая памочніца маці па кухонных справах і сёлета закончыла першы клас. Насця наведвае дзіцячы садок, ну а Людачка дома з мамай. Малая яна яшчэ.

Дружная сям'я ў Ларысы Валянцінаўны і Алега Пятровіча Амбруцісаў. Зараз яна — у чаканні пашырэння жылля. А напярэдзе задума — купіць легкавушку.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

ДАРОГА, ЯКАЯ ЯДНАЕ

ДАРОГА... Якую шырокую шматзначнасць мае гэта слова! У ім рух, прыпынак часу, нікіраванасць, а калі звважаць на тое, што навокал, то і адлюстраванне самога жыцця. Жыццё пераменлівага, але вечнага.

Такая выснова напрасілася, калі нашу экспедыцыю сустракалі на мяжы Мастоўскага раёна і ўдзельніца экспедыцыі Святлана Дзяйко з Нацыянальнага інстытута адукацыі, адказваючы на прывітанне мясцовых жыхароў, прачытала наступныя радкі:

Паводле высноў мудраца,
Усё канчыцца позна ці рана —
І толькі дарозе да Храма
Ніколі не будзе канца.

«Дарога да Святыняў» з Дабратворным агнём ад Гроба Гасподняга — такую назву вось ужо пятнаццаць гадоў нясе наша навукова-асветніцкая экспедыцыя, праходзячы праз гарады і вёскі, ідучы па палях і лясных сцежках, прыпыняючыся дзеля сустрэч з месцічамі, дзеля сумоўя і агульнай малітвы. Усюдна напярэдзе экспедыцыі ахінутая вышываным ручнікамі цудатворная Загор'е-Сталавіцкая ікона Пакрову Прасвятой Багародзіцы і выбрабленая лепшымі беларускімі майстрамі лампада з агнём, запаленым у Іерусаліме каля Гроба Гасподняга.

Вось і сёлета экспедыцыя накіравалася па чарговым маршруце, згодна з якім належала пабываць у Баранавіцкім, Зэльвенскім, Мастоўскім, Шчучынскім, Дзятлаўскім, Карэліцкім, Валожынскім, Смалявіцкім, Барысаўскім раёнах і прыбыць на штогадовае свята — Дзень беларускага пісьменства. Удзельнікаў экспедыцыі чакалі ў школах і бібліятэках, у інтэрнатах і аздараўленчых установах, чакалі вернікі ў цэрквах і манастырах.

Увогуле, сустрэць і паслухаць любога з удзельнікаў гэтага шматдзённага паломніцтва было цікава і карысна. Вось, напрыклад, з кароткіх лекцый доктара гістарычных навук, археолага Пятра Лысенкі слухачы дазнаваліся, як выглядала іх мясцовасць шмат стагоддзяў таму. Народная артыстка Беларусі Марыя Захарэвіч расчыняла ўмоўную тэатральную заслону — чаравала ўсіх вершамі Купалы, Коласа, Танка. Пра нашу моўную спадчыну гаварыў член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук, доктар філалагічных навук Сцяпан Лаўшук. Свае вершы чытаў лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі паэт Генадзь Пашкоў, кіраўнік экспедыцыі лаўрэат Нацыянальнай прэміі «За духоўнае адраджэнне» пісьменніца Ніна Загорская...

Але найбольшую ўвагу любой аўдыторыі прыцягваў кандыдат багаслоўя, загадчык кафедры Тэалагічнага інстытута БДУ мітрафорны протаіерэй Сергій Гардун. Ад яго прысутныя чулі невядомыя шырокай аўдыторыі факты з гісторыі царквы, яго выступленні, падобныя на пранікнёныя пропаведзі, прымушалі да роздуму, да асэнсавання па законах вечных хрысціянскіх каштоўнасцяў. Да таго ж у руках святара заўжды свяцілася лампада, запаленая ад Гроба Гасподняга — гэта ён быў галоўным захавальнікам Дабратворнага агню, які ўсюдна пераходзіў на свечкі храмаў і прыхаджан.

Дзе б ні праходзіў маршрут экспедыцыі, усюды сустрэчы набывалі форму дыялогу — месцічы дапаўнялі навукоўцаў сваімі меркаваннямі, дзяліліся роздумам. Так, у Шчучынскай дзяржаўнай гімназіі мы пачулі, як дзейнічае дзіцячае навуковае таварыства — прадметамі даследаў сталі пераклады твораў Янкі Купалы на іншыя мовы, гісторыя стварэння Крыжа Ефрасінні Полацкай, праваслаўнае дойлідства ў навакольных вёсках.

Навуковыя работы некаторых вучняў названы лепшымі ў рэспубліцы. А ў школе вёскі Астрына з цікавасцю паслухалі школьнікаў — экскурсаводаў музея класіка айчыннай літаратуры Алаізы Пашкевіч (Цёткі). Музей (на жаль, адзіны ў рэспубліцы) створаны самімі вучнямі і настаўнікамі, таму з такой цікавасцю сустракалі тут удзельніцу экспедыцыі, кандыдата філалагічных навук, даследчыцу творчасці Цёткі, пісьменніцу Валянціну Коўтун.

Прыгадваючы мінулыя чатырнаццаць экспедыцый, можна назваць лічбы, якія ўражваюць. За гэты час экспедыцыя праехала пятнаццаць тысяч кіламетраў, разам з Хрэсным ходам прайшлі больш за адзін мільён чалавек, на яе шляху засталіся ўзведзеныя капліцы і Крыжы-абярэгі, каля тысячы грамадскіх установ і храмаў асвечаны Дабратворным агнём. Але самым галоўным здабыткам гэтай штогадовай навукова-асветніцкай акцыі з'яўляецца яе збліжальны ўплыў на хрысціянскія канфесіі, якія здаўна існуюць на Беларусі.

Так, напрыклад, сярод насельніцтва невялічкага пасёлка Жалудок вернікаў-католікаў больш, чым праваслаўных, але сустракаць лампаду з Дабратворным агнём яны сабраліся разам. Старшыня мясцовага Савета Генадзь Цівінскі зазначыў, што да такой святочнай падзеі рыхтаваліся ўсёй вясковай грамадой: добраўпарадкоўвалі плошчу і сквер, падрыхтоўвалі для гасцей лёгкі пачастунак з мясцовых садоў. Прыкладам у агульных намаганнях былі дружныя між сабой мясцовыя праваслаўны і каталіцкі святары.

Па традыцыі, якая існуе ўжо шмат гадоў, удзельнікі экспедыцыі ўсюды па сваім шляху садзілі маладыя дрэўцы — часцінкі агульнабеларускага Саду Малітвы. У Барысаве, дзе адбылося свята Дня беларускага пісьменства, карані маладых дрэўцаў леглі ў зямлю, прывезеную з усіх гарадоў, вёсак, манастыроў, дзе сёлета пабывала лампада з Дабратворным агнём.

Сёлета да назвы экспедыцыі дабавілася новае слова МІЖНАРОДНАЯ, і гэта таксама мае шырокую шматзначнасць. Не толькі таму, што працаваць у ёй выказалі жаданне садоўнік маскоўскага Свята-Данілава манастыра Галіна Светава, маскоўскі кінасцэнарыст Васіль Яцкін, украінскія пісьменнікі Барыс Алейнік і Восіп Струцюк, доктар тэхнічных навук, святар з Валгаграда Аляксандр Палавінкін і шмат хто яшчэ. Высокая аб'яднальная місія экспедыцыі «Дарога да Святыняў» павернута да людзей розных канфесій. Гэта дарога, па якой можна ісці дзеля агульнай згоды, дзеля нашай агульнай гістарычнай спадчыны.

Яўген ПЯСЕЦКІ,
удзельнік штогадовых экспедыцый «Дарога да Святыняў».

4

На здымках:

1. На маршруце экспедыцыі жаночы манастыр у в. Барань Барысаўскага раёна.
2. У гэтай лампадзе Дабратворны агонь быў пранесены ў верасні 2008 года.
3. Сярод тых, хто сустракаў экспедыцыю ў Шчучыне, былі члены ваенна- патрыятычнага клуба імя Святога Аляксандра Неўскага.
4. Шмат агульных пытанняў у начальніка ўпраўлення Нацыянальнага інстытута адукацыі Святланы Дзяйко і кандыдата багаслоўя Сергія Гардуна.
5. Сустрэча ў Мастах адбылася позна вечарам.
6. Пасёлак Жалудок. Ад імя экспедыцыі настаяцелю мясцовага каталіцкага касцёла ксяндзу Яну былі перададзены новыя беларускія выданні.
7. Гэты памятны медаль івянецкія майстры выраблі да адкрыцця свайго новага праваслаўнага храма і падарылі яго ўсім удзельнікам экспедыцыі.
8. Тут пахавана Алаіза Пашкевіч (Цётка). Мемарыял паэтэсы даглядаюць вучні мясцовай школы.

5


7

6

8

Адна на сто працэнтаў

Кім бы вы ні былі ў школе — нават заядлым выдатнікам — хоць бы раз у жыцці вам даводзілася ісці ў школу непадрыхтаваным, апраўдваючыся, што сёння якраз той дзень, калі настаўнік, нарэшце, выкліча суседа па парце. Многія цешылі сябе тым, што ў журнальным спісе іх прозвішча значыцца не ў першых шэрагах і прафесійны запал настаўніка, выпадкова ўчыніўшага «допыт» з прыдзіркамі, ападзе на другіх, менш шчаслівых у гэтым плане вучнях.

А ўявіце сабе такую сітуацыю: у вас няма суседа па парце, а ваша прозвішча займае адначасова і першае, і апошняе месца ў журнальным спісе. Адным словам, вы — адзін вучань у класе, адпаведна кожны дзень вам неабходна быць падрыхтаваным па ўсіх прадметах. Уявіш — аж дрыжыкі бягуць па спіне.

Для адзінаццацікласніцы Дарапеевіцкай школы-садка Валянціны Козел такі расклад падзей — штодзённая рэальнасць. Сама дзяўчына ставіцца да гэтага вельмі разважліва:

— Да таго, што настаўнікі выклікаюць ледзьве не на кожным уроку, я прызвычаілася даўно, яшчэ калі нас у класе было 12 чалавек. Такі, напэўна, у нас, выдатнікаў, лёс, — усміхаецца Валя.

Калі летась 11 яе аднакласнікаў (сярод якіх была і родная сястра) вырашылі развітацца са школай, каб працягнуць вучобу ў сярэдніх спецыяльных навучальных установах, Валя нават не задумалася, ці варта заставацца ў школе і ёй.

— Я ўжо даўно вырашыла: буду паступаць у медуніверсітэт, а для гэтага базавай адукацыі недастаткова. Да таго ж, куды спяшацца з такой прыгожай школы? Два гады таму тут зрабілі капітальны рамонт, сёлета здалі ў эксплуатацыю новую спартыўную залу і атрымалі аўтобус, — разважае дзяўчына.

Зараз 16 школьных прадметаў, якія прадугледжаны праграмай, адзінаццацікласніца будзе вывучаць з настаўнікамі адзін на адзін. Чым табе не рэпетытарства? Праўда, зрабіць пры дапамозе факультатыўных заняткаў акцэнт на такую неабходную пры паступленні біялогію ці хімію ў Валі не атрымаецца. Не дазволена. Як растлумачыў начальнік Маларыцкага раённага аддзела адукацыі Алег Баравік, згодна з правіламі, у сельскай школе факультатыўныя заняткі могуць праводзіцца толькі тады, калі на іх запісалася мінімум тры чалавекі.

— Гэты выпадак бадай што выключны. Згодна з планамі на адзінаццаты клас, дазволена 12 гадзін факультатыўных заняткаў, але з-за адсутнасці неабходнай колькасці вучняў на базе Дарапеевіцкай школы-садка яны праводзіцца не могуць. Размова можа ісці толькі пра пазашкольныя факультатывы: ці дзяўчына будзе ездзіць займацца на факультатыў у суседнюю школу, ці вучні з суседняй школы будуць прыязджаць у Дарапеевічы. Наколькі такая практыка рэальная для вясковай школы, пакуль сказаць не магу, — патлумачыў начальнік раённага аддзела адукацыі.

Настаўнікі Дарапеевіцкай школы-садка ў сваёй вучаніцы не сумняваюцца. Яны вельмі спадзяюцца, што налета ў раённым рэйтынгу паступлення выпускнікоў насупраць Дарапеевіцкай школы-садка будзе стаяць 100 працэнтаў. Бо такая іх Валя — адна, але на ўсе сто працэнтаў.

Аляксандр АЛЕСІК.
Фота аўтара.

Маларыцкі раён.

БЫЎ ПАД МУХАЙ ЗА РУЛЁМ, А ЯГО «ПАГЛАДЗІЛІ ПА ГАЛОЎЦЫ»,
або Чаму асобныя парушальнікі правілаў дарожнага руху выходзяць «сухімі з вады»

Гэтыя падзеі адбываліся ў Калінкавіцкім раёне ў самы апошні дзень мая. Два інспектары ДПС Дзяржаўтаінспекцыі і дружыннік неслі службу на адной з дарог, па якой імчала іншамарка. На павароце ў вёску адзін з іх жэзлам паказаў вадзіцелю: спыніся. Але той толькі паддаў газу сваёй легкавушцы, ігнаруючы ўказанне работнікаў міліцыі, што выклікала падазрэнне ў апошніх. Яны паехалі шукаць неслуха і ўбачылі легкавушку каля сталовай, дзе праходзіла вяселле. Адзін з інспектараў назваў сябе і запатрабаваў у вадзіцеля прад'явіць дакументы на аўтамабіль і вадзіцельскае пасведчанне. Але той нечакана кінуўся наўцёкі, выцягнуўшы з машыны ключ запальвання.

Міліцыянеры — за ім. Уцякач, перакокваючы праз металічную агароджу, спатыкнуўся і ўпаў на празную частку дарогі, дзе і быў затрыманы. Ад яго патыхала спіртным, твар быў пачырванелым, таму яму прапанавалі праехаць у райцэнтр на медыцынскі агляд. Але той пачаў аказваць такое фізічнае супраціўленне, што яму давялося звязаць рукі і толькі потым даставіць у міліцыю, каб устанавіць яго асобу і праверыць на наяўнасць алкаголю ў арганізме. Ён катэгарычна адмовіўся. Тады яго завезлі ў бальніцу з той жа самай прапановай. І тут — катэгарычная адмова. Маўляў, нікому не давяраю, я не п'яны. Пасля ўсяго гэтага быў складзены адпаведны пратакол, і 24-гадовы парушальнік апынуўся ў медыцынскім выцвярэзніку.

А нядаўна адбыўся судовы разгляд гэтай справы, і парушальнік атрымаў штраф у памеры 900 базавых велічынь. А гэта ж ні многа ні мала, а 31 500 000 рублёў! За што такая жорсткая мера пакарання? Аказваецца, патлумачылі нам, былі ўзятыя ў разлік усе «выкрутасы» мужыка на дарогах вобласці. А менавіта: у лютым 2007 года ён быў пазбаўлены права садзіцца за руль аўтатранспарту тэрмінам на 18 месяцаў за тое, што кіраваў сваёй легкавушкай, прыняўшы добрую чарку. Гэтае рашэнне ён праігнараваў і сёлета ў красавіку ў стане алкагольнага ап'янення ноччу выпісваў зігзагі на той жа сваёй іншамарцы. Ад медагляду катэгарычна адмовіўся. Таму, згодна з адпаведным артыкулам Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях, быў арыштаваны на пяць сутак. Прайшло ўсяго сорак дзён — і на табе: зноў п'яны за рулём. А да гэтага, у лістападзе мінулага года, тройчы прыцягваўся да адміністрацыйнай адказнасці як злосны парушальнік правілаў дарожнага руху. Вось за гэты пышны «букет» непавагі і ігнавання закона суд і вынес вышэйпамянёны прысуд.

Летась за паўторнае кіраванне транспартнымі сродкамі ў нецвярозым стане былі ўзбуджаны 204 крымінальныя справы, па якіх асуджаны 151 чалавек. А сёлета за сем месяцаў у Гомельскай вобласці такіх спраў узбуджана ўжо 370 (артыкул 317-1 Крымінальнага кодэкса), 312 з якіх накіраваны ў суд. Абсалютная большасць парушальнікаў атрымала сваё, як гаворыцца ў падобных выпадках.

Аднак нялішне будзе паведаміць і пра тое, што па некаторых крымінальных справах у дачыненні да абвінавачаных прызначаюцца празмерна мяккія меры пакарання, нягледзячы на тое, што з 1 сакавіка мінулага года ўвайшлі ў сілу новыя Кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэннях і Працэсуальна-выканаўчы кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэннях, дзе прадугледжваюцца больш жорсткія меры пакарання асобаў, якія ў стане алкагольнага ап'янення садзяцца за руль.

У чым тут справа? Гутарым з **намеснікам начальніка па выкананні законаў і законнасці прававых актаў пракуратуры вобласці Марыяй ЧАРНАБАЙ.** Яна гаворыць, што пратаколы, якія складаюць работнікі ДАІ, не заўсёды адпавядаюць патрабаванням указаных вышэй кодэксаў. Таму суды неаднаразова вярталі іх для выпраўлення недахопаў. Маюцца выпадкі, калі па віне дзяржінспектараў, якія не прынялі меру па зборы неабходных доказаў, суды наогул спынялі разгляд спраў. Вось толькі адзін канкрэтны прыклад.

Інспектар ДПС АДАІ Жыткавіцкага РАУС В.А. склаў пратакол на вадзіцеля В.К., які ноччу быццам бы кіраваў легкавушкай на аўтадарозе Жыткавічы — Рычаў у стане алкагольнага ап'янення. Аднак той віну не прызнаў і патлумачыў суду, што ён разам з двума сваімі таварышамі вырашылі паехаць да знаёмых дзяўчат у вёску Хачэнь. Па дарозе ў кафэ «Прыпяць» яны з цыганамі выпілі дзве бутэлькі гарэлкі, прычым адзін цыган спіртное не ўжываў. В.К. сеў з адным з таварышаў на задняе сядзенне, а другі — на пярэдняе. Прачнуліся яны ад удару, калі машына з'ехала ў кювет, а той, што быў на пярэднім сядзенні, вылецеў з легкавушкі праз шкло. Больш каля машыны нікога не было.

Пасля аварыі яны пайшлі ў гараж СВК «Рычаўскі», адкуль іх забралі супрацоўнікі міліцыі, і пры апытанні В.К. казаў, што ён за рулём не быў. Тое ж самае сцвярджалі і яго спадарожнікі, аднак інспектар склаў пратакол на яго як уладальніка легкавушкі. Супрацоўнікі ДАІ, якія праводзілі праверку па ўказаным факце, улічваючы ўсе абставіны, не дадумаліся апытаць работнікаў кафэ наконт таго, ці выпівалі гэтыя хлопцы з цыганамі і ці выходзілі тыя з імі з кафэ (бо, магчыма, за рулём знаходзіўся адзін з іх, хто не выпіваў). Адным словам, заблытаная справа, якую суд вымушаны быў спыніць за недаказанасцю.

Таксама па прычыне непрыняцця мераў органамі ДАІ па зборы дастатковых доказаў вінавататасці ва ўчыненні правапарушэння судамі Цэнтральнага і Савецкага раёнаў горада Гомеля і судом Добрушскага раёна былі спынены справы ў дачыненні да В.М., С.Ч. і С.В. Мелі месца выпадкі прыняцця незаконных рашэнняў аб адмове ва ўзбуджэнні крымінальных спраў па фактах паўторана кіравання транспартнымі сродкамі ў стане алкагольнага ап'янення Веткаўскім, Цэнтральным і Чыгуначным РАУС горада Гомеля. І тут нельга не прывесці прыклад, які аб многім гаворыць.

Так, жыхар абласнога цэнтра А.М. пасля таго як атрымаў адміністрацыйнае спагнанне за тое, што «пад мухай» кіраваў сваёй іншамаркай, зноў сеў за руль у такім жа стане і на гэты раз трапіў у аварыю і пашкодзіў машыну. Калі прыехалі супрацоўнікі ДАІ, каля яе ён знаходзіўся адзін у стане алкагольнага ап'янення. І сказаў, што выпіў 250 грамаў гарэлкі пасля аварыі, бо расстроіўся вельмі.

Дазнанне па гэтым факце рабіў участковы інспектар аддзела ўнутраных спраў адміністрацыі Чыгуначнага раёна І.Б., які прыняў за аснову яго тлумачэнні і... вынес пастанову аб адмове ва ўзбуджэнні крымінальнай справы. Аднак пры вывучэнні гэтага матэрыялу было ўстаноўлена, што праверка па паведамленні ДАІ наогул не праводзілася і дзейсных мераў для выяўлення віны вадзіцеля ва ўчыненні злачынства прынята не было. Не ўстаноўлена і дакументальна не пацверджана, калі А.М. глынуў спіртнога: да здарэння ці пасля яго. Лабараторныя даследаванні мачы і крыві вадзіцеля пры дастаўцы яго ў наркалагічны дыспансэр да матэрыялаў праверкі прыкладзены не былі. Не праводзіліся іншыя пазваночныя матэрыялы. Таму пракуратура вобласці вышэйпамянёную пастанову ўчастковага інспектара адмяніла, і праверка была адноўлена з дачай неабходных пісьмовых указанняў. Тое ж самае было і па Веткаўскім РАУС і аддзеле ўнутраных спраў адміністрацыі Цэнтральнага раёна Гомеля.

Пры разглядзе спраў аб адміністрацыйных парушэннях судамі парушаўся ўстаноўлены законам 15-дзённы тэрмін разгляду спраў. Адсутнічала адзіная практыка пры прызначэнні судамі дадатковага адміністрацыйнага спагнання ў выглядзе пазбаўлення права кіравання транспартным сродкам.

Гэтыя і іншыя факты сведчаць аб тым, што, прыцягваючы асобных грамадзян да адказнасці за кіраванне транспартнымі сродкамі ў стане ап'янення, праваахоўныя органы і суды не выконвалі ў належнай меры патрабаванні дзеючага заканадаўства, не праяўлялі часам патрэбнай прынцыповасці ў гэтым пытанні, дапускалі валакіту. Органы пракуратуры неаднаразова прыносілі пратэсты ў парадку нагляду, якія былі задаволены.

Гэтыя пытанні абмяркоўваліся на каардынацыйнай нарадзе кіраўнікоў праваахоўных органаў вобласці і судоў па ініцыятыве пракуратуры ў свеце патрабаванняў Дырэктывы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Аб мерах па ўмацаванні грамадскай бяспекі і дысцыпліны».

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

Рэпартаж з колаў

Нам цікава, што вам цікава

Таму і адпраўляюцца ў час падпіскі журналісты «Звязды» ў камандзіроўкі па раёнах, ладзяць сустрэчы з чытачамі — не столькі дзеля агітацыі, колькі дзеля таго, каб зірнуць адзін аднаму ў вочы, асабіста пазнаёміцца з пастаяннымі карэспандэнтамі ці проста актыўнымі, неабыякавымі, вернымі сябрамі газеты. Знайсці на месцы новыя тэмы. Даведацца, што ў газеце найбольш цікавіць, а чаго не стае чытачам. Заўвагі паслухаць — таксама карысная справа… А ўжо калі ехаць не з пустымі рукамі — місія ўдвая больш прыемная.

Менавіта яе звяздоўскі дэсант выконваў на гэтым тыдні, накіраваўшыся на Гродзеншчыну. І хоць напачатку падарожжа наша напамінала заплыў, а рэдакцыйная «Волга» — глыбакаводную субмарыну, настрой гэта нікому не сапсавала. Мы адчувалі сябе гэткімі казачнымі памочнікамі Дзеда Мароза з няхай і не самым вялікім, але мехам падарункаў. І першы з іх з задавальненнем завезлі **ў Івянец** — тут у аддзяленні паштовай сувязі рупліва і адказна працуе **Таццяна Міхайлаўна ЧЫШЭВІЧ**, якая стала прызёрам конкурсу, што праводзіць «Звязда» сярод паштальёнаў. Яна пацвердзіла даўняе назіранне: хоць і цяжкавата цяпер, асабліва ў сезон падпіскі работ, ідзе падпіска, але тыя, хто аднойчы выбраў сваёй газетай «Звязду», як правіла, ад яе не адмаўляюцца. А Таццяна Міхайлаўна, як і многія іншыя паштальёны, робіць усё, каб сустрэча газеты з чытачамі адбывалася своечасова і пастаянна. Спадзяёмся, што насценны гадзіннік з фірменным лагатыпам «Звязды» будзе ісці хвіліна ў хвіліну і таксама дапаможа цяперашняй прызёрцы заўжды ўсё паспяваць у час.

Пры непасрэдным садзейнічанні раённай адміністрацыі знайшоўсваю гаспадыню і настольны гадзіннік з сімволікай «Звязды». Яго выйграла ў нашай рэкламнай гульні жыхарка **вёскі Старая Спуша Шчучынскага раёна Нэлія Паўлаўна БАДАК**. Не сёння—заўтра атрымае звяздоўскую майку — і нашы найлепшыя пажаданні, натуральна — **Іван Феліксавіч Дзенюш з вёскі Быстрыцы Астравецкага раёна**. А вось вялікі прыз — сучасны тэлевізар «Віцязь» — мы перадалі асабіста ў рукі **Каэтану Іванавічу Пазлевічу**, які прыехаў у райвыканкам на сустрэчу з журналістамі **з вёскі Завідзіненты**. Дакладней, прыехалі: кампанію гаспадару склалі жонка і нявестка. І ўсе гаварылі многа добрых слоў пра нашу газету; а пра сваё жыццё-быццё — чамусьці менш і больш сціпла. Але потым першая няёмкасць прайшла — усё ж мы не чужыя, з газетай сям'я сябруе без малога чвэрць веку!

Якія толькі спецыяльнасці ні асвоіў Каэтан Іванавіч за калгаснае жыццё — і конюх, і механік, і трактарыст… Вось трактарыстам якраз і адпрацаваў 27 гадоў. Крыху менш чытае «Звязду» — прыкладна з перабудовы. «Спачатку мы выпісвалі іншае выданне, а потым ці то газета перастала выходзіць, ці не спадабалася — перайшлі на «Звязду». І неяк адразу звыкліся, так што цяпер не ўяўляем нават, як гэта — дзень без газеты, — расказала жонка Каэтана Іванавіча. — Спачатку гаспадар прачытае ўсё дачыста, не прапусціць ні анекдоты, ні афіцыйныя звесткі, ні парады па садзе—агародзе, а потым ужо астатнім дазваляецца ўзяць газету». Калі ж мы паспрабавалі ўдакладніць, што Пазлевічам найбольш падабаецца чытаць, сям'я толькі пераглянулася ды плячыма паціснула: усё як ёсць!

Дарэчы, зноў-такі падчас гэтай сустрэчы мы атрымалі доказ: падае снарад у адну варонку двойчы, яшчэ як падае! Каэтан Іванавіч і ранейшчынай работы Астравецкага раённага выканкама Тэрэса Браніславаўна ПАМЕЦЬКА стольмі ведае пра «Звязду», што прыз віктарыны — насценны гадзіннік — трапіў дакладна па адрасе; сям'я Пазлевічаў атрымала свой прыз ва ўрачыстай абстаноўцы ў зале пасяджэнняў райвыканкама.

На здымках: галоўны спецыяліст аддзела ідэалагічнай работы Астравецкага райвыканкама Тэрэса Браніславаўна ПАМЕЦЬКА стольмі ведае пра «Звязду», што прыз віктарыны — насценны гадзіннік — трапіў дакладна па адрасе; сям'я Пазлевічаў атрымала свой прыз ва ўрачыстай абстаноўцы ў зале пасяджэнняў райвыканкама.

Жыллё маё!

МІНСКІЯ КВАТЭРЫ ПАЧАЛІ ДАРАЖЭЦЬ

Прыкладна з пачатку верасня на другасным рынку сталічнага жылля назіраецца тэндэнцыя стабілізацыі цэнаў на кватэры, а па асобных сегментах жыллёвай нерухомасці — іх невялікае падаражэнне. Як вядома, на працягу апошніх васьмі месяцаў кватэры ў Мінску толькі таннелі, а тут… Аб якой сітуацыі ў сферы кватэрнай нерухомасці ў сталіцы ідзе гаворка? Сваімі меркаваннямі на гэты конт падзяліўся старшыня Савета Беларускай асацыяцыі «Нерухомасць» Мікалай ПРАСТАЛУПАЎ.

Фота Пятра ФАМІНА.

Істотнага падаражэння жылля не будзе

Менавіта на тры восеньскія месяцы Саўмінам краіны быў уведзены павышальны каэфіцыент 1,44 да тарыфных ставак падрадных будаўнічых арганізацый, занятых на аб'ектах жыллёвага будаўніцтва.

Спецыялісты Мінбудархітэктуры паведамілі рэдакцыі, што новы механізм аплаты працы будаўнікам можа выклікаць падаражэнне будаўніцтва жылля ў Беларусі прыкладна на 10—12 працэнтаў. Разам з тым асобныя незалежныя эксперты ўпэўнены, што ў сувязі з новымі тарыфамі на грузаперавозкі і павелічэннем цэнаў на будматэрыялы, падаражэнне сабекошту будаўніцтва жылля можа дасягнуць 15—18 працэнтаў. Няўжо ўдзельнікі другаснага рынку сталічнай жыллёвай нерухомасці імгненна адрэагавалі на гэтую навіну?

Сабекошт квадратнага метра жылля ў МАПІДа сёння складае каля 600 долараў, у камерцыйных забудоўшчыкаў — 1000—1200 долараў

На думку Мікалая Прасталупава, памер заробкаў радавых будаўнікоў увогуле ніяк не адгукнецца на цэнавых тэндэнцыях на другасным рынку кватэр у Мінску. Паводле слоў суразмоўцы, сабекошт квадратнага метра жылля ў МАПІДа сёння складае каля 600 долараў, у камерцыйных забудоўшчыкаў — 1000—1200 долараў. Магчыма, наватэндэнцыя на заробках павялічыць сацыяльны сабекошт жыллёвага «квадрата» да 700 долараў, а камерцыйнага метра — да 1400 долараў. Новая працэнтоўка па сабекошце «маладых» кватэр на другасны рынак у бліжэйшы час увогуле не паўплывае, лічыць Мікалай Прасталупаў. Справа ў тым, што камерцыйныя арганізацыі ўжо на працягу 4—6 месяцаў беспаспяхова спрабуюць прадаць кватэры ў новых дамах па кошце 1800—2000 долараў за квадратны метр. Сёння ў новых мікрараёнах Мінска стаіць ужо 5 такіх паўпустых дамоў, на кватэры якіх попыт увогуле амаль адсутнічае. Спадар Прасталупаў упэўнены, што ў радавых жыхароў Мінска проста няма сёння такіх вялікіх грошай і адпаведных заробкаў для набыцця стандартнага, але даволі дарагога новага жылля.

Невялікае падаражэнне выклікана сезоннай актывізацыяй пакупнікоў

Згодна з табліцай статыстыкі інфармацыйнага каталога рэспубліканскага выдання «Нерухомасць Беларусі», сярэдні кошт квадратнага метра агульнай плошчы аднапакаёвых кватэр Мінска складае цяпер 1976 долараў. Атрымліваецца, што сярэдні кошт «аднапакаёвак» за апошнія два тыдні падаражэў прыкладна на 15 долараў. Тут трэба адзначыць, што ў статыстыцы ўлічваюцца і даволі дарагія кватэры ў элітных дамах, а таксама ў цэнтры сталіцы, дзе жыллё амаль увогуле не таннела за ўвесь мінулы год. Мікалай Прасталупаў упэўнены, што квадратны метр жылля ў стандартных дамах спальных раёнаў каштуе сёння ў межах 1820—1870 долараў. Менавіта гэты рэальны цэннік на жыллёвы «квадрат» у Мінску пачынае крыху павялічвацца. Чаму?

Паводле інфармацыі экспертаў жыллёвай нерухомасці, на другасным рынку сталіцы па сегменце прапановы прысутнічае каля 8,5 тысячы кватэр. За месяц у Мінску прадаецца прыкладна 500 кватэр, але амаль такая ж колькасць жылых памяшканняў зноў трапляе на рынак. Колькасць рэальных здзелак па набыцці жылля застаецца амаль нязменнай. Цяпер назіраецца актывізацыя патэнцыяльных пакупнікоў па праглядзе кватэр. Восенню кватэрамі сталі больш цікавіцца менавіта тыя кліенты, якім жыллё сапраўды патрэбна. Адна справа, калі нейкай кватэрай за лета не цікавіўся ўвогуле ніхто, а тут за два тыдні памяшканне праглядзелі ажно два ці тры кліенты. Вядома, што тады прадаўцы пачынаюць карэкціраваць першапачатковы кошт у бок павелічэння.

Цяпер прыкметай часу стала тое, што за апошнія 3—4 месяцы з базы даных прапаноў небагатымі пакупнікамі былі «вымытыя» маленькія па плошчы танныя адна- і двухпакаёвыя кватэры. Так, калі яшчэ ў ліпені магчыма было адшукаць слабенькую кватэру за 53—54 тысячы долараў, то цяпер мінімальны цэннік на такіх кватэрах пачынаецца з 57—59 тысяч долараў.

З другога боку, малапакаёвыя кватэры з вялікай агульнай плошчай у новых далёкіх мікрараёнах, дзе адсутнічае патрэбная інфраструктура, увогуле застаюцца «вісець» нават пры кошце каля 1700—1750 долараў за квадратны метр.

Да сярэдзіны снежня кватэры будуць даражэць

Мікалай Прасталупаў лічыць, што кватэры ў Мінску будуць нязначна даражэць на працягу бліжэйшых трох з паловай месяцаў. Павелічэнне цэнаў будзе невялікім, прыкладна ў памеры існуючай у краіне інфляцыі. Спецыяліст упэўнены, што кватэры да новага года падаражэюць не больш чым на 7—10 працэнтаў. Наш суразмоўца разлічвае, што прыкладна з гэтага часу ў краіне павінен актыўна запрацаваць механізм долевага будаўніцтва. Эксперты падлічылі, што дадзены алгарытм узвядзення жылля будзе каштаваць для масавага забудоўшчыка ў межах 1500—1600 долараў за квадратны метр. Калі гэта адбудзецца, то і на другасным рынку сталіцы кватэры пачнуць хутка таннець.

Сяргей КУРКАЧ.

ЛАЎРЫНОВІЧ
Міхаіл Фёдаравіч

9 верасня 2008 года на 79-м годзе жыцця пасля цяжкай хваробы памёр гаваровы грамадзянін г. Мінска, заслужаны машынабудаўнік Беларускай ССР, былы генеральны дырэктар вытворчага аб'яднання «БелаўтаМАЗ» Лаўрыновіч Міхаіл Фёдаравіч.

Пайшоў з жыцця адзін з арганізатараў айчыннага аўтамабілебудавання, кіраўнік найвышэйшага прафесійнага ўзроўню.

М.Ф. Лаўрыновіч нарадзіўся 1 снежня 1929 года ў пасёлку Цялуша Бабруйскага раёна Магілёўскай вобласці. У 1950 годзе скончыў Мінскі аўтамеханічны тэхнікум, а затым без адрыву ад вытворчасці — Беларускі політэхнічны інстытут. Асабліва яркі яго прафесійны талент і чалавечыя якасці праявіліся ў перыяд работы на Мінскім аўтамабільным заводзе ВА «БелаўтаМАЗ» (1950—1994), дзе ён прайшоў шлях ад наладчыка да генеральнага дырэктара, а таксама ў якасці старшыні Беларускай навукова-прамысловай асацыяцыі (1994—2000).

М.Ф. Лаўрыновіч актыўна ўдзельнічаў у грамадска-палітычным жыцці дзяржавы і рэспублікі, неаднаразова выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР і СССР, членам ЦК КПБ. Ён валодаў прыроднай мудрасцю, высокім інтэлектам і дарам прадбачання. Для выпрацоўкі мераў па захаванні нацыянальнай прамысловасці Беларусі ў перыяд развалу Саюза ў 1990 годзе пад яго кіраўніцтвам была створана Беларуская навукова-прамысловая асацыяцыя — першае грамадскае аб'яднанне прамыслоўцаў Беларусі. У 1993 годзе пры яго ўдзеле створана Беларуская канфедэрацыя прамыславікоў і прадпрымальнікаў.

Міхаіл Фёдаравіч добра ўсведамляў неабходнасць захавання інтэграцыйных сувязяў. Ён унёс значны ўклад у развіццё прамысловапрадпрымальніцкага руху не толькі ў Беларусі, а і на ўсёй постсавецкай прасторы, ва ўмацаванне адносінаў эканамічнага і чалавечага супрацоўніцтва паміж краінамі і народамі. М.Ф. Лаўрыновіч стаяў ля вытокаў стварэння Навукова-прамысловага саюза СССР, Міжнароднага Кангрэсу прамыслоўцаў і прадпрымальнікаў, ААТ «Пріорбанк».

Заслугі М.Ф. Лаўрыновіча адзначаны многімі ордэнамі і медалямі. Яму прысвоены званні лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР, заслужаны машынабудаўнік рэспублікі, Ганаровы грамадзянін горада Мінска.

Ад імя членаў БНПА, усяго прамыслова-прадпрымальніцкага супольніцтва Рэспублікі Беларусь выказваем шчырыя спачуванні родным і блізкім, сябрам і калегам Міхаіла Фёдаравіча Лаўрыновіча. Светлая памяць аб ім назаўсёды застанецца ў нашых сэрцах.

Савет РГА «БНПА».

С.С. СІДОРСКІ, Г.В. НАВІЦКІ, В.А. ПАПОЎ, У.У. МАКЕЙ, П.П. ПРАКАПОВІЧ, У.І. СЯМАШКА, В.П. БУРА, Л.В. АНФІМАЎ, С.М. ЗАБАЛОЦЕЦ, М.У. МЯСНІКОВІЧ, У.М. БЕЛАХВОСТАЎ, П.М. СЯМАШКА, А.М. РУСЕЦКІ, М.П. ЗАЙЧАНКА, М.І. АЗАМАТАЎ, М.Я. ПАЎЛАЎ.

Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь глыбока смуткуе ў сувязі са смерцю былога генеральнага дырэктара Мінскага аўтамабільнага завода вытворчага аб'яднання «БелаўтаМАЗ», заслужанага машынабудаўніка Рэспублікі Беларусь Міхаіла Фёдаравіча ЛАЎРЫНОВІЧА і выказвае шчырыя спачуванні родным і блізкім нябожчыка.

Беларуская навукова-прамысловая асацыяцыя з глыбокім жалем паведамляе, што **9 верасня 2008 года** на **79-м годзе жыцця** пасля цяжкай хваробы пайшоў з жыцця **заснавальнік і ганаровы старшыня асацыяцыі Міхаіл Фёдаравіч ЛАЎРЫНОВІЧ**. Перастала біцца сэрца сапраўднага патрыёта нашай роднай Беларусі.

Усё жыццё Міхаіла Фёдаравіча з'яўляецца яркім прыкладам мужчынскай высакародначасці і годнасці, высокапрафесійнага і адданага служэння выбранай справе.

Міхаіл Фёдаравіч нарадзіўся 1 снежня 1929 года ў в. Цялуша Бабруйскага раёна Магілёўскай вобласці. У 1950 годзе закончыў Мінскі аўтамеханічны тэхнікум, а затым без адрыву ад вытворчасці — Беларускі політэхнічны інстытут. Асабліва яркі яго прафесійны талент і чалавечыя якасці праявіліся ў перыяд работы на Мінскім аўтамабільным заводзе ВА «БелаўтаМАЗ» (1950—1994), дзе ён прайшоў шлях ад наладчыка да генеральнага дырэктара, а таксама ў якасці старшыні Беларускай навукова-прамысловай асацыяцыі (1994—2000).

М.Ф. Лаўрыновіч актыўна ўдзельнічаў у грамадска-палітычным жыцці дзяржавы і рэспублікі, неаднаразова выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР і СССР, членам ЦК КПБ. Ён валодаў прыроднай мудрасцю, высокім інтэлектам і дарам прадбачання. Для выпрацоўкі мераў па захаванні нацыянальнай прамысловасці Беларусі ў перыяд развалу Саюза ў 1990 годзе пад яго кіраўніцтвам была створана Беларуская навукова-прамысловая асацыяцыя — першае грамадскае аб'яднанне прамыслоўцаў Беларусі. У 1993 годзе пры яго ўдзеле створана Беларуская канфедэрацыя прамыславікоў і прадпрымальнікаў.

Міхаіл Фёдаравіч добра ўсведамляў неабходнасць захавання інтэграцыйных сувязяў. Ён унёс значны ўклад у развіццё прамысловапрадпрымальніцкага руху не толькі ў Беларусі, а і на ўсёй постсавецкай прасторы, ва ўмацаванне адносінаў эканамічнага і чалавечага супрацоўніцтва паміж краінамі і народамі. М.Ф. Лаўрыновіч стаяў ля вытокаў стварэння Навукова-прамысловага саюза СССР, Міжнароднага Кангрэсу прамыслоўцаў і прадпрымальнікаў, ААТ «Пріорбанк».

Заслугі М.Ф. Лаўрыновіча адзначаны многімі ордэнамі і медалямі. Яму прысвоены званні лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР, заслужаны машынабудаўнік рэспублікі, Ганаровы грамадзянін горада Мінска.

Ад імя членаў БНПА, усяго прамыслова-прадпрымальніцкага супольніцтва Рэспублікі Беларусь выказваем шчырыя спачуванні родным і блізкім, сябрам і калегам Міхаіла Фёдаравіча Лаўрыновіча. Светлая памяць аб ім назаўсёды застанецца ў нашых сэрцах.

Савет РГА «БНПА».

Саюзу журналістаў Беларусі — 50!

ПРА ТОЕ, АБ ЧЫМ ПОМНІЦЦА…

Неўзабаве Саюз журналістаў Беларусі адзначыць свой 50-гадовы юбілей.

Першым старшынёй праўлення Саюза журналістаў БССР быў абраны Фёдар Ягоравіч Кляцкой. Даваенны журналіст, франтавік, дырэктар БелТА. У журналісцкім асяродку карыстаўся павагай.

Пры Саюзе журналістаў рэспублікі праз нейкі час стварылі студыю «Фота і жыццё», сталі выдаваць рознага роду альбомы — пра гераіву вайны і працы, вядомых беларускіх дзеячаў, безумоўна, «хадавую» літаратуру прапагандысцкага плана. Напрыклад, пра беларускія пяцігодкі, нават аб агрэсіўнасці палітыкі НАТА. А наша журналісцкая студыя стала зарабляць грошы. Можна было больш актыўна брацца за ажыццяўленне задуманай і падтрымліваемай кіраўніцтвам ідэі стварэння планавай падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі журналісцкіх кадраў у рэспубліцы. Настойліва, паступова ў рэспубліцы складвалася пэўная сістэма падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі журналісцкіх кадраў. Аддзяленне журналістыкі БДУ было пераўтворана ў факультэт журналістыкі. На базе Мінскай вышэйшай школы пры ЦК КПБ былі арганізаваны месячныя курсы рэдактараў раённых, аб'яднаных і шматтыражных газет. Пачалася практыка загадчыкаў аддзелаў раённых і аб'яднаных газет пры рэдакцыях вядучых рэспубліканскіх газет, а літаратурных супрацоўнікаў — пры рэдакцыях абласных газет. У аддзеле прапаганды і агітацыі ЦК КПБ аналізаваліся штогадовыя планы абкамаў партыі, Саюза журналістаў па арганізацыі журналісцкай вучобы. Яны ахоплівалі ў сваёй аснове ўсе журналісцкія прафесіі — ад літаратурнага супрацоўніка да фотакарэспандэнта.

Асаблівая ўвага надавалася семінарам па спецыялізацыі журналісцкага майстэрства. Аднойчы мы сабралі ў Гродне ўсіх журналістаў рэспублікі, якія пішуць на сельскагаспадарчыя тэмы. Гродзенская вобласць тады лідзіравала ў развіцці сельскагаспадарчай вытворчасці. Перад журналістамі выступіў сакратар Гродзенскага абкама партыі па сялу Гордзікаў, вядомы на ўсю рэспубліку энтузіяст сваёй справы. А потым на некалькіх аўтобусах семінар скіраваўся ў напрамку Мінска, заязджаючы на пэўныя сельскагаспадарчыя аб'екты — перадавыя калгасы і саўгасы, фермы. З іх кіраўнікамі было дамоўлена аб тых сустрэчах, каб не з трыбуны, а наглядна, на месцы, у полі і на ферме весці зацікаўленую размову. Такая паездка заняла ўвесь тыдзень. Семінар закончыўся гутаркай з сакратаром ЦК КПБ па сельскай гаспадарцы Уладзімірам Міцкевічам. Кожны з удзельнікаў семінара абавязваўся выступіць у сваім выданні з публікацыяй на тэму, якая больш за ўсё пераканала.

Нашай работай у гэтым кірунку зацікавіліся ў ЦК КПСС. У сектары газет адбылася нарада на якой з паведамленнямі выступіў прадстаўнік Ленінградскага абкама партыі і ад Беларусі — я, загадчык сектара друку, выдавецтваў і паліграфіі, як тады афіцыйна значылася мая пасада. Ленінградзец больш «націскаў» на тэорыю і будучыя планы, я ж — на канкрэтыку, на тое, што ўжо зроблена ў рэспубліцы, спасылаючыся на пэўную сістэму ў гэтай рабоце, якая была абазначана ў двух пастановах ЦК КПБ: «Аб паляпшэнні падрыхтоўкі журналістаў і паліграфістаў у рэспубліцы» і «Аб арганізацыі перападрыхтоўкі журналістаў мясцовага друку». А ў давяршэнне паведаміў, што ЦК КПБ і Савет Міністраў устанавілі Дзяржаўную прэмію па журналістыцы, лепшым журналістам прысвойваецца ганаровае званне «Заслужаны дзеяч культуры БССР», якое потым было заменена на званне «Заслужаны работнік культуры БССР».

Вопыт нашай работы ў Беларусі ў гэтым накірунку стаў прапагандавацца ў цэнтральнай прэсе. Спачатку я выступіў з артыкулам на гэту тэму ў часопісе «Советская печать», які рэдагаваў Падкуркаў. А потым па просьбе рэдактара часопіса «Журналист» Ягора Якаўлева падрыхтаваў артыкул, адным з аўтараў якога я яшчэ дабавіў старшыню праўлення Саюза журналістаў БССР Фёдара Кляцкова. Бо найпершым абавязкам гэтай арганізацыі і з'яўляўся самы актыўны ўдзел у вучобе журналісцкіх кадраў, у тым ліку ў яе фінансаванні.

У Пятра Міронавіча, які замяніў на пасадзе першага сакратара ЦК КПБ К.Т. Мазурава, якраз пачыналася зорная гадзіна. Эканоміка ў рэспубліцы па сваіх выніках прагэсавала. Вялося будаўніцтва многіх прадпрыемстваў з вялікай будучыняй, актывізавалася навука. А галоўнае — П.М. Машэраў, падлічаўшы магчымасці, смела павёў рэй на круты ўздым усіх галін сельскай гаспадаркі, на ўзбуйненне жывёлагадоўчых фермаў, на атрыманне на нашых, раней неўрадлівых глебах, па 30—40 цэнтнераў збожжа з гектара. А чаму б і не: мінеральныя ўгнаенні — свае, аргатычных таксама хапае, трактары, аўтамабілі — свае, вучоныя-сельгаснікі — свае. І добра дысцыплінаваныя кадры, «адшліфоўку» якіх пачынаў Кірыла Трафімавіч Мазураў, а працягваў Машэраў. Ён бачыў, як хто працуе, і сам паказваў прыклад. Працаваць Машэраў, усім вядома, любіў.

І жыццё віравала. Так, менавіта віравала. Рэспубліка нагадвала агромністую будоўлю, з кожным днём мяняючы сваё аблічча. Край станавіўся індустрыяльным, абыходзіў сваіх суседзяў па ўраджайнасці калгасных палёў, пераводзіў таксама на індустрыяльную аснову і жывёлагадоўлю. Шчыра хацелася ўдзельнічаць у такім стваральным рытме. Машэраў праводзіў інспектарскія агледзіны па абласцях. Такія наведванні не нагадвалі славутыя пацёмкінскія вёскі. Гэта была вучоба. Спрацоўвала народная мудрасць: ідзі і глядзі. Лепей адзін раз убачыць, чым сто разоў пачуць.

Праўленне Саюза журналістаў БССР арганізоўвала конкурсы рэдакцый на лепшае асвятленне розных гаспадарчых кампаній, у тым ліку і шэфскай работы. «Звязда» неаднаразова выходзіла пераможцай у гэтых конкурсах. Мне як рэдактару падабалася адчуваць сябе маючым дачыненне да такой стваральнай працы, як гаварылася тады, зноў быць на першай лініі змагання.

…Тэлефанаваў віцэ-прэзідэнт Акадэміі навук Беларусі Уладзімір Аляксеевіч Белы: «У Гомелі распачата будаўніцтва цэха па выпуску вырабаў з дрэвашклапластыку. Хачу павіншаваць і газету з гэтым поспехам» А перадгісторыя гэтаму такая. Некалькі гадоў таму ў рэдакцыю «Звязды» звярнуўся той жа Белы, які тады працаваў дырэктарам акадэмічнага інстытута металапалімерных сістэм. «У нас ёсць цікавая распрацоўка, але шырокае ўкараненне яе зацягваецца. Ці можа «Звязда» дапамагчы вучоным?» У Гомель выехаў наш карэспандэнт. Высветлілася, што супрацоўнікамі інстытута створаны новы матэрыял — дрэвашклапластык, які шмат дзе можа замяніць метал. Між тым вырабляецца ён з адходаў дрэваапрацоўчай і хімічнай прамысловасці. Аднак месніцкі падыход тармазіў укараненне навінкі — ведамствы стараліся «спіхнуць» клопаты па ўкараненні вырабаў на плечы іншых. Газета выступіла востра, у тым ліку з адрас Дзяржплана, Дзяржснаба. «Звязда» ўзяла шэфства над распрацоўкай і ўкараненнем у практыку новых матэрыялаў на аснове паслімераў. Спрыяла таму, што было выдзелена некалькі мільёнаў рублёў на будаўніцтва гэтага вялікага цэха. А потым не давала спакою будаўнікам, пакуль цэх не запрацаваў.

Мы актыўна асвятлялі на старонках газеты тэму «Беларускі лён». Гэта была сур'ёзная размова — чаму не ладзіцца справа ў адной з найважнейшых у рэспубліцы галін. Зацікаўленых у размове аказалася нямала. І мы стварылі пры рэдакцыі рэспубліканскі экспертны савет па лёну, у склад якога ўвайшлі работнікі Дзяржплана, Міністэрства сельскай гаспадаркі, аб'яднання «Белільновалакно», Дзяржкамсельгастэхнікі, вучоныя навукова-даследчых устаноў, вопытныя аграномы, механізатары, ільнаводы. Душой гэтай тэмы быў супрацоўнік «Звязды» Аляксандр Шагун. На старонках газеты аналізавалася работа як адстаючых гаспадарак, так і перадавых ільнаводаў. Пасяджэнні экспертнага савета праводзіліся з выездам на месца. Як адзначыў саюзны часопіс «Лён и конопля», дзякуючы прынцыповаму падыходу экспертнага савета і рэдакцыі, у рэспубліцы нарэшце было вырашана пытанне аб эфектыўным выкарыстанні магутнасцяў па прамысловай выпрацоўцы тресты. Да 1982 г. тут не выкарыстоўвалі іх і напалавіну. «Звязда» шэфствавала над выпускам кормаўборачнага камбайна «КСК-100», над меліярацыяй Палесся.

Напярэдадні 30-годдзя Перамогі ў Мінску адбылася ўжо міжнародная сустрэча журналістаў. З'ехаліся прадстаўнікі з усіх саюзных рэспублік і сацыялістычных краін. Адкрыў урачыстасць старшыня праўлення Саюза журналістаў СССР галоўны рэдактар «Правды» Міхаіл Васільевіч Зімянін. Міхаіл Васільевіч, нягледзячы на занятасць, землякоў-журналістаў не цураўся. Я разы са два да гэтага з групай беларускіх журналістаў пабываў у яго праўдзісцкім кабінеце. Рухавы, жвавы, ён і на новай пасадзе мог даць разумную параду. У час апошняй сустрэчы нагадалі пра ініцыятыву мінчан, якую мы збіраліся вось-вось укараніць. Размова ішла аб тым, каб замацаваць за кожным ветэранам журналістыкі групу яго маладых калег, і каб той павучаў іх розуму. Карацей кажучы, стваралі вось такія камерныя школы журналісцкага майстэрства. «Воля ваша, але я не раіў бы вам гэтага рабіць. Чым адрозніваецца талковы журналіст? У першую чаргу нестандартным позіркам на звычайныя з'явы, не кажучы ўжо пра ўменне бачыць навізну, што прабіваецца ў жыццё, у нашу свядомасць. Вы, мабыць, адразу ж набудзеце штампы, хоць і заслужаных, але ўжо «выпрацаваных журналістаў». Пасля такой парады мы больш не вярталіся да гэтай ініцыятывы, шукалі іншыя падыходы да набыцця маладымі журналістамі прафесійнага майстэрства.

Але вернемся да той журналісцкай сходкі ў Мінску. Цёпла ўспрынялі яе ўдзельнікі выступленне П.М. Машэрава. Нават надзвычай цёпла: Пятра Міронавіча паважала ўся краіна. Давялося Машэраву па запрашэнні рэдкалегіі выступіць у часопісе «Журналист» з грунтоўным артыкулам-роздумам, якім павінен быць журналіст.

Ціхана Якаўлевіча Кісялёва, які стаў пасля Машэрава першым сакратаром ЦК КПБ, ведалі ўсе як адметнага дзяржаўнага кіраўніка, выдатнага гаспадарніка, развазліваганага эканаміста. Асабістыя ўклад яго ў бурнае развіццё эканамічнага патэнцыялу рэспублікі бясспрэчны, ды і як чалавек ён здаваўся прывятлівым і эрудзіраваным. Іншы раз тэлефанаваў мне ў рэдакцыю: «Я да вас не як да рэдактара, а як старшыня да старшыні», — жартаўліва пачынаў Кісялёў. «Так, — падключаўся я пад жартаўлівы тон размовы. — Сапраўды старшыні, толькі ў розных вагавых катэгорыях…» Як старшыня праўлення Саюза журналістаў БССР я многа старання праяўляў, каб неяк палегчыць праблему з выдзяленнем жылля для журналістаў. А іх у рэспубліцы было каля 3000, асноўная частка працавала ў рэдакцыях у Мінску. Ад імя сакратарыята Саюза журналістаў БССР пісалі ў ЦК, Савет Міністраў БССР. І Ціхан Якаўлевіч, які тады быў Старшынёй Савета Міністраў БССР, здорава нас падтрымліваў. Напярэдадні новага 1978 г. ён падпісаў пастанову Савета Міністраў БССР № 410 «Аб прадастаўленні членам Саюза журналістаў БССР права карыстання дадатковай жылой плошчай».

Вось тэкст пастановы: «Прадастаўляць членам Саюза журналістаў БССР права карыстання дадатковай жылой плошчай у выглядзе асобнага пакоя. А пры адсутнасці асобнага пакоя — дадатковай жылой плошчай у памеры 20 квадратных метраў». І доўга дзейнічала кісялёўская пастанова. З членаў саюза журналістаў рэспублікі не спаганялася плата ў казну з тых 20 квадратных метраў як з дадатковых.

Мы насіліся з ідэяй будаўніцтва ў Мінску вялікага жылога дома для журналістаў. Шукалі сродкі як у Маскве, у Саюзе журналістаў СССР, так і Дзяржплане БССР. А як стваралі студыю «Фота і жыццё», то сапраўды багатымі сталі. А вось з лімітамі было складана. Зноў дапамог Кісялёў. «Вашы грошы — звычайныя паперкі. І дом вялікі не трэба будаваць, многа жылля ў вас у такім выпадку адбяруць — па закону трэба выдзяляць пэўны працэнт гораду, вайскоўцам і г. д. Вы лепей купляйце жыллё ў гарвыканкама, выдзяляйце прыкладна 300 тысяч рублёў на год. Я такую каманду кіраўнікам Мінска выдам». Так і зрабіў шаноўны Ціхан Якаўлевіч. За кошт сродкаў саюза было пабудавана і выдзелена для тых , хто меў у гэтым вострую патрэбу, у 1976 — 1979 гг. 27 новых добраўпарадкаваных кватэр і ў 1981 г. — 10 кватэр. 17 журналісцкіх сем'яў палепшылі свае жыллёвыя ўмовы за кошт паўторнага засялення. І так — штогод у далейшым. Гэта, вядома, звыш таго жылля, якое журналісты атрымлівалі ў законным парадку па чэргах у райвыканкамах.

На пачатку 1982 г. склікаўся шосты з'езд Саюза журналістаў рэспублікі. На з'езд было абрана больш як 500 дэлегатаў. Прыехалі госці з Масквы, Украіны, Літвы.

Я доўга карпеў над дакладам, дапрацоўваў яго дома і ў апошнюю ноч перад з'ездам. Апоўначы на кватэру патэлефанаваў памочнік першага сакратара журналіст Іван Іванавіч Клішын. «Дык ты ведаеш пра ЧП?» Яшчэ чаго мне не хапала! «У запрашальным білеце, які перадалі першаму, у яго прозвішчы дапушчана памылка». Я ўз'еўся на Івана: «І ты мне гэтым глупствам псуеш настрой на ноч? Кісялёў бачыў?» — «Так, гэта ён мне і сказаў». Наш запрашальны білет не меў выгляду: на звычайнай паперы, без аніякага глянцу. Проста забыліся заказаць у друкарні…

Паколькі позна сядзеў над дакладам, то і назаўтра прыпазніўся і прыйшоў на з'езд незадоўга да яго пачатку. Ведаў, што Георгій Загародні, штатны сакратар Саюза журналістаў БССР, чалавек надзвычай дысцыплінаваны і адказны, зробіць, каб усё было ў парадку. І во навіна: Кісялёў са світай ужо ходзіць па палаце прафсаюзаў, гутарыць з дэлегатамі, якія запаўняліся залу. Павінаваціўся за памылку, дабавіўшы: «А ведаеце, чаму наш запрашальны такі небагаты, на звычайнай паперы надрукаваны? Бо ўсе геніяльныя рэчы спачатку друкуюцца на газетнай паласе, амаль на такой вось паперы. А потым — як Бог дасць: ці на глянец, ці ў кошык са смеццем». Бачу — спадабалася.

Зрабіў даклад, зморана саджуся на месца побач з Кісялёвым. «Чаго крэкчаш? Добры ж даклад зрабіў, грунтоўны. Толькі дзе ж ты такіх слоў паназнаходзіў?» І пачаў, як былы настаўнік, іспыты мне арганізоўваць. Ну, гэта ўжо іншая рэч, падумалася. У перапынку, каб ушчыльніць час, пачалі вылучаць кандыдатуры ў новы склад праўлення. Кісялёва запрасілі ў фае палаца паглядзець выстаўку фотажурналістаў рэспублікі. «Можа, вам лепей быць на вылучэнні кандыдатур, не баіцеся, што раптам вас абмінуць?» Аджартаваўся: «Дык пасада ж грамадская, турботная. Работы — хоць адбаўляй і ўсё на асабістым энтузіязме». Прагаласавала супраць мяне, здаецца, чатыры чалавекі…

Напярэдзе зноў былі канкрэтныя справы, якія натхнялі нас, журналісцкіх актывістаў, як тады казалі, несці ўсё новае, перадавое ў жыццё.

Паводле кнігі Аркадзя ТОЎСЦІКА «Вяртанне да вытокаў сваіх», рэдактара газеты «Звязда» 1973—1986 гг., старшыні Праўлення Саюза журналістаў БССР у 1973—1987 гг.

**ЯРШЕВИЧСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫ

ШАХМАТЫ

Пад рэдакцыяй майстра спорту Уладзіміра СЫЧОВА

КОНКУРС РАШЭННЯЎ

Заданне № 9



Мат за 4 хады (6+10).

Заданне № 10



Мат за 4 хады (6+11).

Праверце свае рашэнні

Прыводзім адказы на заданні бягучага конкурсу за 16 жніўня.

Заданне № 3. 1. Ch4! — цугцванг. 1. ... Kpf4 2. Kg6x, 1. ... Kpd4 2. Cf6x, 1. Kpd6 2. Kf7x. Падманлівы след: 1. Ch3? таксама ёсць тры варыянты з матамі на хады чорнага караля: 1. ... Kpf4 (Kpe4) 2. Df5x, 1. ... Kpd5 2. Fe6x, 1. ... Kpd6 2. Fc5, але 1. ... Kpf6!

Заданне № 4. Спачатку не праходзіць 1. Kpd1? g2 2. C:g2 Cb2!, 1. Kc2? g2 2. C:g2 Cc3!, 1. Kd1? g2 2. Cg2 Cd4! і Kf1? g2 2. C:g2 C:e5! Трэба затармозіць пешку. 1. Cg2! І прымусіць слана акрэсліцца: 1. ... Cb2 2. Ld1 — цугцванг. Утрымаць факальныя пункты c1 і d4 слану не пад сілу; 1. ... Cc3 2. Kc2! — пункты e1 і d4; 1. ... C:e5 2. Kf1! — факальныя палі d4 і e3; 1. ... Cd4 2. Kd1 — новыя пункты c3 і e3. Апошні ход каралём 1. ... Kpd3 2. Kd5+ Kpe2 / Kpe4 3. Kf4 / Le3x.

Адказы мы атрымалі ад наступных удзельнікаў: Юрыя Бандарэнкі (Магілёў), Віктара Быкава, Сяргея Гурыновічв, Мікалая Янучака (усе — Мінск). Міхаіла Балянкова (Рагачоўскі раён), Анатоля Прынесліка (Віцебск), Алега Бадзюкова (Круглянскі раён), Валерыя Лук'янчыка (Талачынскі раён), Аляксандра Марцуля (Шчучынскі раён), Алега Чарневіча (Барань) і іншых.

Кубак Міхаіла Таля

Перамогай гросмайстра Васіля Іванчука (Украіна) завяршыўся мемарыял Міхаіла Таля — кубак Міхаіла Таля па бліц-турніру, у якім гулялі 18 удзельнікаў, і турнір 20-й катэгорыі па класічных шахматах. Спаборніцтвы праходзілі ў Маскве. Поспех Васіля Іванчука паўтарыць зусім не проста. Прыводзім бліц-партыю паміж Русланам Панамаровым і Васілём Іванчуком.

Р. Панамароў — В. Іванчук.

Іспанская партыя.

1. e4 e5 2. Kf3 Kc6 3. Cd5 a6 4. Ca4 Kf6 5. Kbd2 Ce7 6. e3 0-0 7. Ce2 e4 8. Kg1 d5 9. Ch4 g5 10. Kh3 h6 11 c5 g4 12. Kd2 ed4 13. Kb5 f5 14. cd6 c6 15. Kc7 f4 16. dc5 C:c5 17. Kb3 Cd6 18. Cd6 Fd6 19. Kd4 a6 20. Fb3 Kg5 21. Lh1 Ke6 22. a3 Lac8 23. Jd1 Kc5 24. Fb4 Fc7 25. Kpf1 Le5 26. g3 Lg5 27. Kpg2 Kbd7 28. Kb3 Ke6 29. Fa5 Fa5 30. Ka5 d4 31. Kb7 d3 32. Kd6 de2 33. Kc8 ed1Ф 34. Jd1 Kph7 35. Jd6 Kph7 36. b4 Kd3 37. La5 Lf5 і чорныя выйгралі.

Сказана — зроблена!

...Гэтага дня чакалі ўсе: у Міколы дзень народзінаў. Здавалася б, у кожнай студэнцкай групе такіх дзён — аж браце ты мой!.. Але толькі Міколаў прыпадаў на кастрычнік, калі можна яшчэ ладзіць шашлыкі і танцы на вуліцы, калі з некім можна заблукаць у лесе...

Тры гады запар уся група выязджала ў жывапіснейшыя мясціны, на бераг возера, на дачу да Міколавых бацькоў...

Так было і цяпер: скінуліся на сякі-такі падарунак, прыпасы, усё астатняе ўзяў на сябе імяніннік. Праўда, ключы ад дачы бацька яму з умоваю даў. Сказаў, што цяпер чысцяць возера, вывозяць сапрапелі. А гэта — найлепшае ўгнаенне. Таму, сынок, «злаві» машыну, дай шафёру якую капейку. Хай скіне... На горад.

...Свята прайшло на ўра і з усім, што планавалася, — з віншаваннямі, шашлыкамі, танцамі, пацалункамі... Пасля якіх, успомніў сын і бацькаву просьбу. Адправіў сяброў — лесам, у бок чыгункі, а сам выскачыў на грунтоўку — перахапіць грузавік.

Чакаў зусім нядоўга — машына спынілася.

— Чаго табе? — высунуўся вадзіцель.

— Ды вось... Бацька сказаў... Можа скінеце кузаўчык нам на дачу. Я заплачу, — жаласна зацягнуў хлапец і палез у кішэню па грошы.

— Што, увесь? — здзівіўся мужык.

— Ну.

Вадзіцель збочыў з дарогі, выгрузіў груз на грады і з'ехаў. Мікола пабег даганяць сяброў.

...У панядзелак перад заняткамі група абмяркоўвала Міколаў дзень. Усім было весела, апроч... імяніннika. Як высветлілася, непадалёк, паўз дачу, вазілі не толькі сапрапелі, але і... асфальт на будаўніцтва шашы на Гродна. Пяць тон гэтага матэрыялу згрузілі на любімай дачы.

А таму студэнты туды паехалі зноў. І зноў. Ужо без шашлыкоў і дзяўчат — дзяўблі і выносілі «сапрапелі».

Віктар ВАРАНЕЦ,
г. Гродна

«І ніхто не пакрыўдзіўся!»

Мой дзядуля пайшоў з жыцця ў 1945-м, пражыў 98 гадоў. Шмат што паспеў зрабіць, шмат што расказаць... Адзін эпізод.

Жыхары нашай вёскі Тапарышчы на пачатку мінулага стагоддзя жылі бедна, зямлі амаль што не мелі — каровы былі на 6 падворках з 32...

Ажыла вёска са з'яўленнем земства, калі кожны гаспадар атрымаў па надзелу зямлі: праз год-другі каровак стала нават больш, чым двароў. Гэта значыць, што ў асобных — іх было і па дзве...

Таму, зразумела ж, паўстала праблема з асемяненнем. На вясковым сходзе рашылі купіць быка, карміць — па чарзе. Так і зрабілі. Але ж не пашчасціла: бык той у хуткасці нагу паламаў...

Сабраліся вякоўцы яшчэ раз, рашылі, што яго трэба падкарміць і пусціць пад нож. Мяса — падзяліць на ўсіх.

Лёгка гэта сказаць, а вось як зрабіць?... Дапамог 16-гадовы Кляцко Ермалай, які парабкаваў у аднаго з тутэйшых заможных сялян. Свае меркаванні наконт раздзелу тушы ён выклаў так:

Васілю Кулінцу — ногі,
Што жыве ля дарогі,
Сапрону — рогі,
Што высокія парогі,
Марыне Шляхцянцы — галава,

Што даўно ўдава,
Дзям'яну — пуп,
Што дужа скуп,
Аляксею — язык,
Што спакойны мужык,
Міну Юркевічу — косці,
Што ездзіў у Амерыку ў госці,

Міхалачку — сцягно,
Што ўдаўцом даўно,
Ігнату — пячонка,
Што сварлівая жонка,
Самуліе — лапатка,
Што старэнькая хатка,
Патрахею — сэрца,
Што ў пляну быў у немца,
Прузыне хрыбет,
Што ў куранцы жыве,
Івану Мікіцёнку вуха,
Што жонка глуха,
Тэклі — грудзіна,
Што бондарца радзіла,
Савачку — скурышча,
Што кожны дзень ігрышча...

Іншымі словамі, пры дзяльбе Ермалай настолькі праўдзіва, настолькі аб'ектыўна ахарактарызаваў кожнага з вясковых гаспадароў, што... абсалютна ніхто не пакрыўдзіўся! Людзі на памяць ведалі, што каму дасталося і, сабраўшыся разам, любілі паўтараць. Напэўна таму «расклад» гэты лёгка засвойвалі дзеці, потым дзеці дзяцей...

Факт, што помніцца ён і сёння.

Што датычыцца падлетка, які на гэты падзел адважыўся, то ў сярэдзіне 20-х ён быў прызваны ў армію, служыў у Оршы, там жа ажаніўся, асеў... Ваяваў у гады Вялікай Айчыннай, меў узнагароды. Пасля смерці жонкі вярнуўся ў родную Чырвоную Слабаду, дзе мы і сустракаліся. Я, помню, пытаў у яго аб рабоце парабкам. Адказаў, што цяжкай яна не была, бо гаспадар быў чалавекам добрым і працай не перагружаў. А калі пачуў «паэму» пра падзел быка — аж пацалаваў на радасцях.

А.В. МАСКАЛЁЎ,
в. Гузовіна, Крупскі раён

Куфэрак проста адчыняўся

У тыя гады пра НЛА не гаварылі толькі немаўляты, бо не ўмелі. Усе астатнія дзяліліся на тры лагеры: адны ў існаванне незямных цывілізацый безагаворачна верылі, другія — не, трэція пакуль надчэквалі, вызначаліся, да каго б прымкнуць...

Я ў той год была класнай у 9-м, запрасіла бацькоў на сход. Прыйшлі, як водзіцца, адны матулі, і мы, усе разам, сталі падымацца на другі паверх, у наш клас. Я, як гаспадыня, ішла першай, звыкла тузанула за ручку — дзверы, аднак, ні з месца. «Ну, — думаю, — мусіць, нейкія гарэзы на шчотку зачыніліся?..». А адна з мацярок (галоўнае ўпэўнена так): «Не, там парачка!..».

Прыкідваю — быць таго не можа! Я сваіх вучняў ведаю... Тузаю дзверы далей — сама, потым аднаго з хлопцаў папрасіла. Той іх так страсянуў, — шчотка выпала. Кабеты — стрымгалоў — у клас! І давай за шафы зазіраць, пад парты — шукаць закаханых.

Марна ўсё — нідзе нікога, пуста... І вокны зачынены.

Стаім мы, адна на адну пазіраем, а зразумець нічога не можам.

— Гэта НЛА, — шэпча раптам адна з жанчын.

У мяне — мурашкі па спіне, у жанчын, мусіць, таксама, бо твары збялелі... Усе зноў кінуліся да партаў, да шаф — выцягвалі шуфлядкі, перабіралі кнігі, шукалі хоць нейкія «сляды» прышэльцаў...

Як прайшоў той сход, помню дрэнна, затое добра — як на ватных нагах ішла дадому, як ні з кім не магла гаварыць, ні аб чым іншым думаць і потым — заснуць...

Раніцай (як цяпер гэта бачу) ледзь жывая (НЛА гэта ж вам не жартачкі!) прыпаўзла ў школу — заходжу ў клас, узіраюся ў твары вучняў. Двое ўсміхаюцца, вочы хаваюць, а потым кажуць мне:

— Данута Вікенцьеўна, паглядзіце пад столь.

— Падымаю вочы, бачу... два невялікія акенцы ў сцяне.

— Куфэрак, як высвятляецца, проста адчыняўся: хлопцы вынялі ў іх шыбы і, зачыніўшы дзверы на шчотку, вылезлі.

Як яны гэта зрабілі (сталы ўсе стаялі на месцы) не ведаю і сёння. Не інакш, як падскочылі, падцягнуліся на руках (абодва досыць спрытнымі былі). А потым — «спаўзлі» па сцяне ўніз галавой...

Папярэдзіла, каб было гэта ў першы і апошні раз. А ў глыбіні душы шчыра парадавалася, што ніякіх іншапланецянаў у школе не было. Былі дзеці, якіх я вельмі любіла і якіх вельмі часта ўспамінаю.

З надзеяй на тое, што яны мо таксама?

Д.В. ШАЎЛОЎСКАЯ,
в. Янушкавічы, Валожынскі раён

Харошая баба

Мода цяпер пайшла — падворкі свае ўпрыгожваць, тэрыторыю вакол іх... Нехта дрэвы садзіць, кветкі, кусты, нехта — на большае замахваецца. Адзін мужык кабету з дрэва выразаў (у хустачцы пад бараду, з рукамі на жываце), расфарбаваў як след і ў вёсцы ля сваёй хаты на пастаменцік паставіў. Няхай, маўляў, гасцей вітае, хай дом сцеражэ... Ды і маці весялей — калі натоміцца, калі захоча на лаўцы пасядзець, у кампаніі будзе...

І вось ці не назаўтра (вёска абнову яшчэ не разгледзела) шчыруе тая матуля ў гародзе, чуе:

— Ну, здарова была!

Маўчыць у адказ, бо не ёй жа, думае: яе ж за плотам не відаць...

А гамонка далей ідзе. І бабулі — цікава. Бліжэй памаленьку патэпала. Чуе здалёк яшчэ:

— Ты, Маня, чалавек, харошая баба! А мая ж дык — кобра азіяцкая. Усё ёй мала, усё не так... Ну вось скажы: я не гаспадар? Маўчыш, значыць ведаеш, што гаспадар... Усё ўмею, усё, што хочаш, зраблю! А калі вып'ю, дык каму ад гэтага дрэнна? Ні я капейку прап'ю, ні з кім паб'юся. Дамоў прыпаўзу і ціхенька лягу. А яна — аж шалее тады! А ўжо кляне... Каго, Маня? Роднага мужыка! Ці ж так можна? Маўчыш. Значыць, згодна са мной — нельга!.. Маня, а давай я да цябе перайду! Прымеш, га? Жыць будзеш, як у бога за пазухай!.. Ну што ты маўчыш? Цяжка рашыцца? А я цябе не падганяю...

Маня між тым вылазіць на вуліцу, бачыць — на лаўцы мужык з іх вёскі сядзіць — на добрым падпітку, курыць...

— З кім ты, гамоніш? — пытаецца ў яго.

Той аж здрыгануўся — не з тога боку голас гучыць. Паглядзеў у той... У гэты. Зноў у той... Спытаў:

— Гэта ты, Маня? А я думаў — ты гэта.

Адным словам, неяк паразумеліся яны. З адным мужыком.

На другі дзень другі з'яўляецца. У тым жа стане. І зноў да «статуі» — вітаецца з ёй, гамоніць...

Традыцыя — у вёсцы ўсе з усімі вітаюцца, усё пра ўсіх ведаюць.

Да болю шкада толькі, што гэтых усіх, жывых, з кожным годам меней і меней.

А. БАРЫСЕВІЧ,
Жлобінскі раён.

Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.

НА ЎСЕ ПРУЖАНЫ — ПАЛАЦЫК

Рыштаванні Бацькаўшчыны

Пружанскі палацык.

Пружаны на самым пачатку восені сустрэлі вясёлай яркасцю вераснёвых кветак. Пяць гадоў таму райцэнтру пашанцавала з «дажынкамі», і цяпер, да гонару пружанцаў, наведзеная прыгажосць падтрымліваецца і развіваецца. Ад самага вакзала ідзеш і адчуваеш асалоду цішы малога горада. Нават вадзіцелі дарагіх іншамарак, якія цяпер паўсюль, адрозніваюцца ветлівасцю: на пераходах прапускаюць найперш пешахода. Дык вось ідзеш па гэтым чыстым, утульным, дагледжаным правінцыйным гарадку і раптам упіраешся ў старадаўні парк, пасярод якога — невялікі сапраўдны палац. Ён мае дзіўнаваты выгляд, нібы складзены з розных па памерах, форме і абліччы будынкаў. Адзін з чатырох пружанскіх помнікаў архітэктуры XIX стагоддзя — ёсць яшчэ сабор у імя Аляксандра Неўскага, касцёл узнясення святой Дзевы Марыі, гандлёвыя рады «Белыя лаўкі» — палац Швыкоўскіх паступова становіцца галоўнай славутасцю горада, яго візітоўкай і своеасаблівым брэндам.

Гэта цяпер. А тады, у 50—60 гадах пазамінулага стагоддзя, пяцітысячны павятовы цэнтр Гродзенскай губерні мала чым мог пацешыць вока. Вузкія, амаль усе незабрукаваныя брудныя вуліцы, уздоўж якіх цягнуліся шэрыя драўляныя дамы і крамкі, пара храмаў, некалькі дзяржаўных устаноў... І раптам пасярод гэтай убогасці — такі цуд. Нехта з даследчыкаў, матэрыялы якіх беражліва захоўваюцца ў цяперашнім музеі, назваў ўзвядзенне палацыка ў цэнтры Пружан матэрыялізацыяй мары аб лепшым і прыгожым жыцці, якога заўсёды трэба прагнуць. Тэзіс гэты застаўся актуальным да нашага часу, хоць многае змянілася з тае пары. Думаю, самы час згадаць асноўныя вехі гісторыі «Пружанскага палацыка». Яго гаспадары таго вартыя.

Пасля падаўлення касцюшкаўскага паўстання ў 1794 годзе зем-

Салон-гасцёўня.

лі, якія тады называліся Пружанскі «ключ» імператрыца Кацярына II шчодрай рукой даравала графу Румянцаву-Задунайскаму. У пачатку XIX стагоддзя Румянцавы прадалі маёнтак тайнаму саветніку Ягміну. А гадоў праз дзесяць яго набылі Швыкоўскія, прадстаўнікі заможнага шляхецкага роду. На працягу амаль васьмі дзесяцігоддзяў яны гаспадарылі тут, з гэтым прозвішчам звязаны слава і росквіт пружанскага маёнтка.

Сваім з'яўленнем палац абавязаны Валенцію Швыкоўскаму, які стаў гаспадаром маёнтка ў 1843 годзе. Нарадзіўся Валенцій Пятровіч каля 1817 года, адукацыю атрымаў у Дэрпцкім універсітэце (Дэрпт — цяпер горад Тарту ў Эстоніі). У 1941 годзе Валенцій ажаніўся з Гермініяй Важынскай. Сучаснікі называлі маршалка Пружанскага павета вялікім эрудытам, сумленным грамадзянінам і патрыётам. Яны з Гермініяй былі вельмі адукаванымі людзьмі. Бібліятэка іх налічвала 1407 тамоў выданняў на польскай, рускай, нямецкай і французскай мовах. І ў бібліятэцы яны праводзілі шмат часу. Швыкоўскія адкрывалі народныя школы для навучання вясковых дзяцей. Спрыялі культурнаму развіццю свайго краю: у горадзе была адкрыта грамадская бібліятэка, арганізавана конная пошта і пабудаваны паштовы тракт. Па тым часе гэта стала інфармацыйным прарывам. Папулярная ў той час газета «Русский инвалид» змясціла ў 1860 годзе артыкул «Пружаны як павятовы горад», дзе былі асабліва падкрэслены дзелавыя і асабістыя якасці пружанскага маршалка.

Валенцій жыў і працаваў у тагачасных умовах, пры той уладзе, але наўрад ці спадабаліся б губернскаму або яшчэ вышэйшаму кіраўніцтву асабістыя погляды маршалка. Засталіся яго пісьмы з эміграцыі, куды трапіў Швыкоўскі, як і многія патрыёты свайго краю, пасля паўстання 1863 года. Былі між іншым такія радкі: «Весці з краю заўсёды тыя ж самыя: бяда, смутак, нястача і ўбоства агульныя. Расце скапнасць царскіх катаў: чаго нельга ўкрасці, тое знішчае чужая мова і чужая прывівецца вера. Сэрца рвецца перад гэтай страшнай карцінай маральнай і матэрыяльнай пакуты народа... У грамадскім жыцці распад і адмаўленне веры, сям'і і найсвяцейшых векавых праўдаў...» Самі яны з жонкай жылі па законах тых самых «векавых праўдаў». І ім пашанцавала. Гэта быў надзвычай рэдкі выпадак, калі сасланаму гаспадару дазволілі вярнуцца ў свой маёнтак. Гермінія, якая Пружанскі палацык не пакідала ні на дзень, ва ўсе інстанцыі накіроўвала пісьмы і звароты з просьбамі за мужа. І была пачута.

Лёсам было адведзена яшчэ многа шчаслівых гадоў у любімым імі палацыку, дзе яны прымалі дарагіх сваіх гасцей — мастака Напалеона Орду, пісьменніка Юзафа Крашэўскага, іншых вядомых навукоўцаў і людзей мастацтва, займаліся сваім любімым гаспадарствам. Гермінія памерла першай, Валенцій дажываў свой век у Варшаве. Але пахаваны яны разам у Пружанах. І зноў ім пашанцавала ўжо пасля смерці. Іх косці не валяліся, як астанкі, напрыклад, уладароў Воўчынскага і Закозельскага маёнткаў, а ляжалі ўвесь час у спакоі. Магіла Швыкоўскіх на каталіцкіх могілках у Пружанах і цяпер знаходзіцца ў здавальняючым стане.

Пашанцавала і палацыку, па-першае, з наступнай гаспадыняй, ёй стала Вера Кляйнмікель, а па-другое, з тым, што ён перажыў і рэвалюцыі, і войны і застаўся стаяць. Вера Уладзіміраўна Кляйнмікель, сваячка Наталлі Ганчаровай, жонкі Пушкіна і пляменніца сяброўкі апошняй імператрыцы Аляксандры Фёдараўны, рэдка жыла ў Пружанах, часта здавала маёнтак у арэнду, але заняпаду яго не дапусціла. За польскім часам палацык займала павятовае староства, у вайну — штаб генерала Гудэрыяна, потым інтэрнат нямецкіх афіцэраў, пазней інтэрнат савецкіх афіцэраў, пасля вайны — дзіцячы садок і стаматалагічная паліклініка. А ў 1990 годзе даследчык напіша: «Сучаснае становішча сядзібы адчайнае. Будынак у страшнай занядбанасці. Зусім запушчаны парк. Дрэвамі і хмызнякамі зарос сядзібны падворак. Ён быццам сарамліва хавае тое, што засталося ад палацыка. Такая рэчаіснасць...» Была.

Але палацыку зноў усміхнулася фартуна. Яго доўга збіраліся рэстаўраваць, доўга рэстаўравалі, і нарэшце ў 1998 годзе адкрылі. Сюды пераехаў краязнаўчы музей, які стаў называцца музей-сядзіба «Пружанскі палацык».

Маім гідам па музеі стала галоўная захавальніца фондаў Раіса Зінчук. Раіса Уладзіміраўна доўга расказвала пра тое, што ёсць, а яшчэ больш пра тое, што будзе. Бо экспазіцыі многіх залаў пакуль на стадыі стварэння, асобныя — на стадыі задумак. Зараз у пакоях абсталяваны салон, кветкавая зала, аранжарэя, паляўнічы кабінет, музей этнаграфіі. Сядзіба стала грамадска-культурным і навуковым цэнтрам Пружан. Тут праводзяцца літаратурныя і музычныя вечарыны, навуковыя канферэнцыі па захаванні гістарычнай спадчыны, прайшло ўжо каля сямі дзесяткаў тэматычных выстаў.

Раіса Уладзіміраўна паказвае салон, дзе стаіць раяль і праходзяць музычныя вечары:

— Мэбля ў нас пазамінулага стагоддзя, звычайна ў музеях забараняецца сядзець на крэслах-экспанатах, але асаблівасцю нашага музея з'яўляецца тое, што падчас мерапрыемстваў мэбля выкарыстоўваецца. Такім чынам госці, наведвальнікі яшчэ больш пранікаюць духам рамантызму, харызмай XIX стагоддзя, якая, мы спадзяёмся, засталася ў палацыку. Тут вельмі любяць фатаграфавацца маладыя, мы рашылі ўсталяваць такую паслугу за невялікую плату. А ў новай сям'і застаецца памяць пра галоўную гарадскую славутасць. Так палацык паступова становіцца арганічнай часткай гарадскога жыцця.

Навуковыя супрацоўнікі музея-сядзібы цяпер шчыруюць над стварэннем гербавай залы, іконнай залы, працягу этнаграфічнага пакоя. Нядаўна адрэстаўраваны яшчэ адзін будынак сядзібы Швыкоўскіх — былая аранжарэя. Тут абавязкова з гонарам скажуць, што мясцовая аранжарэя нават пераўзыходзіла радзівілаўскую. Але была загублена пасля сумных падзей 1863 года. Гэты даўгавaты прамавугольны будынак, дзе некалі раслі апельсіны, пальмы і шмат іншых разнастайных экзатычных дрэў, называюць цяпер флігелем. І галоўнае, што ён дачакаўся свайго часу. Спярша была задумка размясціць тут школу народных рамёстваў, потым планы мяняліся. Але канчаткова зразумела, што пабудова паслужыць справе навучання культуры і мастацтву маладога пакалення пружанцаў.

Супрацоўнікі палацыка вельмі ганарацца сваім домам і вельмі стараюцца падтрымліваць яго годна, каб душы Валенція і Гермініі былі спакойнымі, калі яны нават захочуць зірнуць на свой стары маёнтак. Кажуць жа, што кожны замак і палац хоць аднойчы наведваюць прывіды.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Былая аранжарэя.

Простыя рэчы

Прыехаў знаёмы, стараваты ўжо вясковы дзядок, на кірмаш, зайшоўся пагаварыць. Вёсачка ў іх невялікая, пару мужчын пенсійнага ўзросту, астатнія — бабулі. Конь ды тры каровы з буйной жывёлы. А вось курэй хапае. Ды бяда — вёсачка лясная, павадзіліся шашкі, і ніякай ім рады. Бывала, за ноч у якой бабулі і з дзесятак курэй пакладуць. «Адрataваліся толькі петлямі, — расказваў стары, — ставіў іх на тых дарожках, дзе бачыў сляды звяркоў. Трапляліся. Цяпер ні іх, ні слядоў няма».

Шашок — невялікі драпежны звярок з сямейства куневых. Мае каштоўны мех. Яшчэ больш каштоўны ён у куніц. Нездарма ж у старажытнай Русі была куна — грашовая і лікавая адзінка, звязаная менавіта з футрам куніцы, якое ў ранняе сярэднявечча з'яўлялася адной з асноўных менавых адзінак. А сам шашок вельмі шкодны для вясковай гаспадаркі звярок. Ды што вясковай. У шасцідзесятыя гады быў уладзіўся ён і ў бацькоўскі хлеў у райцэнтры, дзе мы жылі. Шмат курэй перавёў. Лавіў бацька яго і капканам, ды эфектыўнай аказалася пятля з тонкага і гнуткага, але надзейнага дроту.

Такое прыстасаванне з петляў для лоўлі птушак і дробных жывёлін называюць яшчэ сілом ці сілком. Вось як апісвае Мікола Хведаровіч лоўлю птушак:

З сухое лапушыны
Зрабіў свісток такі,
Што голасам птушыным
Іх вабіць на сілкі.

Сіло ў беларускай мове мае і пераноснае значэнне: тое, што пазбаўляе волі, нейкая пастка. У Алеся Дудара:

Балот гнілых сіло
Нам болей пагражаць не стане.

І ўсё-такі найбольш распаўсюджана ў нас пятля, слова, якое мае шмат — акрамя ўзгаданых, паляўнічых — значэнняў.

Часцей і гарчэй, вядома ж, успомніцца пры гэтым пра пятлю, якая падрыхтавана ка́там для чалавека, а то і самім чалавекам для сябе. 22 сакавіка 1864 года гераічна загінуў на царскай шыбеніцы ў Вільні гонар і гордасць беларускага народа на стагоддзі Кастусь Каліноўскі. Увогуле, шыбеніца, пятля ў гэтым сэнсе моцна прысутнічае ў літаратуры. У Максіма Танка:

Песня твая прапета,
Пятлю ці кулю сам выбірай!..

А ў Пімена Панчанкі:

І апошняю куляй, што да ўласнага сэрца прымерана,
Я фашыста яшчэ аднаго у зямлю заганю,
І, стрымаўшы салдацкую клятву на вернасць,
Сваё цела аддам і пятлі, і свінцу, і агню.

І ўвогуле, як тут не ўзгадаць радок з песні Уладзіміра Высоцкага пра паэтаў і канкрэтна пра Ясеніна:

А кто-то в петлю слазил в «Англетере».

Хоць, як цяпер даводзяць многія даследчыкі, у смерці Ясеніна больш невядомага, і далёка не факт, што сам паэт выбраў сабе такі падрахунак жыцця.

Некалі раней пятлю беларусы называлі пятальгай.

Чамусьці вельмі слаба арыентуюся ў лесе. Таму ў грыбы ніколі не іду адзін, выбіраю з грамады самага вопытнага для лесу чалавека і стараюся трымаць яго пастаянна ў полі зроку. Тут ужо не да грыбоў, асабліва калі кругом гушчар. Ды і збіраю я іх няўмела. Але цешу сябе тым, што паветрам падыхаю і не аблудуж. А некалькі разоў і з вопытнымі лесавікамі даводзілася паблудзіць, панаразаць петлі. Быў такі выпадак у Нарачанскім лесе, калі там яшчэ не ўтварылі Нацыянальны парк. Прыехала туды грамада на невялікім аўтобусе. Разышліся, дамовіўшыся аб часе сустрэчы. Прытуліўся я да маладзейшага знаёмага, заядлага грыбніка. Ну і папятлялі ж мы! Лес вялікі, малазнаёмы і яму, а мне дык зусім. Хмарна. Нам ужо і гукалі, і сігналілі. Але мы не чулі. Зарыентаваліся толькі, як выбіліся на шашу вакол возера Нарач. Тут пад вечар ужо і падабраў нас аўтобус з грыбнікамі, вельмі незадаволенымі такой затрымкай.

Пятляе заяц, калі ўцякае ад пагоні. Наразае кругі, перасковае, блытае свае сляды.

Летнім вечарам сядзіш дзе-небудзь на верандзе ля лямпы. А вакол яе лётаюць, апісваюць імклівыя петлі матылі.

Пятляе палявая ці лясная дарога, сцяжына ў адрозненне ад стромкай шашы.

Зрабіць пятлю можа і рака. З «Угрум-ракі» Шышкова. Малады Прохар Громаў з двума спадарожнікамі сплаўляецца па сібірскай суровай рацэ. У адным месцы праваднік кажа, што адсюль пачынаецца вялікая рачная пятля, цэлы дзень будуць плысці, а вечарам апынуцца толькі за кіламетр адсюль. І Прохар, захапіўшы ружжо, вырашае прайсціся па тайзе. Праходка гэта стане пачаткам яго прарочых сустрэч, сноў, пачаткам яго канца.

Пятля — гэта і рух лятальнага апарата па замкнутай крывой лініі, у час якога лётчык у пэўны момант аказваецца ўніз галавой. Такую пятлю называюць яшчэ «мёртвай пятлёй». А з'явілася ў вышэйшым пілатажы лётчыкаў яна як «Пятля Несцерава». Быў у царскай Расіі такі славуты лётчык, штабс-капітан. (Паглядзеў па энцыклапедыі — Пётр Мікалаевіч). Пражыў усяго дваццаць сем гадоў). Вось у 1913 годзе ён упершыню і выканаў на сваім самалёце «мёртвую пятлю». А загінуў у 1914 годзе, на Першай імперыялістычнай вайне гераічна, зноў жа першым прымяніўшы паветраны таран.

Спецыяльна завязаныя петлі шырока прымяняюцца ў арміі, асабліва на флоце. Помніце расійскі фільм «Процісцянне». Там перад работнікамі міліцыі стаіць задача знайсці жорсткага забойцу, які расчлененая цела ахвяры выкінуў у мяшку на ўзбочыну аўтадарогі. І першым шторшком для праЖанчына сядзіць за вязаннем і нанізвае на шпількі петлі пражы. Хоць, як кажуць, такі занятак супакойвае і мужчын.

Пятля — гэта і праразная адтуліна ў адзенні для яго зашпільвання. Як у дзяцінстве мучыліся мы з тугімі петлямі ў новай адзежы і вялікімі, часам нават драўлянымі гузікамі. Сёння гузік сустракаецца значна радзей — кнопкі, «маланкі».

Ды і весніцы, дзверы вісяць на петлях — дзве металічныя планкі на шарнірах. І калі па нядбайнасці альбо спецыяльна — каб чуць любога госця — гаспадар не змазвае іх, то калі яны адчыняюцца, петлі падаюць голас. І ў кожнай ён своеасаблівы, непадобны на іншыя.

І яшчэ два ўспаміны дзяцінства, звязаныя з петлямі.

Сонечны ранак, цёпла, самы пераход ад вясны да лета. Наша рэчка яшчэ ў разліве, затапіла сенажаці. Але вады на траве зусім няшмат: дзе толькі вышэй ступака бродаеш, дзе па калена. І цёплая-цёплая, нібы ня хто спецыяльна падграваў. На такую ваду, на траву выходзіць з рэчкі рыба. Зразумела ж, сюды і хлапцы, лавіць яе. Драбяза, шэрань ловіцца марляй. А вось невялікіх шчупачкоў, ножычкаў, як мы іх называлі, ловяць пятлёй. На канцы вуды робіцца пятля. Знайшоў такога ножычка, падвёў леску, заслізнуў пятлю — гатова. Услед за большымі хлапцамі цягнемся і мы, драбяза, вучні пачатковых класаў. Просім старэйшых змайстраваць петлі на вудах і нам. Цікавы занятак. Падвесці пятлю так, каб не спудзіць шчупачка, а потым заслізгваць леску, адчуваючы меру: недаціснуў — вырвецца рыба. А замоцна таргануў — можна таго ножыка і напалову перарэзаць.

Лавілі мы петлямі і птушак каля сваіх хат. Накрошыш хлеба, чаго іншага на такую пятлю, а саму пятлю прывяжаш да калка. Наляціць птушка, клюе. Тут яе і пужаеш — нейкая ў пятлю і трапляе. Калі мы вучыліся ў сярэдніх класах — стала чамусьці модным на першамайскай дэманстрацыі ў райцэнтры выпускаць са скрынак галубоў. А як жа іх сабраць у гэту скрынку? Спрабавалі лавіць петлямі — цяжка, рэдка трапляе галубок. Тады нехта з дарослых падказаў. І сталі мы перад першамайскімі святамі ноччу залазіць пад купал зачыненага тады касцёла. Пасвеціш ліхтарыкам — мірна сядзяць чародкі галубоў. Бяры і кладзі ў мех. Сёння разумею, што тагачасны павеў з галубамі быў ад галоўнага лозунга свята «Май. Мір. Праца». У прагрэсіўнага Пабла Пікасо была ўжо тады славутая карціна «Голуб міру». Але, здаецца, такі сімвалічны галубок сягае ў часе значна глыбей. Ці не голуб прынёс у дзюбе Ною і яго спадарожнікам на гару Арарат галінку пальмы, паведаміўшы, што сусветны Патоп закончыўся?

Але жыццё чалавека складвалася так, што найбольш магчымая асацыяцыя са словам «пятля» — у яго зусім не паляўнічая. Вось толькі некалькі ўстойлівых выразаў з беларускага фальклору.

Лезці ў пятлю.
Усунуць галаву ў пятлю.
Хоць у пятлю лезь.
Шукаць пятлю на шыю.

Але не будзем так сумна, звернемся да вузла. Ён мае таксама шмат значэнняў. Гэта складаны, драматычны збег абставінаў. І разам з тым чыгуначны вузел, энергетычны вузел. Гэта і патоўшчаная частка сцябла з парасткамі або лісцем. І разам з тым від прычоскі на галаве. А таксама скапленне нервовых клетак. Але ж гэта і звычайны клунак.

Ад старажытных рымлян прыйшло да нас: рассячы гордзіеў вузел.

Некалі верш пачаў я так:

Ат, якое піва ў Маладзечне,
Дзе чыгунка і аўтавакзал.
Хто бываў тут, той сабе, канешне,
Вузялок на памяць завязаў.

Алесь КАСЦЕНЬ.
г. Паставы.

Дзеля беларускага слова прыязджаюць з іншых краін

Выстава

На выставе «Слова і вобраз» у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі прадстаўлена звыш 140 твораў айчынных і замежных мастакоў.

Майстры пэндзля з Эстоніі, Малдовы, Украіны, Германіі, Кітая, Сербіі і іншых краін, якія гавораць у творчасці на мове фарбаў, на беларускай выставе выказаліся наконт каштоўнасці слова. І зрабілі гэта па-свойму, прапанаваўшы гледачам уключыцца ў інтэлектуальную гульню, у якой два пачаткі — вербальны і пластычны — дапаўняюць адно аднаго. Але ж ёсць і мастацтва, дзе слова і вобраз насамрэч арганічна спалучаюцца. Выданні ў стылі «book-art» зоймуць асаблівае месца ў праекце. Гэта, па сут

А на мой погляд...

Калі ганарыцца, дык за вынік працы і сям'ю

Куранят, як вядома, лічаць увосень. І няхай яна толькі пачалася, нейкія прамежкавыя вынікі можна падвесці ўжо зараз: што за мінулы час зроблена ўласнымі рукамі, якія намаганні прынеслі жаданы плён?

Чым сёлета асабліва ганарыцеся вы?

Алена ХАСАНАВА, начальнік аддзела добраўпарадкавання УП «Мінскзелянбуд»:

— Тым, як выглядае ўвесь наш горад. А асабліва... У Мінска ёсць японскі горад-пабрацім Сіндай. У скверы каля тэатра музкамедыі сёлета быў арганізаваны «японскі куточак»: высаджана сакура, выкарыстаны водна-дэкаратыўныя элементы, малыя архітэктурныя формы. Работа яшчэ цалкам не скончана, цяпер, у прыватнасці, вядзецца праектаванне другой чаргі, але нават тым, што зроблена, мы ганарымся. У жніўні гэты куточак наведала японская дэлегацыя, ім спадабалася. Будзем працаваць і далей!

Надзея ГАЦУРА, пенсіянерка, вёска Панямонь Навагрудскага раёна:

— Добрым ураджаем! Сёлета і агуркоў было шмат і яблыкаў! Вырасцілі багата бульбы — больш чым летась. Будзе і сабе, і дзецям, а лішкі пойдуць на корм жывёле. Зноў жа — сваё мяса будзе. Усім задаволена. Як кажуць (*смяецца*), як поўная скрыня — і свіння гаспадыня.

Аляксандр АЎТКА, дырэктар Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Інстытут агародніцтва»:

— Тым, што распрацавалі тэхналогію і комплекс машын для вытворчасці цыбулі-сяўка. Ён забяспечваецца і насельніцтва, і гаспадаркі. Работы выконваліся ў рамках імпартазамяшчэння, таму вы разумееце, наколькі гэта важна. Налета гэтыя машыны павінны пайсці ў шырокую серыю. Тое ж магу сказаць і пра тэхналогію і комплекс машын для вырошчвання агуркоў, у тым ліку вядомых многім карнішонаў. Важным таксама лічу выхад кнігі «Агародніна ў харчаванні чалавека». Гэта кніга для кожнай сям'і — як важна правільна ўжываць агародніну, бо гэта і харчаванне, і лекі, што, на жаль, не ўсе ведаюць ці ўсведамляюць.

Ганна ЗАВІШАВА, вёска Дашкаўка Магілёўскага раёна:

— На нашым участку сёлета добра параслі кветкі (*смяецца*). Прыемна выйсці, палюбавацца, ды і астатні ўраджай добры: і памідораў, і сліў, і бульбы. Чым яшчэ ганаруся? Што летам працавала, матулі дапамагала. Але ж галоўная падзея ў нашай сям'і наперадзе. Дачка, студэнтка-чацвёртакурсніца, у лістападзе ўступае ў шлюб!

Іван ШВЯДКО, загадчык па гаспадарчай частцы Мікеляўшчынскага дзіцячага садка — сярэдняй школы Мастоўскага раёна:

— (*Смяецца.*). Хутка адказваць? У школе з красавіка да пачатку навучальнага года рабіўся рамонт. Выканалі велізарны аб'ём работ: памянялі вокны, дзверы, плітку, усю сантэхніку і г.д. У апошнія тыдні будаўнікі прыязджалі ў 6 гадзін раніцы, з'язджалі ў 21 гадзіну вечара. Увесь час з іншымі калегамі па працы даводзілася быць тут, з-за гэта мне жонка нават сказала, што не любіць (*смяецца*). Калі сур'ёзна, усе мы вельмі ганарымся зробленым у школе, вось зараз засталіся зусім нязначныя дробязі.

Любоў БАЛАЎНЕВА, намеснік дырэктара Нацыянальнага музея гісторыі і культуры Беларусі:

— Ганаруся, што падчас водпуску ў матулі ўласнымі рукамі зрабіла агароджу метраў на 100 (*смяецца*). Жэрдкі, вядома ж, муж замацоўваў, а я ўжо забівала цвікі ў кожную штыкеціну! Гэта ўжо, дарэчы, не першая мая агароджа (*смяецца*). А яшчэ ганаруся, якую ў садзе вырасціла ружу — вялікую, што ўецца. Яна ўжо двойчы цвіла.

А калі сур'ёзна і пра працу, дык задаволена, як сёлета мы выконваем план па аказанні платных паслуг насельніцтву, як мы аператыўна працуем з прэсай. Правялі сёлета шэраг выстаў, было пяць дабрачынных акцый. Падчас апошняй 1 верасня наш музей наведала каля трох тысяч чалавек! Задаволена тым, што наведвальнікаў у нас стала больш.

Сяргей СТАРЫНАЎ.

Фота Пятра ФАМІНА.

«Бацькоўскі кантроль» над тэлебачаннем

З 15 верасня ўсім жыхарам Гродзенскай вобласці будзе даступны першы пакет інтэрактыўнага тэлебачання IPTV «Прэм'ера». Ён складаецца з 28 каналаў, сярод якіх ёсць інфармацыйныя, спартыўныя, музычныя і кінаканалы. Прычым з 15 верасня па 14 кастрычніка ўсе ахвотнікі будуць падключаныя да гэтай паслугі без аплаты за ўстаноўку, а таксама абаненцкай платы за першы месяц.

Што такое IPTV? Гэта не тэлебачанне, якое вяшчае праз інтэрнэт, а непасрэдная дастаўка абаненту відэасігналу па звычайнай тэлефоннай лініі праз спецыяльнае абаненцкае ўстройства. Галоўная перавага гэтай тэхналогіі перад звычайным тэлебачаннем у тым, што яна дазваляе глядзець перадачы ў зручны для гледача час і не быць прывязаным да раскладу эфіра. Такім чынам, можна будзе мадэляваць уласны эфір. Паводле інфармацыі з Гродзенскага філіяла РУП «Белтэлекам», на першым этапе абаненты атрымаюць наступныя дадатковыя паслугі:

Электронная версія раскладу тэлеперадач.

«Тэлебачанне са зрухам у часе». Гэта функцыя дазваляе спыніць прагляд «жывога» эфіру і аднавіць яго праз некаторы час. Тым самым вы не прапусціце самы цікавы момант фільма альбо перадачы, калі давялося тэрмінова адхіліцца ад прагляду.

«Тэлебачанне па запыту». Можна не толькі глядзець перадачы, якія транслююцца ў рэжыме рэальнага часу, але і ажыццяўляць зрух па сетцы вяшчання да 48 гадзін назад.

«Бацькоўскі кантроль». Не ведаючы спецыяльнага пароля, дзіця не зможа ўбачыць тыя перадачы, прагляд якіх, на думку бацькоў, з'яўляецца для яго заўчасным і непажаданым.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

ПАЛЯГЧАЦЬ ПАКУТЫ

Першы на Магілёўшчыне хоспіс адкрыўся на базе міжраённага бабруйскага анкадыспансэра.

Як вядома, у Мінску з 2005 года дзейнічае бальніца паліятыўнай дапамогі, у склад якой уваходзіць стацыянарнае аддзяленне, служба дапамогі дома, гарадскі цэнтр паліятыўнай дапамогі і сястрынская справы. Таксама медыцынская дапамога дзецям з анкалагічнай, гематалагічнай і спінальнай паталогіяй аказваецца ў дзіцячым хоспісе ў Магілёўскай вобласці. Бабруйскае аддзяленне паліятыўнай дапамогі разлічана на пятнаццаць месцаў, у кожнай палаце ёсць тэлевізар і ванны пакой. Мэтай хоспісу — забеспячэнне належнага догляду, абязбольванне, арганізацыя сістэматычнага харчавання хворых, якія знаходзяцца ў вельмі цяжкім становішчы. Плануецца хуткае адкрыццё новых аддзяленняў паліятыўнай дапамогі і хоспісаў у іншых гарадах Беларусі.

Наталля НОВІК.

Таксама спорт?

Міжнародны дзень прыгажосці ў горадзе над Сожам адзначылі акцыяй «Красуні на старце» — каля паўсотні дзяўчат рашыліся паўдзельнічаць у забегу па тратуарнай плітцы на высокіх абцасах.

БЯЖЫ, ІРА, БЯЖЫ!

У Гомелі прайшлі спаборніцтвы па бегу на высокіх абцасах

Арганізатарамі мерапрыемства выступілі аддзел культуры Гомельскага гарвыканкама і гарадскі Цэнтр моды і прыгажосці «Крыштальная німфа». Паводле ўмоў акцыі, да ўдзелу ў ёй дапускаліся дзяўчаты пасля 18 гадоў, і абавязкова — у туфлях з абцасамі не ніжэй за 7 см. 60-метровую дыстанцыю для спаборніцтваў прызначылі ў Піянерскім скверы.

У апошні момант, праўда, гарадскія ўлады з меркаванняў бяспекі замянілі бег на абцасах бегам у спартыўным абутку. Але дзяўчат, якія цвёрда вырашылі паўдзельнічаць у шоу, гэта не спыніла — пры рэгістрацыі яны пакідалі распіскі, што ў якасці спартыўнага абутку выбіраюць... туфлі ці басаножкі на высокіх абцасах. І хоць некаторыя ўдзельніцы падчас забегаў упалі, падрапаўшы локці і калені, прэтэнзій да арганізатараў яны не прад'яўлялі. А зацікаўленыя відовішчам гледачы і групы падтрымкі — тым больш.

Пераможцай у незвычайных спаборніцтвах «Красуні на старце» стала студэнтка Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ф. Скарыны Ірына Савосціна, якая атрымала ў якасці прыза мабільны тэлефон. Дарэчы, вучыцца дзяўчына якраз на факультэце фізічнага выхавання, так што да бегу — у любым абутку — ёй не прывыкаць.

Іншыя ўдзельніцы таксама не засталіся без узнагарод — за прыгожыя ногі, за стыльныя туфлі, за волю да перамогі і г.д.

Вікторыя ЗАХАРАВА. Фотаздымкі БЕЛТА.

Спорт-тайм

Прабіліся ў плей-оф

Маладзёжная зборная Беларусі па футболе (U-21) прабілася ў плей-оф чэмпіянату Еўропы-2009. У аўторак яна правяла заключны матч адборачнага турніру: у Рызе мірам разышлася з латышскімі равеснікамі — 0:0. У выніку, набраўшы 17 ачкоў, нашы суайчыннікі занялі ў 7-й групе 2-е месца і трапілі ў лік чатырох камандаў, якія фінішавалі другімі ў сваіх квартэтах. Гэта група (Францыя, Ізраіль, Беларусь і Данія) разам з дзесяццю пераможцамі квартэтаў (Італія, Турцыя, Англія, Іспанія, Швейцарыя, Фінляндыя, Аўстрыя, Сербія, Германія, Уэльс) складзе пары плей-оф. Жараб'ёўка адбудзецца 12 верасня. Стыкавыя матчы пройдуць 10—11 і 14—15 кастрычніка. Як вядома, гаспадыня фінальнага раўнда, зборная Швецыі, атрымала пуцёўку ў фінал напрамую.

На Паралімпіядзе ў нас ужо 4 медалі

На Паралімпіядзе ў Пекіне ў спаборніцтвах па плаванні дыстанцыя 100 метраў батэрфляем прынесла ў скарбонку Беларусі яшчэ два медалі. У катэгорыі S12 Раман Макараў святкаваў перамогу, устанавіўшы пры гэтым новы сусветны рэкорд — 56,90. Другім фінішаваў яшчэ адзін наш суайчыннік Сяргей Пунько — 59,72. Для Пунько гэта другая ўзнагарода. Напярэдадні ён стаў сярэбраным прызёрам на стометроўцы брасам. Пасля трох дзён спаборніцтваў на Паралімпійскіх гульнях у Пекіне зборная Беларусі ў агульнакамандным заліку займае 17-е месца. У актыве нашых суайчыннікаў 4 узнагароды: 2 залатыя і 2 сярэбраныя. Прычым усе на рахунку плыўцоў. Лідзіруюць у камандным заліку гаспадары спаборніцтваў, у якіх 16 залатых, 21 сярэбраны і 16 бронзавых медалёў.

Білеты «на Англію» хутка з'явяцца ў продажы

Пасля 15 верасня з'явяцца ў продажы білеты на матч адборачнага турніру чэмпіянату свету-2010 паміж футбольнымі зборнымі Беларусі і Англіі. Кошт уваходу на мінскі стадыён «Дынама» 15 кастрычніка ад 20 да 70 тысяч рублёў.

Пачатак пакладзены

Шасцю матчамі стартаваў Адкрыты чэмпіянат Беларусі па хакеі ў экстралізе. Вось іх вынікі: «Керамін» (Мінск) — «Нёман» (Гродна) — 3:1; «Шыннік» (Бабруйск) — «Брэст» — 4:1; «Гомель» — «Латгале» (Даўгаўпілс, Латвія) — 0:3; «Металург» (Жлобін) — «Рыга-2000» (Латвія) — 1:2; «Віцебск» — «Юнацтва» (Мінск) — 1:2; «Хімік-СКА» (Наваполацк) — «Хімвалакно» (Магілёў) — 2:3.

«Дынама» і «Керамін» дамовіліся

Дамова аб супрацоўніцтве паміж мінскімі хакейнымі клубамі «Дынама» і «Керамін» была падпісана днямі. Паводле задумы бакоў, сталічны «Керамін» будзе выконваць функцыі дублюючага складу «Дынама», які выступае ў КХЛ. У сувязі з гэтым у бліжэйшы час «драконы» могуць атрымаць шэраг выканаўцаў, якія не трапляюць у асноўны склад «бела-блакітных». У спісе магчымага папаўнення беларускі абаронца Ігар Шведаў, французскі нападаючы Ларан Менье, а таксама паўночнаамерыканскі форвард Дуг Нолан.

Міхневіч зноў трэці

На легкаатлетычных спаборніцтвах у славацкай Дубніцы беларус Андрэй Міхневіч стаў трэцім у турніры штурхальнікаў ядра. Яго вынік 19,86. Першынствааў амерыканец Крысціян Кантвел — 21,39.

Майкд Фелпс патраціў «алімпійскі» мільён

Амерыканскі плывец Майкл Фэлпс, які стаў у Пекіне-2008 васьмікратным алімпійскім чэмпіёнам, стварыў уласны дабрачынны фонд для дзяцей. У якасці першага ўзносу ён перадаў у фонд 1 мільён доларaў, які прапанавалі яму спонсары за «залаты дождж» у Пекіне. У супрацоўніцтве з кампаніяй па вытворчасці плавальных касцюмаў, якая, уласна кажучы, і выплаціла плыўцу мільён, фонд Майкла Фелпса арганізуе тур па васьмі гарадах ЗША. Ён прадставіць праграму «Мара, план, дасягненне» па прыцягненні дзяцей да актыўнага і здаровага ладу жыцця.

Крынічка

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Рубрыку вядзе Валянціна ШПІЛЕЎСКАЯ, тэл. 285 88 81

№ 26 (276)

Сунічная градка

Каб атрымаць добры ўраджай садовых суніц, пастарайцеся на градку высаджваць здаровы, сартавы пасадачны матэрыял са спецыяльных гадавальнікаў. Веснавая пасадка праводзіцца ў трэцяй дэкадзе красавіка — першай дэкадзе мая. Раннія летнія пасадкі (да 10 жніўня) ужо на наступны год могуць даць значны ўраджай. Асеннюю ж пасадку неабходна завяршыць да 10—15 верасня, таму што пры больш позняй высадцы расліны дрэнна прыжываюцца.

Расліны суніц растуць на адным месцы 4—5 гадоў, таму перасадачная падрыхтоўка глебы павінна быць старанная. Добрым папярэднікам для суніц будзе сяўба і заворванне сідэральных культур (рэдзькі, рапсу і інш.) Калі не высяваўся сідэрат, пасля ачысткі (перакопкі) глебы ад пустазелля трэба ўнесці кампост ці перапрэлы гной. Калі ж глеба ўрадлівая, то можна гэтым і абмежавацца, але калі яна супясчаная, неабходна дадаткова да арганічных угнаенняў унесці яшчэ суперфасфат і хлорысты калій.

Садзіць расаду трэба не заглыбляючы кропку росту. Пасля пасадкі неабходны паліў (1,5—2 л на 1 пагонны метр ці 400—500 мл на адну расліну), можна ваду ліць прама ў ямку да пасадкі раслін. Пасля пасадкі неабходна падрыхліць паміж радкамі. Пры летняй пасадцы неабходна дадаткова паліваць 3—4 разы. Можна адзін з паліваў, калі расада прыжывецца, сумясціць з падкормкай мінеральнымі ўгнаеннямі. Для гэтага на вядро вады дадаць 50—100 г аміячнай салетры (заўважым, азотныя ўгнаенні толькі для веснавых і летніх падкормак), 20 г хлорыстага калію, 50 г суперфасфату. На зіму плантацыю добра прыкрыць бацвіннем ці лапнікам для лепшага затрымання снегу. Ранняй вясной з градкі адвесці ваду, згрэбці сухое лісце, падкарміць мачавінай.

Каб пазбегнуць рыхлення і праполак, можна міжрадкоўі замульчыраваць плёнкай, саломай, карой, мохам. Не рэкамендуецца падсцілаць сена, траву, лісце, таму што пры дажджлівым надвор'і яны садзейнічаюць гніенню ягад.

Кормім сад увосень

У сярэдзіне верасня для пладовых культур унясуць 5—8 кг арганічных (кампост) угнаенняў, 50—60 г суперфасфату і 30—50 г калійнай солі на 1 кв. м. Угнаенні ўносяць у баразёнкі ў зону залягання каранёў. Пасля раўнамернага ўнясення баразёнкі зараўноўваюць, а ўвесь прыствольны круг перакопваюць на глыбіню 5—10 см каля штамба, на 15—20 см — на ўзроўні праекцыі кроны. Карысна будзе ў гэты час унесці і па 10—15 г сульфату амонію на 1 кв. м. Адзін раз у 3—4 гады на дзярнова-падзолістых глебах уносяць 300—500 г вапны або 500—1000 г попелу на 1 кв. м. Асабліва карысна гэта для вішні і слівы.

Пры добрым ураджаі дрэвы позніх гатункаў слівы, яблыні і грушы падкормліваюць растворам каравяку, гноевай жыжкі або птушынага памёту. На 1 кв. м праекцыі кроны даюць па вядры раствору для слівы, яблыні, грушы на слабарослых падвоях і па два вядры для яблыні грушы на моцнарослых падвоях.

Народ заўважыў

- **Гром у верасні — да цёплай восені.**
- **Калі ліст на дрэвах трымаецца моцна — зіма будзе позняя.**
- **Калі ліст з дубоў ападае ўвесь адразу — чакай зіму лагодную.**
- **Багаты ўраджай жалудоў на дубах — на цёплую зіму.**
- **Заўчасна на дрэвах паявіцца жоўтае лісце — да ранняй восені.**
- **Калі ўваход у нару крата размешчаны на поўнач, зіма будзе цёплая, на поўдзень — халодная, на ўсход — сухая, на захад — сырая.**
- **Кажуць, калі верасень сухі — зіма позняя будзе.**

Ягада восені

У народзе кажуць, што ў верасні адна ягада, ды і тая — горкая рабіна

У славян рабіна заўсёды была ў пашане, пра яе складалі задушэўныя песні, надзялялі чароўнай сілай. Лічылася, што калі рыбак возьме з сабой у мора рабінавую палку, яму не страшна будзе любая бура. Галінка рабіны з ягадамі ўспрымалася як сімвал Перуновай паліцы, якая здольна абараніць чалавека ад усякіх няшчасцяў. У некаторых мясцовасцях рабіну выкарыстоўвалі ў час вясельных абрадаў, з яе дапамогай спадзяваліся засцерагчы маладых ад чараў, злых варажбітак і ведзьмаў. Лісце рабіны пасцілалі ў абутак маладых, а плады клалі ў кішэні ixняга адзення. Гронкі рабіны звязвалі ў пучкі і развешвалі пад дахамі дамоў і хляваў. На Палессі, у прыватнасці на Гомельшчыне, калі нараджалася дачка, бацька садзіў пад акном рабіну. Калі рабіна зацвітала буйным цветам, а здаралася гэта на сямнаццатую ці васемнаццатую вясну, дзяўчына павінна была рыхтавацца да замужжа.

Славіцца рабіна сваімі пажыўнымі ўласцівасцямі. Вітаміну С, напрыклад, у ёй не менш, чым у лімонах, і значна больш, чым у суніцах, малінах і яблыках. Плады рабіны ўтрымліваюць лёгказасваяльныя цукры — глюкозу і фруктозу, каравін, дубільныя рэчывы, арганічныя кіслоты. Сок свежых ягад і настой сухіх пладоў паказаны пры гіпертаніі, чайную лыжку рабінавага соку карысна прымаць перад ядой тым, у каго паніжана кіслотнасць. Рабіну выкарыстоўваюць як патагонны, жаўцягонны і мачагонны сродак. Водны настой сухіх пладоў ці настойку на гарэлцы прымяняюць пры гемароі і цынзе. Адвар ягад рабіны выкарыстоўваюць пры захворваннях мачавога пухіра, дызентэрыі, камянях у нырках, а таксама як кроваспыняльны сродак.

Ужо ў верасні чырванеюць ягады рабіны, але лепш іх збіраць усё ж у пачатку кастрычніка. Кранутыя першым марозікам ягады не такія горкія. Гронкі рабіны разам з пладаножкамі і лісцем развешваюць на гарышчы, а ачышчаныя ягады можна змясціць у маразільную камеру. Сушыць можна і ў духоўцы ці ў печы. Пачынаць сушыць трэба пры тэмпературы 40—50 градусаў. Плады час ад часу трэба пераварочваць, каб яны не падгарэлі. Высыхаюць ягады за 2—3 гадзіны. Правільна высушаныя ягады павінны захаваць свой колер, а пры сцісканні ў кулаку не ўтвараюць камякоў. Захоўваць сушаную рабіну лепш у кардонных каробках у сухім месцы. Ягады спажываюцца ў выглядзе джэмаў, настояў, кісялёў. Смачная рабіна марынаваная і мочаная, а таксама як начынка ў пірагах.

Рабіна чырвоная добра размнажаецца свежасабраным насеннем, якое трэба збіраць, калі ягады набываюць бурую афарбоўку, але ні ў якім разе не трэба трымаць іх да поўнай спеласці. Адразу ж насенне трэба пасеяць у неглыбокія барозны на глыбіню 1—1,5 см і закрыць перагноем. Калі зямля сухая, барозны паліце вадой, глебу крышачку прытапчыце. Участак, дзе пасеяна рабіна, павінен добра асвятляцца, а глеба быць урадлівай. У залежнасці ад мэтаў і задач сеянцы можна вырошчваць да 3 гадоў. Перасадзіўшы на пастаяннае месца, сфарміруйце штамб вышынёй 60—70 см. Можна зрабіць прышчэпку любога віду ці гатунку рабіны або яе салодкаплодных формаў. Прышчэпліваецца па тыпу яблыні. Для пераскрыжаванага апылення, каб забяспечыць добрую ўраджайнасць, трэба высаджваць ці прышчэпліваць як мінімум 2 гатункі. Прыстольны круг рабіны трэба пастаянна апрацоўваць, уносіць угнаенні, паліваць, мульчыраваць. Мінімальная адлегласць паміж раслінамі павінна быць у межах 2,5 м.

Фота Анатоля КЛЕЦЬКУКА.

Скарбонка дачнага вопыту

● Пры выкарыстанні ў якасці мульчы рэзанай саломы ў глебу трэба дадаткова ўносіць азотныя ўгнаенні для кампенсацыі страт азоту ў працэсе разлажэння саломы. Па гэтай жа прычыне саламяную мульчу перад перакопкай глебы трэба згрэбці і перакопваць не абавязкова. Пакідаць салому пад ягаднымі кустамі не пажадана.

● Каб абясшкодзіць глебу пасля выкопвання расліны, паражонай нематодай, можна паліць глебу перад пасадкай іншых раслін настоем хрэну. Каб зрабіць такі настой, патрабуецца 50 г сушанага лісця і каранёў хрэну здрабніць, заліць 1 л вады і настойваць не менш як суткі. Настоем вялікай канцэнтрацыі можна апырскі карані пасаджанай раслiны.

● Каб захаваць часнок, пакладзіце яго ў добра высушаны мяшок з матэрыі, папярэдне нацёрты знутры вільготнай кухоннай соллю ці намочаны солевым растворам. Мяшок з часнаком не завязваюць. Соль забірае лішнюю вільгаць, згубна дзейнічае на шкоднікаў, якія зімуюць у галоўках, не дае размнажацца грыбам і гніласным бактэрыям.

● Цікавы вопыт некаторых гаспадынь, якія перад закладкай на захоўванне цыбулі доўга, да сутак, праграваюць яе ў натопленай, але ўжо астываючай печы пры тэмпературы 40—50 градусаў. Такая прагрэтая цыбуля, кажуць, не прарастае на працягу ўсёй зімы.

● Калі на вашым участку хрэн ператварыўся ў злоснае пустазелле, падкапайце яго кусты, зрэжце лісце, карані з каранёвай шыйкай, а на корань, які застаўся ў зямлі, насыпце крыху кухоннай солі — хрэн згіне.

● Адрозніць высокавітамінную шыпшыну ад нізкавітамінной можна па чашалісціках, размешчаных на вярхушцы плода. У высокавітамінных гатункаў яны размешчаны вертыкальна, а вось у нізкавітамінных канцы чашалісцікаў апушчаны ўніз і прыціснуты да сценак пладоў.

● Перад закладкай на захоўванне яблыкі і грушы кожнага гатунку перабіраюць, усе пашкоджаныя хваробамі і шкоднікамі плады адкладваюць для больш хуткага выкарыстання, астатнія сартуюць па памерах (буйныя, сярэднія, дробныя), затым асобна ўпакоўваюць. Вядома, што чым буйнешы плод, тым раней ён выспявае, і захоўваць яго разам з астатнімі цяжэй. Лепш захоўваюцца сярэднія па памерах плады.

● Лясны папаратнік арляк — добры антысептык, можа надзейна захоўваць плады ад псавання. Слоем папаратніка абкладваюць дно і сценкі скрынкі для захоўвання, пераслойваюць ім і самі плады, укладзеныя пладаножкамі ўверх.

● Сухімі лістамі рабіны перакладваюць клубні бульбы, пакінутай на захоўванне — яны засцерагуць яе ад паршы, гнілі, ранняга прарастання.

Вырас на градцы гарбуз

Пасадзіўшы позняй вясной ці ў пачатку лета гарбуз, мы пра яго і забываем, можа таму што клопатаў з ім не вельмі многа, але ўвосень заўважаем, што чым далей, тым ён ўсё больш таўсцее, а наконт таго, якая гэта смаката, і якая ад яго карысць — гэта ўжо асобная размова.

Гарбузы — вельмі каштоўны прадукт харчавання як для дзяцей, так і для дарослых. У ім больш караціну, чым у моркве, многа ферментаў і выдатнае спалучэнне пажыўных рэчываў. Рэкамендуецца людзям, якія пакутуюць ад атлусцення, ад ацёкаў пры сардэчна-сасудзістых захворваннях. Прымяняецца як жаўцягонны і мачагонны, а семкі яшчэ і глістагонны сродак. Калі мучыць бяссонніца, выпіце на ноч 50 г гарбузовага соку з мёдам. Свежы гарбузовы сок карысны ўсім: для профілактыкі адкладання соляў, пры вывядзенні камянёў з нырак, пры лячэнні адэномы — па 1 шклянцы ў дзень на працягу 2—3 тыдняў. Акрамя ўсяго іншага, пектыны гарбуза садзейнічаюць вывядзенню з арганізма халестэрыну.

З гарбуза можна зрабіць хатнія нарыхтоўкі.

Сок гарбузова-яблычны. Гарбуз здрабніць, адцісnуць сок і змяшаць яго з яблычным сокам, дадаць цукар на смак і лупіну лімона. Нагрэць да 90 градусаў, разліць у гарачыя стэрылізаваныя слоікі, стэрылізаваць пры 90 градусах 8—10 хвілін, закатаць. На 1 кг гарбуза 1 кг яблыкаў, цукар на смак.

Мёд з гарбуза. Гарбуз пачысціць, нарэзаць кубікамі, пасыпаць цукрам і пакінуць на 2—3 гадзіны. Затым падаграваць на слабым агні. Лішні сок, па меры яго выдзялення, зліваць. У сок пакласці молатую карыцу і варыць да загусцення. 1 кг гарбуза, 25—30 г цукру, 0,5 г карыцы.

Марынаванне. Узяць гарбуз, які добра выспеў, зняць лупіны, пачысціць ад насення, нарэзаць кубікамі памерам 1 см, на 1—2 хвіліны апусціць у вар і адразу ж астудзіць у халоднай вадзе. Падрыхтаваныя долькі гарбуза перакласці ў слоікі з прыправамі. Падрыхтаваць марынад, давесці да кіпення і заліць да верху, закатаць. Стэрылізаваць у кіпячай вадзе: 0,5-літровыя слоікі— 12—15 хвілін, літровыя — 20—25 хвілін. Марынад: 1 л вады, 100 г сталовага воцату, 30 г солі, 20 г цукру, 6—8 зярнят гваздзікі, 10 —12 штук чорнага перцу.

Павідла з гарбуза. Пачысціць гарбуз, нарэзаць скрылёчкамі, на 10 хвілін апусціць у раствор пітной соды. Затым прамыць кавалачкі гарбуза ў халоднай вадзе, пакласці ў вялікую міску, дадаць 2—2,5 кг цукру, 2—3 шклянкі вады. Варыць як звычайнае варэнне, потым дадаць яшчэ 2,5 кг цукру, даліць вады і варыць да таго часу, пакуль сіроп не пацямнее. За 5—10 хвілін да заканчэння варкі дадаць лімонную кіслату. На 6 кг гарбуза — 4,5—5 кг цукру.

Краіна здароўя

Выпуск
№ 41 (97)

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Вядомы рэкардсмен свету беларус Вячаслаў ХАРАНЭКА дэманструе свае здольнасці толькі за здаровы лад жыцця.

Здароўе на талерцы

САКАВІТЫЯ ВІНАГРАДЗІНЫ — «ТАБЛЕТКІ» АД АНЕМІІ І АТЭРАСКЛЕРОЗУ

Вінаград — упадабаны ласунак для многіх з нас. Аднак гэтыя ягады не толькі смачныя, але і карысныя. Хімічны склад вінаграду надзвычай багаты: у ім утрымліваюцца глюкоза і фруктоза, клятчатка, арганічныя кіслоты (яблычная, вінная, лімонная і інш.), вітаміны С, Р, РР, К, правітамін А, фоліевая кіслата, пекцінавыя рэчывы, макра- і мікраэлементы (калій, кальцый, жалеза, цынк, марганец, магній), ферменты (пекціназа, пратэаза і інш.).

Як бачна, вінаград змяшчае тры вітаміны, якія маюць прамое дачыненне да крывятворнай сістэмы: фоліевая кіслата стымулюе кроватварэнне, вітамін К уплывае на згусальнасць крыві, а вітамін Р умацоўвае сценкі крывяносных сасудаў. Таму вінаград вельмі карысны пры малакроўі.

Дыетолагі раяць есці вінаград паміж прыёмамі ежы. Каб пазбегнуць расстройства жывата, вінаград не рэкамендуецца спалучаць з салёнымі і тлустымі стравамі, а таксама запіваць яго кефірам, малаком, газаванай вадой, квасам.

УВАГА! Ужыванне вінаграду ў вялікай колькасці проціпаказана пры цукровым дыябеце, атлусценні, язвавай хваробе, энтэракаліце, пры язвах у поласці рота. Вінаград садзейнічае разбурэнню зубной эмалі, таму, паласкаўшыся вінаградам, прапаласкаць рот содавым растворам.

Фруктовая салата

Вам спатрэбіцца: ківі, яблык, банан, сок аднаго лімона, 200 г вінаграду, 50 г вадкага мёду, здробненыя арэхі.

Усе фрукты, акрамя вінаграду,

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Прыхільнікі здаровага харчавання цэняць вінаград за яго здольнасць выводзіць з арганізма таксіны і зніжаць узровень шкоднага халестэрыну ў крыві. А калі так, у аматараў вінаграду ёсць усе шанцы пазбегнуць праблем з сасудамі.

Вінаград, асабліва мускатныя гатункі, вызначаецца фітанцыднымі ўласцівасцямі: ён прыгнятае рост гніласнай кішэчнай флоры, забівае кішэчную палачку і халерны вібрыён.

Вялікая колькасць глюкозы ператварае вінаград у цудоўны танізуючы сродак. Калі вы стамілісся на працы — з'ешце гронку вінаграду і сілы хутка адновяцца.

Вінаградны сок — добры мачагонны сродак, актыўна выводзіць з арганізма мачавую кіслату і перашкаджае ўтварэнню камянёў.

Прыхільнікі здаровага харчавання цэняць вінаград за яго здольнасць выводзіць з арганізма таксіны і зніжаць узровень шкоднага халестэрыну ў крыві. А калі так, у аматараў вінаграду ёсць усе шанцы пазбегнуць праблем з сасудамі.

Вінаград, асабліва мускатныя гатункі, вызначаецца фітанцыднымі ўласцівасцямі: ён прыгнятае рост гніласнай кішэчнай флоры, забівае кішэчную палачку і халерны вібрыён.

Вялікая колькасць глюкозы ператварае вінаград у цудоўны танізуючы сродак. Калі вы стамілісся на працы — з'ешце гронку вінаграду і сілы хутка адновяцца.

Вінаградны сок — добры мачагонны сродак, актыўна выводзіць з арганізма мачавую кіслату і перашкаджае ўтварэнню камянёў.

Дыетолагі раяць есці вінаград паміж прыёмамі ежы. Каб пазбегнуць расстройства жывата, вінаград не рэкамендуецца спалучаць з салёнымі і тлустымі стравамі, а таксама запіваць яго кефірам, малаком, газаванай вадой, квасам.

УВАГА! Ужыванне вінаграду ў вялікай колькасці проціпаказана пры цукровым дыябеце, атлусценні, язвавай хваробе, энтэракаліце, пры язвах у поласці рота. Вінаград садзейнічае разбурэнню зубной эмалі, таму, паласкаўшыся вінаградам, прапаласкаць рот содавым растворам.

Фруктовая салата

Вам спатрэбіцца: ківі, яблык, банан, сок аднаго лімона, 200 г вінаграду, 50 г вадкага мёду, здробненыя арэхі.

Усе фрукты, акрамя вінаграду,

Бяспечнае харчаванне

НЕ ЎСЁ ТОЕ ДОБРАЕ, ШТО СОК

Калі вы прымаеце тыя ці іншыя лекавыя прэпараты, распытайце свайго ўрача і аб тым, якія прадукты харчавання лепей было б выдаліць са штодзённага рацыёну, а таксама аб тым, ці можна паралельна з хімічнымі рэчывамі спажываць травяныя настоі, біялагічна актыўныя дабаўкі і нават вітаміны. Не бярыце на сябе смеласць вырашаць, што для вас будзе лепш. Даверце гэта спецыялісту.

Далёка не кожнае рэчыва і яго ўплыў на наш арганізм вывучаны дакладна і поўнасцю. Даследаванні працягваюцца, а гэта азначае, што і наша насцярожанасць не павінна засыпаць. Узяць хоць бы грэйпфрутавы сок, аб асаблівасцях якога ў народзе складаюцца цэлыя легенды. Магчыма, на тое ёсць падставы.

Паводле аднаго даўняга амерыканскага даследавання, у складзе грэйпфрутавага соку ёсць рэчыва, небяспечнае пры ўзаемадзеянні з некаторымі лекамі. Было ўстаноўлена, што менавіта згаданы сок павялічвае ўсмоктванне многіх лекаў з кішэчніка, паколькі спецыфічныя сокавыя рэчывы не блакуюцца ферментамі страўнікава-кішачнага тракту. Такім чынам, высокая канцэнтрацыя лекаў, якія прымяняюцца пры лячэнні хваробаў сэрца і гіпертаніі, а таксама антыбіётыкаў, гармонаў і іншых сродкаў, пранікае ў арганізм. Гэта можа прывесці да перадазіроўкі прэпаратаў. Іншымі словамі, тым, хто актыўна ўжывае грэйпфрутавы сок, варта было б рэкамендаваць лекі ў меншых дозах. Аднак пакуль пытанне не ставіцца такім чынам. Гаворка ідзе аб праверцы іншых сокаў і прадуктаў харчавання на наяўнасць спецыфічных актыўных кампанентаў.

Так ці інакш, якому б соку вы ні аддавалі перавагу, прытрымлівайцеся, калі ласка, некалькіх простых правілаў:

1. Запівайце лекі і вітаміны толькі вадой.

2. Заўсёды ўважліва чытайце і перачытвайце інструкцыю.

3. Не прызначайце сабе таблеткі па ўласным жаданні або паводле парады суседа.

4. Не адмаўляйцеся цалкам ад ужывання грэйпфрутавага або іншых сокаў.

5. Майце на ўвазе, што як усё расліннае, «жывое» сокі прафілактуюць шэраг хвароб, насычаюць арганізм неабходнымі рэчывамі. Акрамя таго, свежы сок або свежы фрукт ці гародніна перашкаджаюць лёгкаму засваенню тлушчаў.

6. Звяртайце ўвагу на ўтрыманне цукру ў пакетаваных соках. Такія напоі прынясуць не столькі карысці, колькі лішняй вагі.

7. Піце свежаадціснутыя сокі, разбаўляйце іх паміж сабой, дадавайце ў зробленую з любоўю да сябе «сумесь» простую ваду.

Падрыхтавала Святлана БАРЫСЕНКА.

І ў капусце — пуста, і бусел не спяшаецца...

Дзеці будуць!

Дзесьці 16—18 працэнтаў шлюбных пар сутыкаюцца з праблемай зачацця дзіцяці — маюць дыягназ бясплоднасці. Такі дыягназ можа быць выстаўлены не толькі аднаму з партнёраў, але і абодвум адразу. Што датычыцца недакладнай лічбы колькасці бясплодных пар, то тут варта мець на ўвазе той факт, што шлюбная пара можа звярнацца са сваёй праблемай як у жаночую кансультацыю, так і ў спецыялізаваны цэнтр, што ўскладняе збор адназначных даных.

Спецыялісты сцвярджаюць, што колькасць шлюбных пар, якім спатрэбіцца асаблівая дапамога для зачацця дзіцяці, будзе пакрысе прырастаць. Абумоўлена гэта змірагам прычын, сярод якіх добра вядомы нездаровы лад жыцця — шкодныя звычкі, несумяшчальныя са здаровым бацькоўствам. Акрамя гэтага, актыўна заяўляе пра сябе і ўздзеянне сродкаў з іанізуючым выпраменьваннем. Шэраг зручных рэчываў, без якіх сучасны чалавек не ўяўляе жыцця, так ці інакш уплывае на наш арганізм, і перш-наперш на клеткі, якія хутка дзялюцца — сперматазоіды і яйцаклеткі.

Ад якіх жа менавіта захворванняў, несумяшчальных з цяжарнасцю, пакутуюць жанчыны і мужчыны, і ў якой ступені сучасная медыцына можа дапамагчы ім рэалізаваць сваю рэпрадуктыўную функцыю?

Бясплоднай, як вядома, лічыцца пара, у якой цяжарнасць не наступіла на працягу года неабароненага палавога жыцця. «Чым раней гэта пара звернецца па дапамогу спецыялістаў, тым лепей прагноз, — кажа загадчыца аддзялення планавання сям'і і дапаможных рэпрадуктыўных тэхналогій РНПЦ «Маці і дзіця» Ала КАМЛЮК. — Лічыцца, што пры паслядоўным прымяненні ўсіх метадаў пераадолення бясплоднасці — ад стымуляцыі авуляцыі да экстракарпаральнага апладнення — можна дабіцца станоўчага выніку ў 80 працэнтах выпадкаў».

Прыкладна 40—50 працэнтаў выпадкаў бясплоднасць абумоўлена жаночым «фактарам», 30—40 — мужчынскім, у астатніх выпадках — камбінаваным. Напачатку паспрабуем разабрацца з прычынамі, якія найчасцей перашкаджаюці жанчыне зацяжарac без дапамогі «звонку». Цяжарнасць наступае ў фалопіевых трубах, куды яйцаклетка трапляе з яечніка і дзе сустракаецца са сперматазоідам. Пры спрыяльных умовах надыходзіць апладненне, і эмбрыён накіроўваецца па трубе ў матку, ва ўнутраным слаі якой — эндаметрыі — «пасяляецца» на належны тэрмін. Пры паражэнні матачных труб падобны працэс немагчымы.

Прыроджаная паталогія непраходнасці труб сустракаецца надзвычай рэдка. Іншая справа, непраходнасць набытая, паспрыяць якой можа фактычна любая інфекцыя. Інфекцыі здольныя справакаваць зліпанне або парушэнне эпітэлія — клетак, якія высцілаюць трубу знутры і «выпрацоўваюць» вадкасць, што спрыяе сустрэчы сперматазоіда з яйцаклеткай. Інфекцыі могуць пагоршыць рухальную актыўнасць труб.

— У першую чаргу варта гаварыць пра інфекцыі, якія перадаюцца палавым шляхам, хоць шкодната ўздзеяння можна чакаць ад самых розных узбуджальнікаў, скажам, стрэптакоку ці стафілакоку, — тлумачыць Ала Мечыславаўна. — Нездарма прафілактыка бясплоднасці заключаецца ва ўстрыманні ад палавых кантактаў, здольных інфіцыраваць палавую сферу... Спрыяльным фактарам для інфіцыравання можа быць і перарыванне цяжарнасці ў жанчыны з не вельмі добрай мікрафлорай. Падчас згаданай працэдуры кроў можа трапіць ў матачныя трубы, што прывядзе да другасных змяненняў, спрыяльных для бясплоднасці...

У ідэале інфекцыю варта было б як мага хутчэй выявіць і пралячыць. На практыцы ж востры працэс інфіцыравання можа праходзіць незаўважна для жанчыны і даволі хутка пераходзіць у хранічны. Вось адкуль такі распаўсюджаны дыягназ — хранічны аднэксіт, запаленчы працэс з пэўнымі анатамічнымі зменамі ў трубах. Другая праблема заключаецца ў тым, што далёка не з кожнай інфекцыяй можна развітацца, нават калі выявіць яе як мага раней. Так, інфекцыі вірусная паходжання сучасная медыцына здольная толькі прывесці ў неактыўны стан, дабіцца працяглай рэмісіі і рэдкіх рэцыдываў, але не вынішчыць апошнія цалкам. Калі інфіцыраванне вірусам таго ж герпесу адбылося да цяжарнасці, значыць, у жанчыны выпрацаваўся імунітэт, спецыяльныя абарончыя бялкі. Абароненая маці абаронціць ад віруса і будучае дзіця. Зусім іншая справа, калі першая сустрэча з герпесам адбылася падчас цяжарнасці, — гэта вельмі небяспечна.

Не існуе дакладных даследаванняў адносна ўплыву на плод яшчэ аднаго досыць шырока распаўсюджанага ў папуляцыі віруса — віруса папіломы чалавека. Небяспека віруса папіломы для жанчыны заключаецца ў яго здольнасці выклікаць змяненні клетак шыйкі маткі. Чым цяжэй клетачнае паражэнне, тым больш верагоднае наступленне анкалагічнага захворвання. У мэтах прафілактыкі раку шыйкі маткі развітыя краіны ахыцяўляюць у межах дзяржаўных праграм вакцынацыю дзяўчынак ва ўзросце 12—14 гадоў. Так, у будучым, калі яны і сустрэнуцца з вірусам папіломы, ён не справакуе сур'ёзныя паражэнні. Падобная вакцынацыя даступна і беларускам, праўда, пакуль гэта справа добраахвотная і платная.

— Сярод нашага насельніцтва захоўваецца яшчэ і туберкулёзная інфекцыя, — кажа Ала Камлюк. — Палачка Коха можа паражаць розныя органы, у тым ліку і дзетародныя органы, што становіцца прычынай бясплоднасці. Калі пры абследаванні ў гінеколага ўзнікаюць падазрэнні адносна гэтай інфекцыі, жанчыне прапануецца кансультацыя фтызіятра-колага ў супрацьтуберкулёзным дыспансэры...

Адсутнасць наступлення цяжарнасці па прычыне парушэння авуляцыі сустракаецца ў кожным трэцім выпадку. Авуляцыя — гэта той час, калі можна зацяжарac пры неабароненым палавым кантакце. Праўда, устанаўленне факта авуляцыі яшчэ не азначае, што цяжарнасць магчымая толькі ў гэтыя дзень-два. Тым не менш жанчынам, якія плануюць цяжарнасць, спецыялісты раяць дакладна ўстанаўліваць момант авуляцыі з дапамогай вымярэння базальнай тэмпературы або спецыяльных тэст-палосак — хатняга тэста на авуляцыю з мачой, які прадаецца ў кожнай аптэцы. Для таго, каб з большай верагоднасцю гаварыць аб надыходзе цяжарнасці, рэкамендуецца ўстанаўліваць факт наступлення авуляцыі на працягу некалькіх менструальных цыклаў.

Паводле слоў Алы Камлюк, працэс авуляцыі кантралюецца гармонамі, якія выпрацоўваюцца ў пэўных цэнтрах галаўнога мозга. Парушэнне авуляцыі можа быць абумоўлена паражэннем як на ўзроўні пэўных цэнтраў мозга, так і на ўзроўні яечнікаў, якія адгукаюцца на мазгавую стымуляцыю. «Збоі» ў авуляцыі адносяцца да ліку эндакрынных прычын бясплоднасці.

Лічыцца, што эндакрынная бясплоднасць лечыцца больш эфектыўна, чым механічная. Сярод метадаў карэкцыі, стымуляцыі авуляцыі выключаецца гарманальны, бадай, самы непрымальны для пацыентак. Тым не менш гінеколагі сцвярджаюць, што боязь гарманальнага лячэння не мае пад сабой ніякіх падстаў, паколькі чалавек наогул жыве дзякуючы гармонам — гармону росту, гармонам шчытападобнай залозы, інсуліну і г.д. Таму і ў аналагах, якія замяшчаюць гармоны, што паўнавы былі б выпрацоўваюць яечнікі, няма нічога дрэннага.

На трэцім месцы па частаце прычын бясплоднасці — мужчынскі фактар. Як правіла, паралельна з абследаваннем жанчыны абследуецца і мужчына, эякулят якога даследуецца па шэрагу параметраў. Па спермаграме можна дакладна сказаць, ці фертыльны (здольны да апладнення) мужчына і ў якой ступені. Да змяненняў сперматагенезу прыводзяць анатамічныя змяненні, захворванні і траўмы, перанесеныя ў дзяцінстве, гарманальныя праблемы, запаленчыя працэсы, абумоўленыя ўсё тымі ж інфекцыямі. Лячэнне мужчын бывае працяглым і патрабуе асаблівага рэжыму жыцця.

— Хацелася б, каб мужчыны актыўна ўдзельнічалі ў працэсе планавання сям'і, — адзначае Ала Мечыславаўна. — Не толькі маці, але і бацька нясе свой генетычны матэрыял будучаму дзіцяці. Шлюбная пара, якая сутыкнулася з праблемай зачацця, павінна мець на ўвазе, што на кожным этапе лячэння нельга выключаць магчымасць няўдачы. На вялікі жаль, пры вялікіх магчымасцях сучаснай медыцыны не існуе стопрацэнтных спосабаў пазбаўлення бясплоднасці. Спецыялісты зробяць усё належнае, але патрабавальнымі мужчына і жанчына павінны быць у першую чаргу да сябе...

Святлана БАРЫСЕНКА.

Лечымся без лекаў

СІНЯВОКІ ДОКТАР ЛЁН

Лён, чыя лацінская назва перакладаецца як «найбольш карысны», з даўніх часоў з'яўляецца адной з самых папулярных раслін у славянскіх народаў. Ужо тады нашы продкі ведалі, што ў спякоту льняная вопратка захоўвае прахалоду, а ў холад — дорыць цяпло. З насення лёну яны атрымлівалі алей, які выкарыстоўвалі як для прыгатавання ежы, так і для лячэння рознай немачы. Унікальныя гаючыя ўласцівасці лёну не забыты і сёння.

З лекавай мэтай выкарыстоўваюцца льняное насенне і алей.

Дзякуючы багатаму складу насенне лёну можна лічыць нутрыцэўтыкам, г. зн. прадуктам, які ўмацоўвае і аздараўляе арганізм чалавека. Насенне лёну змяшчае пратэіны, поліцукрыды, раслінныя валокны (лігнаны), поліненасычаныя тлустыя кіслоты (альфа-ліналенавая, лінолевая і інш.), вітаміны А, В, Е, F. Кожны з гэтых кампанентаў уносіць свой уклад у працэс аздараўлення. Напрыклад, альфа-ліналенавая кіслата (амега-3) — незаменная тлустая кіслата ў рацыёне чалавека, яна дабратворна ўплывае на ўсе працэсы жыццядзейнасці чалавечага арганізма, уваходзіць у склад практычна ўсіх клетачных мембран, удзельнічае ў рэгенерацыі сардэчна-сасудзістай сістэмы, у росце і развіцці мозга. Раслінныя валокны стымулююць дзейнасць кішэчніка, нармалізуюць яго мікрафлору. Слізь, якую выдзяляе спелае насенне лёну, аказвае абвалакальнае, змякчальнае, процізапаленчае дзеянне і паспяхова прымяняецца пры лячэнні хвароб страваваль нага тракта і дыхальных шляхоў. Слізь, прынятая ўнутр, доўга ўтрымліваецца на слізістых абалонках, чым перашкаджае ўсмоктванню з кішэчніка ядавітых рэчываў, што ўтварающа пры інфекцыйных захворваннях і атручэннях.

● **Для лячэння і прафілактыкі захворванняў страўнікава-кішачнага тракта:** 2 ст. лыжкі насення лёну заліваюць 1 шклянкай гатаванай вады і даюць настояцца 10 хвілін. П'юць слізісты настой па паўшклянкі да яды.

● **Для ачышчэння сасудаў:** вечарам 1/3 шклянкі насення заліваюць літрам вады, даводзяць да кіпення і 2 гадзіны трымаюць на вадзяной лазні. За ноч адвар настоіцца, раніцай яго трэба працадзіць. Атрымліваецца прыкладна 850 мл кіселепадобнай вадкасці. Яе рэкамендуецца выпіць за 5 дзён. Піць трэба па 1/3 шклянкі раніцай нашча і вечарам да яды. Для таго каб быў найлепшы эфект, адвар неабходна прымаць 15 дзён.

● **Для агульнага аздараўлення** можна проста пастаянна ўжываць у ежу цэлыя або молатыя зярняткі лёну — прыкладна 50 г у дзень на працягу некалькіх месяцаў.

Дабаўленне ў ежу 1—1,5 ст. лыжкі харчовага льнянога алею **дзецям з хранічнымі захворваннямі дыхальных шляхоў** — цудоўны спосаб папярэдзіць абвастрэнне запаленчага працэсу. Аслабленым дзецям можна таксама 2—3 разы на дзень даваць па 1 ч. лыжцы лекавай сумесі, прыгатаванай з 3 ч. лыжак парашку льнянога насення і 1 ч. лыжкі цукру.

● Насенне лёну дадаюць у **процідыябетычны збор,** куды пароўну ўваходзяць стручкі фасолі (без зярнятак), лісце чарніц і салома аўсу. (Замест саломы лепш выкарыстоўваць зялёны авёс, сабраны і высушаны ў стадыі калашэння.) Для прыгатавання настою 3 ст. лыжкі здробненай сумесі заліваюць 3 шклянкамі гарачай вады, кіпяцяць на слабым агні 15 хвілін, затым ахалоджваюць і працэджваюць. Прымаюць настой па 1/3 шклянкі 3 разы на дзень у час яды. (Такі ж настой можна піць і пры запаленні мачавога пухіра.)

● **Пры падагры і рэўматызме:** 2 ч. лыжкі насення варыць 25 хвілін у шкляцы вады. Настойваць 10 хвілін, працадзіць праз марлю. Прымаць па 1 ст. лыжцы 4 разы на дзень.

● **Пры хранічных запорах** рэкамендуецца штодзень на ноч прымаць па шкляцы непрацэджанага настою насення лёну, прыгатаванага з разліку 1 ч. лыжка насення на 1 шклянку кіпеню.

● **Пры кашлі як адхаркавальнае** прызначаюць ільняную слізь: 3 г насення заліваюць 0,5 шклянкі гатаванай вады, узбоўтваюць 15 хвілін, а пасля працэджваюць. Прымаюць па 2 ст. лыжкі 3—4 разы на дзень. (Слізь павінна быць заўсёды свежай, таму яе гатуюць толькі на адзін дзень.)

● **Калі ацыкаюць ногі:** 4 ст. лыжкі насення ўсыпаць у 1 л вады, кіпяціць 10—15 хвілін. Настойваць у цяпле гадзіну. Можна не працэджваць. Піць па паўшклянкі кожныя дзве гадзіны.

● **Ад глістоў** рэкамендуецца прымаць унутр ільняны алей па 1 ст. лыжцы 2—3 разы на дзень.

● У народнай медыцыне папулярны **кампрэс з насення лёну.** Здробненае насенне змяшчаюць у марлевы мяшочак, які апускаюць прыкладна на 10 хвілін у гарачую ваду, а затым прыкладваюць гарачым да хворага месца і трымаюць, пакуль ён не астыне. Такім чынам лечаць зубны боль, ішыяс і рэўматызм, хваробы мачавога пухіра і нырак.

● Парашок з насення лёну прымяняецца **пры апёках і скурных хваробах.** Для гэтага 20 г парашку трэба змяшаць з вадой, пракіпяціць. Сурвэткі, змочаныя ў адвары, накладваць на пашкоджаную скуру ў выглядзе кампрэсаў.

● Ільняное насенне, адварнае на малацэ, прыкладваюць як кампрэс **пры лячэнні пятачных шпор.**

● Штодзённыя цёплыя ванначкі для ног з адварам насення лёну (2 ст. лыжкі на літр кіпеню) **знімуць стомленасць, палепшаць кровазварот, ачысцяць скуру.** Адвар уліце ў ваду пакаёвай тэмпературы і патрымайце ў ім ногі 10—15 хвілін.

УВАГА! Проціпаказана ўжываць лён унутр пры частых паносах.

Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.

У чаргу за здароўем

У суботу, 13 верасня, у Бялынічах ўрачыста адкрыецца шматпрофільны фізкультурна-аздараўленчы комплекс «Друць».

У сучасным двухпавярховым будынку размясціліся спартыўная арэна на 730 месцаў, басейн з 25-метровымі дарожкамі, малыя залы — трэнажорная, для фітнэсу, для барацьбы і дзюдо.

На будаўніцтва і абсталяванне спартыўнага комплексу з бюджэту выдаткавана 18 мільярдаў рублёў. Менавіта тут будзе асноўная пляцоўка жаночай гандбольнай каманды «Друць-Блепак», якая гуляе ў вышэйшай лізе чэмпіянату Беларусі. У дзень адкрыцця бялыніцкія гандбалісткі правядуць таварыскую сустрэчу з камандай з Бабруйска.

Адначасова комплекс можа прыняць да 1000 наведвальнікаў. Займацца спортам і фізкультурай можна штодня, з 6 да 23 гадзін. Паводле папярэдняй інфармацыі, цэны на паслугі — 3—3,5 тысячы рублёў за гадзіну.

Для вучняў усіх школ Бялынічскага раёна ў «Друці» будуць праходзіць урокі плавання. На наведванне басейна і спартыўных залаў людзі ўжо запісваюцца ў чаргу — не толькі з Бялынічаў, але і з суседніх раёнаў.

Ілона ІВАНОВА.

Інфарм-укол

У КОЖНАЙ «АПТЭЧЦЫ» КОЖНАЙ ГАСПАДЫНІ

У 50-я гады мінулага стагоддзя фармацэўтычныя кампаніі пачалі выпрабляць сінтэтычныя лекі. Прыродныя сродкі адышлі на другі план. Але цяпер стаўленне да іх мяняецца, і фармацэўтычныя кампаніі бяруць на ўзбраенне некаторыя рэцэпты на аснове раслін.

У асобных выпадках расліны бываюць нават больш эфектыўнымі, і пры гэтым заўсёды маюць значна менш пабочных эфектаў. Адна расліна, па сутнасці, можа даваць эфект некалькіх лекаў — з-за вялікай колькасці кампанентаў, якія ў ёй утрымліваюцца. Універсальныя раслінныя сродкі можна вырасціць у сваім садзе, дома ў гаршку або купіць у магазіне.

ІМБІР. Утрымлівае малекулы, якія паляпшаюць кровазварот усіх тканак арганізма. Яго звычайна прызначаюць пры праблемах з цыркуляцыяй крыві, сутаргах і прыступах болю. Ён прымяняецца як сродак супраць млоснасці, стымулюе сакрэцыю стрававальных ферментаў і паляпшае ўсмоктванне пажыўных рэчываў.

ЧЫЛІ. Хімічнае рэчыва, якое надае перцу вастрыню, сагравае арганізм. Канадскія вучоныя адкрылі, што гэтае дзеянне паскарае ўсе хімічныя рэакцыі, уключаючы абмен рэчываў. Акрамя таго, чылі — супрацьзапаленчы сродак, які дапамагае змагацца з інфекцыямі. Дзякуючы сагравальным вартасцям, чылі выдатна выдаляе з арганізма лішак слізі, дамагае пераадолець насмарк, кашаль і г.д.

ЧАБОР (Тимьян). Утрымлівае алеі, якія забяспечваюць яго моцныя антыбактэрыяльныя вартасці. Было выяўлена, што гэтыя кампаненты забіваюць бактэрыі, што выклікаюць інфекцыі дыхальных шляхоў і дапамагаюць ачысціць лёгкія. Пры запаленні дзясны, дапаможа чабаровы чай або паласканні рота настоем. Паколькі антыбактэрыяльнымі вартасцямі валодаюць менавіта фітанцыды чабару — эфірныя алеі, то можна проста расціраць свежае лісце ў руках і ўдыхаць водар.

ШАЛФЕЙ. Дапамагае зменшыць прылівы падчас менапаўзы — верагодна, такі эфект абумоўлены наяўнасцю фітаэстрагенаў. Акрамя таго, ён валодае вяжучым дзеяннем і ўтрымлівае супрацьмікробныя алеі: паласканне горла чаем са свежага шалфею пры першых прыкметах хваробы дапаможа спыніць распаўсюджванне інфекцыі. Лічыцца, што шалфей дапамагае пры разумовай стомленасці, паляпшае канцэнтрацыю і памяць.

КАРЫЦА. Паніжае ўзровень халестэрыну, дапамагае сасудам. Нават невялікая колькасць карыцы дапамагае збалансаваць узровень цукру. Даследаванні ў Цэнтры харчавання чалавека ў Мэрылэндзе (ЗША) даказалі, што ўсяго толькі палова чайнай лыжкі карыцы ў дзень значна змяншае ўзровень цукру ў крыві і паляпшае страваванне. Яе можна дадаць у чай, каву або нават прыправіць любую страву. Як ні дзіўна, карыца цудоўна спалучаецца не толькі з мучнымі, але і мяснымі вырабамі.

МЯТА ПЕРЦАВАЯ. Мята дапамагае пры галаўным болі і паляпшае работу мозгу. Даследчыкі Універсітэцкай неўралагічнай клінікі Кейла ў Германіі выявілі, што нанясенне некалькіх кропель алею перцавай мяты на лоб дапамагае пазбавіцца ад галаўнога болю. Акрамя таго, мята змяншае напружанне мышцаў, здымае неспакой і паляпшае настрой. Эксперыменты ў Цэнтры харчавання чалавека ў Мэрылэндзе паказалі, што перцавая мята ўзмацняе дзеянне прэпаратаў ксімітэрапіі. Для паляпшэння стрававання можна дадаць лісця мяты ў чай. Каб пазбавіцца нервовага напружання, неспакою, палепшыць сон, трэба завярнуць свежае лісце мяты ў бавоўняную тканку, злёгку памяць у руках і пакласці каля галавы.

КУРКУМА. Утрымлівае магутныя антыаксіданты, якія нейтралізуюць свабодныя радыкалы — нестабільныя часціцы, што атакуюць і разбураюць клеткі. Нездарма ў Індыі на працягу многіх стагоддзяў яна лічыцца сродкам, які захоўвае маладосць і прыгажосць. Амерыканскія даследчыкі сцвярджаюць, што куркума можа аказваць станоўчы эфект пры хваробе Альцгеймера і змяншаць ацёкі пры артрыце. Даследаванні, праведзеныя ў Тэхаскім універсітэце, паказваюць, што куркума можа блакаваць развіццё раку скуры і папярэджваць распаўсюджванне раку малочнай залозы. Яе можна выкарыстоўваць і як супрацьзапаленчы сродак пры праблемнай скуры.

КАЛЯНДРА. Эфірныя алеі, якія ўтрымліваюцца ў лісці календары, павышаюць апетыт і паляпшаюць страваванне, стымулююць сакрэцыю страўнікавага соку. Флаваноіды паляпшаюць кровазварот, таму календра карысная тым, хто часта лятае самалётам. Насенне календры валодае мачагонным дзеяннем і дапамагае выдаліць з арганізма лішак вады.

Вядучая рубрыкі Святлана БАРЫСЕНКА.

Сямейны псіхолаг Святлана Анішчанкава

АДЗІНАЯ І НЕПАЎТОРНАЯ

«Святлана, вырашыла напісаць вам з вялікай надзеяй на тое, што вы мне дапаможаце. Я сама не змагу разабрацца ва ўсім тым, што са мной адбываецца.

Я кахаю жанатага мужчыну. Мы сустракаемся ўжо больш за шэсць гадоў. Першыя гады было прасцей, мяне не засмучала тое, што ён чужы муж, муж другой жанчыны. Цяпер гэта баліць амаль пастаянна.

Свая сям'я не склалася з самага пачатку. Нягледзячы на нараджэнне двух сыноў, муж так і не стаў родным і блізкім чалавекам. Заўсёды здзіўляў сваім эгаізмам і жорсткасцю, як і ў адносінах да дзяцей. Мы ў разводзе ўжо гадоў дзесяць, але жывём разам, хоць у кожнага ёсць свой дом. Як ён кажа, дзеля дзяцей.

Амаль гэтак жа жыве мой каханы чалавек. Акрамя таго, у яго жонкі таксама ёсць другі мужчына, але ж мяняць мой каханы нічога не хоча. Кажа, што на такі крок у яго няма ні сілаў, ні здароўя. Позна. Ды і як паглядзіць на гэта дачка, хоць ёй за дваццаць гадоў. Дый у мяне ёсць дзеці. Ён лічыць, што калі мы будзем жыць разам, то пачуцці адыдуць і застануцца адны праблемы. Жаніўшыся ў маладосці з жанчынай з дзіцем, ён ведае, як цяжка выйсці з такой сітуацыі. Ён вельмі адказны.

А я ўжо не магу дзяліць яго з жонкай. За гэтыя гады ён стаў мне такім блізкім, што я магу нават чытаць яго думкі. І расстацца з ім сабе не ўяўляю. Мне здаецца, што застанецца існаванне, а не жыццё. Так ужо было да яго.

Святлана, я так мяркую, што са сваім прафесіяналізмам і вопытам вы падкажаце мне выйсце з сітуацыі і не асудзіце мяне за тое, што я ў ёй апынулася.

З павагай Вольга».

Замкнёнае кола здаецца непераадольным. Бывае, чагосьці жадаючы, чалавек імкнецца да мэты, але растрачвае свае сілы дарэмна. У адно не лепшае ў жыцці імгненне, калі сілы ўжо на зыходзе, са здзіўленнем разумее, што не прасунуўся ў сваіх стараннях ні на ёту. Так было ўчора, так будзе і заўтра. Прычына — шырока заплюшчаныя вочы, стан неўсвядомленага самазахавання арганізма ў перыяд эмацыянальнага дыскамфорту. Падарунак прыроды, якім жанчыне трэба карыстацца асцярожна. Уцёкі ад рэальнасці небяспечныя хваравітым вяртанне у... рэальнасць. Не ўсе з гэтым спраўляюцца, душэўныя траўмы могуць адвярнуць ад «звычайных» людзей, мужчын у прыватнасці, з іх недасканаласцю. Знаходзіцца ў казцы, дзе ёсць каханне і прынц, лягчэй, але сапраўднае жыццё — гэта ўсведамленне таго, што ёсць, і зыходзячы з гэтага — імкненне да гармоніі і парадку.

Форма сацыяльнай арганізацыі жыцця, пры якой адзін траўмуючы фактар (муж) прайграе за кошт другога траўмуючага фактара (любы чалавек) — не што іншае, як адаптацыя вашага арганізма. Так сёння вы бачыце свет. Так сёння вы хочаце жыць. Інакш была б зусім іншая гісторыя. Гэта значыць па факце працягласці адносінаў з двума мужчынамі можна гаварыць аб сітуацыі, якая найбольш зручная для вас. Таму што наша псіхіка выбірае для сябе максімальна зручнае становішча пры магчымых варыянтах. Заўжды мае сэнс давяраць сабе. Сітуацыя дэманструе такую, уласцівую менавіта вам, форму ўзаемадзеяння са знешнім светам. І асуджаць тут няма за што. Ёсць вы і вашы мужчыны. Адзін дрэнны, другі добры, і, як ні дзіўна гучыць, абодва яны дапамагаюць вам жыць. Прыміце дадзенасць як свой сённяшні выбар, усведамленне гэтага дапаможа вам найперш памірыцца з сабой і галоўнае — выбраць заўтрашні дзень.

Унутраны канфлікт ваш заключаецца не ў немагчымасці класічнага фіналу: «Я кахаю яго, ён кахае мяне, мы пажэнімся і будзем шчаслівыя ўсё жыццё...». Канфлікт у тым, што вы напісалі сцэнарый і размеркавалі ролі, але акцёраў яны не задавальняюць. А спектакль, як вы ўжо здагадваецеся, называецца «Шырока заплюшчаныя вочы». Імкненне ўзяць на сябе адказнасць за іншыя жыцці няўмольна прывядзе да знікнення сілаў і забярэ рэзервы.

Кахаць чужога мужчыну — нядзячная праца. Пасля зносінаў застаецца асадак, і з кожным годам яго становіцца ўсё больш, душа разбураецца трывогай і смуткам. Спрабуючы пазбегнуць вялікіх эмацыянальных страт, жаночая існасць хаваецца ў свой выдуманы свет. Там яе кахаюць, цэняць і чакаюць. Там заўжды лета, кветкі і маладосць. Там заўжды цёпла, а ў рэальнасці часта холад, слота і жорсткі вецер. Вечна галоднае жаночае сэрца не можа жыць без кахання. Яно — адзінокае — у пошуку, любячае — у смутку і трывозе. У любым выпадку каханне, сапраўднае, — гэта ахвяра.

Выходзьце са свайго цёплага свету і знайдзіце ў сабе сілы ўбачыць праўду — не сваю, зручную, а няўтульную аб'ектыўную праўду. Вырашыце, ці згодныя вы ахвяраваць сабой дзеля кахання. Вырашыўшы аднойчы, ідзіце да канца, цвёрда верачы ў правільнасць свайго рашэння і не шкадуючы аб выбраным, адзіна вашым, непаўторным шляху.

У дапамогу — асноўныя выкарыстаныя ў лісце эмоцыі. Перад вамі, насамрэ

Мікалай ЮРЧАНКА:

«НАШ КАЛЕКТЫЎ БАЧЫЦЬ ПЕРСПЕКТЫВУ І ПРАЦУЕ НА ЯЕ»

ПРАДСТАЎЛЯЕМ СУРАЗМОЎЦУ

Мікалай ЮРЧАНКА — ураджэнец Кармянскага раёна, дзе скончыў сярэднюю школу. Вышэйшую адукацыю атрымаў у Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі, пасля чаго па размеркаванні быў накіраваны ў свой жа раён і быў прызначаны эканамістам па працы ў калгасе «Камуніст». Малады і энергічны спецыяліст паказаў на гэтай пасадзе сябе з лепшага боку і неўзабаве ўзначаліў эканамічную службу прадпрыемства.

Некалькі гадоў Мікалай Пятровіч працаваў інструктарам райкама партыі, дырэктарам саўгаса «Кармянскі», намеснікам старшыні райвыканкама па эканамічных пытаннях, пасля чаго яго веды і вопыт спатрэбіліся на Буда-Кашалёўскім масласырзаводзе, які ён узначальваў. Пасля некаторы час працаваў ва ўпраўленні сельскай гаспадаркі і харчавання, а потым тры гады таму яму было прапанавана стаць дырэктарам Чачэрскага вінаробнага прадпрыемства.

Будынак вінзавода.

— Мікалай Пятровіч, ёсць версія аб тым, што ваша прадпрыемства з'яўляецца самым старэйшым сярод вінаробных заводаў краіны. Ці так гэта?

— Вінаробства на Чачэршчыне мае даўнія гістарычныя традыцыі, і першае ўпамінанне пра гэта адносіцца да часоў існавання Рэчы Паспалітай. Пасля падзелу яе ў 1773 годзе тутэйшыя землі ўвайшлі ў склад Расійскай Імперыі і чачэрскі маёнтак стаў уласнасцю графа Захара Чарнышова. Вінаробства ў маёнтку было пастаўлена на прамысловую аснову, аб чым сведчаць вось такія факты.

У Чачэрску паспяхова працавалі два вінакурныя заводы. У адной гістарычнай даведцы ўказана, што ў 1826 годзе тут было выраблена 10 тысяч вёдзер віна, а ў 1847 годзе, калі была праведзена іх рэканструкцыя, выпуск гэтых напояў павялічыўся, і яны прадаваліся ў Гомелі і Магілёве.

На базе ўладанняў Чарнышовых-Круглікавых у 1937 годзе зноў пачаў працаваць вінаробны завод, і летась мы адзначылі яго 70-годдзе. У час Вялікай Айчыннай вайны ён быў разрабаваны фашыстамі, а пасля вызвалення Беларусі аднаўлены. Да 1986 года калектыў працаваў стабільна, атрымліваў прыбытак.

— А потым?

— А потым завод стаў планавастратным. Бо пачалася так званая антыалкагольная кампанія і прадпрыемства было перапрафілявана на выпуск кансерваванай прадукцыі. Выпускаліся ў асноўным сокі. Так працягвалася да 1993 года, калі прадпрыемства зноў атрымала статус вінаробнага завода.

— І чым ён з'яўляецца сёння?

— У калектыве 135 чалавек: палова яго працаўнікоў — жанчыны, палова — мужчыны. Завод выпускае за год 408 тысяч дэкалітраў віна, якія вырабляюцца з натуральных сокаў. Тут функцыянуюць дзве лініі разліву напояў у бутэлькі ёмістасцю 0,5 і 0,7 літра. Апошняя (другая, значыць) была ўведзена ў строй у 2005 годзе. Летась у нас адбылася яшчэ адна прыемная падзея: была ўкаранёна і сертыфікавана сістэма менеджменту якасці ў адпаведнасці з СТБ ISO-9001-2001, якая дазволіла павысіць прэстыж прадпрыемства, забяспечыць стабільнасць якасці выпускаемай прадукцыі і ўмацаваць давер спажыўцоў.

— Наколькі я зразумеў, вашы віны — пладовыя мацаваныя, моцныя.

— Правільна. Але акрамя таго вырабляем араматызаваныя і палепшаныя якасці.

— А які іх асартымент?

— На сёння мы значна пашырылі яго, і ў вытворчасці цяпер 27 відаў вінаў.

— На паліцах магазінаў бачыў я віны вашага завода з такімі цікавымі, нават экзатычнымі назвамі: «Чечерский гармоник», «Колдовское озеро», «Для тебя», «Осенний роман», «Майский сад», «Смачнае», «Звездный вечер», «Баловница», «Бархатная ночь», «Лунное кружево» і гэтак далей. Хто іх прыдумвае?

— Ёсць і іншыя прыгожыя назвы. Напрыклад, «Губернатарскае». Аб ім кажу асобна, бо гэта адна з апошніх нашых распрацовак: віно палепшанай якасці. Летась на XI міжнародным конкурсе-дэгустацыі вінаў і каньякоў (брэндзі) яно было адзначана залатым медалём.

Тут у размову ўступілі загадчыца вытворчай лабараторыі Галіна Пернікава і тэхнолаг Кацярына Ратнікава. Яны расказалі аб тым, што на прадпрыемстве распрацавана і дзейнічае палітыка ў галіне якасці, якая ахоплівае ўсе моманты , што спрыяе павышэнню эфектыўнасці вытворчасці, паляпшэнню якасных характарыстык і экалагічных працэсаў і да т.п. Напрыклад, кантроль за захаваннем апошніх правадзіцца на ўсіх стадыях вытворчасці пачынаючы ад паступлення сыравіны (яблыкаў, чарніц, клубніц, парэчкі, вішні і г.д.) і заканчваючы выпускам віна. І гэта ажыццяўляе не толькі лабараторыя завода, але і іншыя адпаведныя арганізацыі. Спажывец можа быць спакойным: парушэнняў тут ніякіх няма, бо прадукцыя правараецца па ўсіх параметрах.

— Усё гэта так, Мікалай Пятровіч, але давайце паразважаем аб наступным. У народзе кант алкагольных напояў ёсць два трапныя выразы: віно віну робіць і ўся ісціна ў віне. Якое стаўленне ў вас да іх, калі, напрыклад, у Германіі ў некаторых пунктах на відным месцы стаіць шклянка з меткамі: «для мужчын», «для жанчын», «для асла», «для свінні». Што гэта значыць — каментарыі не патрэбны.

— Я цалкам згодны з указаным пастулатам: ва ўсім — і не толькі ў спажыванні алкаголю — патрэбна ведаць меру. Таму лічу тыя два выразы, якія вы прывялі, вельмі правільнымі. І шкада, што нашы любімцы ператварыліся ў сімвал п'янства. Ведаю, што ў народзе ходзіць шмат жартаў пра тое, што ў Чачэрску ў кожным двары вінакурня, але ж гэта не так. Ды і ў мінулым, калі ў нас было два вінзаводы, не ўсе ж займаліся самагонам. Ды і ў сучасных умовах, калі ў нас толькі адно прадпрыемства, не ўсе ж вырабляюць самагон. Ды і ў мінулым, калі ў нас было два вінзаводы, не ўсе ж займаліся самагонам. Ды і ў сучасных умовах, калі ў нас толькі адно прадпрыемства, не ўсе ж вырабляюць самагон.

Галіна Рыгораўна ПЕРНІКАВА, загадчык вытворчай лабараторыі.


Кацярына Валянцінаўна РАТНІКАВА, інжынер-тэхнолаг.

Выкананне плана асноўных паказчыкаў за студзень — чэрвень 2008 года

Паказчыкі	Адз. вымярэння	факт	Мінулы год	% к мінуламу году
Выраблена віна	тыс. дал	210	189	111,1
Таварная прадукцыя ў супастаўных цэнах	млн руб.	4433	3949	112,3
ТНП у рознічных цэнах	млн руб.	4928	4512	109,2
Таварная прадукцыя ў дзеючых цэнах	млн руб.	4928	3816	129,1
Сабекошт вытворчасці	млн руб.	4083,5	3247,2	125,8
Прыбытак ад вытворчасці	млн руб.	844,5	569,2	148,4
Рэнтабельнасць вытворчасці	%	20,7	17,5	3,2
Сярэд. спіс. колькасць працоўных УСЯГО	чал.	137	126	108,7
Сярэд. спіс. колькасць працоўных ППП	чал.	134	124	108,1
Фонд зарплаты	млн руб.	564,8	445,6	126,8
Сярэднямесячная зарплата	руб.	674 818	564 815	119,5
Прадукцыйнасць на 1 працоўнага супаст.	тыс. руб.	33 082,10	31 846,80	103,9
Рознічны тавараварот	млн руб.	413,3	223,9	184,6
Рэалізавана віна	тыс. дал	195	196	99,5
Выручка ад рэалізацыі з падаткамі	млн руб.	7292	5812	125,5
Падаткі з рэалізацыі	млн руб.	2717	2106	129,0
Сабекошт рэалізацыі	млн руб.	3819	3290	116,1
Прыбытак ад рэалізацыі	млн руб.	756	416	181,7
Балансавы прыбытак	млн руб.	739	389	190,0
Чысты прыбытак	млн руб.	529	272	194,5
Рэнтабельнасць рэалізаванай прадукцыі	%	19,8	12,6	7,2
Затраты на 1 руб. таварнай прадукцыі	руб.	0,829	0,851	-0,022

дзі, а дакладней, вялікая частка іх, забываюць пра народную мудрасць.

— Калі тры гады таму вы ўзначалілі завод, з чаго пачыналі сваю дзейнасць? Ці выступалі ў якасці вядомай «новай мятлы»? Напэўна, як гэта дзеніздзе прынята, кадры замянілі?

— Зразумеў вас і скажу, што ў той перыяд пачалося падаражэнне энерганосьбітаў. Былі і іншыя праблемы. І каб адысці ад плацяжоў камунальнай і іншым службам за водазабеспячэнне і каналізацыйныя паслугі, на тэрыторыі прадпрыемства зрабілі свідравіну, набылі дзесяць адзінак транспарту ў сваю ўласнасць, купілі чатыры ёмістасці на 420 тон для захавання вінаматэрыялу, запусцілі вышэйпамянёную лінію разліву віна ў бутэлькі 0,7 літра і г.д. Усё названае было вельмі актуальным і садзейнічала таму, што была атрымана хуткая аддача. За тры гады майго кіраўніцтва змяніліся толькі чатыры спецыялісты. Мой прынцып такі: калі чалавек працуе добрасумленна, дык няхай так робіць і далей.

— Неяк вясной быў я ў камандзіроўцы ў Залессі і па дарозе каля вёскі Вазнясенск бачыў пасадкі чарнаплоднай рабіны і парэчак. Вашы, напэўна?

— Наш гадавальнік гэта. 20 гектараў указаных культур згодна з прынятым рашэннем развіваць уласную сыравінную базу. Летась там мы атрымалі першы невялікі ўраджай, сёлета ён значна большы. Наша ж мэта такая: дасягнуць таго, каб на 70 працэнтаў закрыць уласнай сыравінай патрэбнасці завода, калі тыя культуры ўступяць у поўную фазу плоданашэння.

Скажу таксама і пра тое, што, улічваючы праграму развіцця малых гарадоў, якім з'яўляецца і Чачэрск, мы выйшлі з хадайніцтвам да абласнога кіраўніцтва аб уключэнні нашага прадпрыемства ў рэспубліканскую праграму «Пладаводства». Нам паведамілі ўжо, што заводу будуць выдзелены фінансавыя сродкі для пасадкі 44 гектараў ягадных і 60 семачкавых сельгаскультур.

— Намеснік дырэктара па ідэалагічных пытаннях Уладзімір Кавалёў правёў мяне па цэхах і ўчастках завода, пазнаёміў з некаторымі працаўнікамі, расказаў аб тым, якая ўвага ў вас надаецца развіццю фізкультуры і спорту ў Год здароўя. Бачыць давялося, як работнікі прадпрыемства без адрыву ад вытворчасці на бясплатнай аснове аздараўляліся ў кабінеце ўрачэбнага кантролю і фізічнай рэабілітацыі пад кіраўніцтвам інструктара-метадыста Анжэлы Шэвель. Добрую справу вы зрабілі. Людзі шчыра ўдзячныя вам за гэта.

— Што я магу патлумачыць, дык, напэўна, тое, што сапраўды амаль два гады на тэрыторыі завода функцыянуе такі кабінет. Мэта яго — прафілактыка захворванняў і аздараўленне работнікаў. Згодна са штатам, тут працуе спецыяліст з вышэйшай адукацыяй, які мае кваліфікацыю інструктар-метадыст і кіруецца ў сваёй рабоце нарматыўнымі прававымі актамі Міністэрства спорту і турызму і Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь. Яна выкарыстоўвае пры гэтым зацверджаныя ўказанымі міністэрствамі такія сродкі і метады, як масаж, лячэбна-аздараўленчая фізкультура, аўтагенныя трэніроўкі, рэлаксацыя, музыкатэрапія і г.д.

Улічваючы спецыфіку вытворчасці, пражыванне ў радыеактыўнай зоне, а таксама Указ Прэзідэнта аб аб'яўленні 2008 года Годам здароўя, вядзе мэтанакіраваную работу па павышэнні працаздольнасці і прадукцыйнасці працы, умацаванні здароўя персаналу, прадаўжэнні іх актыўнага даўгалецця, кантролі за фізічным станам спартыўнай каманды завода, а таксама праводзіцца тым самым самая сур'ёзная работа па прапагандзе здаровага ладу жыцця. Любы работнік прадпрыемства можа звярнуцца па медыцынскую дапамогу і рэкамендацыю, а таксама папрасіць памераць артэрыяльны ціск, даведацца аб вазе свайго цела, атрымаць індывідуальную метадычную праграму.

Уладзімір Густавіч КАВАЛЁЎ, намеснік дырэктара па ідэалагічнай рабоце.

Анжаліка Аляксандраўна ШЭВЕЛЬ, метадыст-валеолаг.

— Бачыў я там шматфункцыянальны ложак-масажор, якім не можа пахваліцца іншы санаторый...

— Гэта так, і ён уключае ў сябе спалучэнне розных методык уздзеяння на арганізм і дазваляе правадзіць мерапрыемствы эфектыўнай прафілактыкі і аздараўлення па шырокім спектры захворванняў (карэкцыя асанкі, сіндром хранічнай стомленасці і фізічнай перастомленасці, кантроль масы цела і выбарчае ўздзеянне на тлушчавыя адкладанні, захворванне пазванка і г.д.). Ложак-масажор «Nuga-best» можа быць выкарыстаны для аздараўлення любых узроставых груп нават у хатніх умовах. Да канца 2008 года плануем набыць яшчэ два трэнажоры.

— Гэта вельмі добра. А ў чым праблема?

— Справа ў тым, што работа кабінета заўтра будзе прыпынена з-за скаргі адміністрацыі раённай бальніцы на чале з былым галоўным урачом Сяргеем Корсакам аб немагчымасці правядзення ўказаных відаў дзейнасці без ліцэнзіі. Але ж заўважым, што ліцэнзаванню падлягаюць медыцынскія паслугі, а мы (падкрэсліваем гэта) аказваем бясплатныя лячэбныя паслугі. Падобнага спецыяліста ў галіне рэабілітацыі райбальніца не мае і паўнацэннай дапамогі насельніцтву аказаць не можа.

Чачэрскай падатковай інспекцыяй быў зроблены запыт у Міністэрства спорту і турызму і Міністэрства аховы здароўя па вырашэнні гэтага пытання. Першае з іх дало згоду на правядзенне ўказаных мерапрыемстваў, а другое выступіла супраць. Аднак што цікава, падрыхтоўка дыпламаваных спецыялістаў падобнага профілю вядзецца са згоды двух міністэрстваў, а дазвол на правядзенне рэабілітацыі дае толькі Міністэрства спорту і турызму. Таму мы лічым, што наша дзейнасць ва ўказаным напрамку правамерная. Жыццёвая. Дык ці мае рацыю Міністэрства аховы здароўя?

Матэрыял падрыхтаваў Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

КДУП «Чачэрскі вінаробны завод»
ЗАПРАШАЕ
зацікаўленыя арганізацыі да супрацоўніцтва
247152, Гомельская вобласць, г. Чачэрск, вул. Луначарскага, 14.
Тэлефоны: 313 59, 313 71, факс 314 59.

ПТУШКІ: ЖЫВЫЯ І ЖАЛЕЗНЫЯ

Колькасць жалезных птушак расце, як і колькасць звычайных. Праблема сутыкненняў самалётаў і птушак застаецца нявырашанай. Асабліва актуальнае гэта пытанне летам, калі «на крыло» становяцца птушаняты, якія не маюць вопыту палётаў. І першыя месяцы восені, калі пачынаецца пералёт на месцы зімоўкі, таксама.

«Птушкі — актуальная праблема...»

У канфлікце жывога арганізма і складаная тэхнікі пры такіх жорсткіх абставінах, зразумела, вынік для жывога адзіны: яно становіцца нежывым. Калі самалёт трапляе ў птушыную чараду, на вынікі глядзець цяжка. Але і тэхніка пашкоджваецца ў такіх выпадках. І калі ўлічыць, што ўнутры гэтай тэхнікі знаходзяцца людзі...

70 працэнтаў сутыкненняў адбываецца ўдзень. У асноўным на курсе ўзлёт-пасадка, прычым да 57 працэнтаў выпадкаў прыпадае менавіта на этап зніжэння і пасадкі. Найбольш небяспечная — вышыня да 100 метраў. Зразумела, хуткасць самалёта вялікая, а калі яшчэ насустрач імчыцца стрыж — ён адносіцца да высокахуткасных птушак, — то пашкоджанняў пазбегнуць немагчыма. Так, гэта не катастрофа, але ж ужо эканамічная страта. Але калі птушка трапіць у рухавік, гэта можа прывесці да яго спынення і самага цяжкага выніку.

Па словах Івана Буйніцкага, кіраўніка аэрадромнай службы Нацыянальнага аэрапорта «Мінск», за апошнія гады цяжкіх аварый з чалавечымі ахвярамі не было.

— Птушкі — гэта заўсёды актуальная праблема на аэрадроме, — расказвае Іван Іванавіч. — Мы праводзім комплекснае даследаванне навакольнага асяроддзя, стараемся зменшыць колькасць фактараў, якія прывабліваюць птушак. Мы замянілі звалкі смеццевымі кантэйнерамі, рэкультывавалі дзікую траву. Шумавое і візуальнае ўздзеянне аказвае ўстаноўка «Беркут-2». Маем таксама біяакустычнае абсталяванне, аднак птушка звыкаецца з яго ўздзеяннем.

Як упэўніў кіраўнік аэрадромнай службы, сёння Нацыянальны аэрапорт плануе ўвесці спецыяльную пасаду арнітолага, які будзе займацца арніталагічнай бяспекай палётаў.

«Ідэальных метадаў яшчэ не прыдумалі...»

На пытанні аб сучасных метадах адпуджвання адказваў Барыс Ямінскі, кандыдат біялагічных навук, старшы навуковы супрацоўнік Дзяржаўнага навуковага вытворчага аб'яднання «Навукова-практычны цэнтр НАН Беларусі па біярэсурсах».

— Часцей за ўсё сутыкненні адбываюцца з чайкамі (35 %), дробнымі вераб'інымі (17 %), галубамі (16 %), качкамі і іншымі вадаплаўнымі (10 %) і варонавымі (7 %) — варонамі, гракамі, галкамі, папуляцыя якіх расце, — прыводзіць статыстычныя даныя Барыс Віктаравіч. — Выпадкі, калі птушка трапляе ў рухавік, складаюць 40 працэнтаў, у часткі крылаў — каля 25 працэнтаў, у шкляныя часткі — 4 працэнты.

Ідэальных метадаў адпуджвання птушак, упэўнівае ён, яшчэ не прыдумалі. Больш эфектыўныя комплексныя метады ўздзеяння — не толькі гукавы, але і візуальны эфект. Аднак і тут ёсць свае недахопы.

— Першасны комплекс мераў уключае аптымізацыю і рэгуляванне экалагічных абставінаў у раёне аэрапорта. Па-першае, гэта выдзяленне фактараў, якія птушак прывабліваюць. Па-другое, гэтыя фактары патрэбна ліквідаваць. Аднак не заўсёды гэта магчыма: можна ліквідаваць звалку, але нельга асушыць возера. Праўда, асушэнне балотаў дазваляецца. Наконт сельскагаспадарчых пасеваў пытанне трэба вырашаць на высокім узроўні: засяваць зямлю каля аэрапорта культурамі, якія прывабліваюць вялікую колькасць птушак, забаронена, — распавядае Барыс Віктаравіч. — Далей трэба звярнуць увагу на архітэктурныя канструкцыі пабудоў, у тым ліку і будынка аэрапорта: калі яны ўтульныя для гнездавання, трэба выкарыстоўваць дадатковыя метады адпуджвання.

Сёння ёсць шмат варыянтаў абсталяванняў. Самае простае — шумавая агнястрэльная зброя. Да яе адносяцца ўстаноўка «Беркут-2» і пісталет «Халзан». Яны даюць гучны выбух і яркія ўспышкі. Абсталяванне біяакустычнае заснавана на ўзнаўленні гукаў: сігналаў трывогі, небяспекі птушак кожнага віду. Аднак птушкі з часам прыстасоўваюцца да гэтых гукаў.

— Калі казаць пра варонавых, яны інтэлектуальныя, — распавядае Барыс Віктаравіч. — Калі часта чуюць аднолькавыя выбухі, асабліва калі гэтыя выбухі рэгулярныя, увагі ўжо не звяртаюць. Нават біяакустычнае абсталяванне не дае эфекту: сігналы трывогі не нясуць небяспекі, яны застаюцца толькі сігналамі. Іншы выпадак, калі пасля сігналу птушкі бачаць драпежніка, які забівае аднаго з іх суродзічаў. Ці проста драпежніка.

Візуальнага эфекту драпежнай птушкі можна дабіцца спецыяльнымі паветранымі шарамі, расцяжкамі, іншымі прыстасаваннямі. Аднак сапраўднага драпежніка, які вартуе ўзлёт і пасадку самалётаў, замяніць нельга.

— Яшчэ адзін недахоп любога акустычнага абсталявання, — працягвае расповед мой суразмоўца, — у тым, што птушкі адчуваюць яго ўздзеянне толькі апынуўшыся ў небяспечнай прасторы.

Законы прыцягнення

З чым жа звязана такая актыўная ўвага птушак да аэрапортаў? Насамрэч, справа не ў аэрапорце, а ў тым, што вакол яго. Даволі часта, як ужо прагучала, прывабліваюць птушак мокрая ўзлётная паласа — яна можа здацца воднай паверхняй для вадаплаўных, недалёка ад аэрапорта могуць знаходзіцца сельскагаспадарчыя землі, вадасховішчы і азёры, звалкі. Акрамя таго, адыгрываюць важную ролю і веснавыя і восенскія міграцыі: калі аэрапорт знаходзіцца па курсу птушыных павятраных шляхоў, у верасні і маі трэба ўзмацніць абарону. Маюць значэнне і суткавыя міграцыі.

Кажуць, што птушкі атакуюць самалёты. Як сведчаць спецыялісты, гэта проста немагчыма: прамая атака для птушкі — смяротны нумар. А ў іншым выпадку самалёт спачатку яшчэ дагнаць трэба. Можа, сокал-сапсан, самая хуткая ў свеце птушка, і здольны на такое, але навошта яму гэта патрэбна?..

Настасся КАРАЦЕЕВА.

З бальніцы эвакуявалі 37 чалавек

8 верасня з прыёмнага пакоя трэцяй гарадской клінічнай бальніцы давялося эвакуяваць 37 чалавек — супрацоўнікі бальніцы адчулі пах газу, у іх пачалі слязіцца вочы. На выклік прыехалі супрацоўнікі МНС, Дэпартамента аховы і следча-аператыўная група Ленінскага РУУС. Прыкладна гадзіну памяшканне праветрывалася, і толькі пасля гэтага медперсанал змог вярнуцца да працы. Ніхто з пацыентаў і супрацоўнікаў бальніцы не пацярпеў. «Міліцыя праводзіць праверку. Як мяркуецца, у памяшканні хтосьці распыліў пярцовы газ з балончыка, — паведаміла прэс-афіцэр Ленінскага РУУС Святлана Шаруха. — Не выключана, што гэта зрабілі хуліганы-падлеткі».

Іна ПАЛЮХОВІЧ, «Мінск—Навіны».

ВЯДРО

Вядро — звычайная ёмістасць для пераносу вадкасці, часта выступала як сакральная рэч у сямейнай абраднасці ўсходніх славян.

● Перш за ўсё гаспадыня павінна была штодзень клапаціцца аб чысціні вядра. Па-другое, у народнай свядомасці да вядра і вады ў ім былі выпрацаваны некаторыя парады і рэкамендацыі.

● Так, адразу пасля смерці чалавека, з вядра або вядзёр, якія былі ў хаце, абавязкова ваду вылівалі, а вядро пераворачвалі. Нашы продкі былі перакананыя ў тым, што ў адваротным выпадку душа памерлага «акунецца» ў гэту ваду, і яна (вада) стане «мёртвай», г.зн. шкоднай для жывых.

● Цяжарнай жанчыне забаранялася ступаць на тое месца, дзе стаяла вядро з вадой, калі мылі падлогу. Лічылася, што дзіця ў такім выпадку будзе хварэць на лішай.

● Цяжарнай жанчыне забаранялі хадзіць па ваду да калодзежа — пралітая вада (у час, калі ваду пералівалі з калодзежнага вядра ў сваё) магла прывесці да таго, што дзіця ў час кармлення будзе пастаянна «адліваць» малако; а раптоўны позірк цяжарнай жанчыны ў калодзеж мог прывесці да нараджэння сляпога дзіцяці.

● Пустое вядро заўсёды прадказвала «пустату», г.зн. няўдачу ў справах. Таму паўсюдна была вядома прыкмета: калі сустрэшеш на сваім шляху жанчыну з пустым вядром, шляху (удачы) не будзе. Таму людзі, якія выхаваны ў лепшых традыцыях народнай культуры, каб не нашкодзіць тым, хто ідзе насустрач, заўсёды імкнуліся іх прапусціць (пачакаць) ці клалі што-небудзь у вядро.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Усміхнёмся!

Прадаю калекцыю дарагіх матылькоў разам з норкавым футрам, якую яны, гады, аблюбавалі.

☺

Прыязджаюць бацькі наведаць студэнта ў інтэрнаце. Раніцай стукаюцца ў дзверы яго пакоя. З-за дзвярэй сонны голас:

— Хто там яшчэ?!

— Мікола Сямёнаў тут жыве?

— Тут, тут... Вы яго каля дзвярэй пакладзіце, зараз апрануся — занясу.

☺

Гарэлка па тэлефоне: «Я павольна адкручваю крышачку. Здымаю. Ты дастаеш сваю маленькую раскладную шклянчку...»

☺

Маладая жанчына прыходзіць да ўрача:

— Доктар, калі я знаходжуся ў пакоі з мужчынам адзін на адзін, мяне ўвесь час цягне заняцца з ім сэксам. Як завецца такая з'ява?

Доктар, расшпільваючы рэмень:

— Гэтая з'ява завецца ўдалая сустрэча!

☺

Хабар у дэканаце на 25 працэнтаў меншы, чым у ваенкамаце. Рынак.

☺

— Дзяўчына, а вам ніхто не казаў, шты вы вельмі прыгожая?

— Казалі, казалі, але вось муж мой з гэтым не згодны. Вось і да вас ён ужо з манціроўкай бяжыць...

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	6.36	19.35	12.59
Віцебск —	6.24	19.26	13.02
Магілёў —	6.26	19.25	12.59
Гомель —	6.24	19.20	12.56
Гродна —	6.51	19.50	12.59
Брэст —	6.53	19.49	12.56

Месяц

Першая квадра.
Месяц у сузор'і Вадалея.

Імяніны

Пр. *АДСЯЧЭННЕ ГАЛАВЫ ІААНА ПРАДЦЕЧЫ.*
К. *Прота, Пятра, Фелікса, Яна, Яцка*

НАДВОР'Е на заўтра



11 верасня

Дзве даты



1900 год — нарадзіўся Іван Мікітавіч Русіянаў, выдатны савецкі военачальнік, Герой Савецкага Саюза. Пад яго камандаваннем 100-я стралковая дывізія ў чэрвені 1941 года абараняла Мінск у раёне Астрашыцкага гарадка. Яго дывізія першай у Чырвонай Арміі была ўдастоена наймення «гвардзейская». Імем Русіянава названа вуліца ў Мінску.

1877 год — нарадзіўся Фелікс Дзяржынскі, рускі рэвалюцыянер, адзін з арганізатараў Кастрычніцкай рэвалюцыі, стваральнік і кіраўнік ВЧК (1917—1923), наркам шляхоў зносінаў, кіраўнік ВСНГ СССР (1924—1926).

Цытата дня:

«Лепш памыляцца з усімі, чым быць разумным у адзіночку».

Марсель Ашар (1899—1974), французскі драматург.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 7 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.

http://www.zviazda.by

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар.
Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 32.407 Індэкс 63850. Зак. № 4967. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12